беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Мінску штотыдзень

НАША НІВА

№ 32 (70)
11 лістапада
1996 г.

выходзіць у панядзелкі

Рэвалюцыйны рэфэрэндум

Здымак Аляксандра Клешчука

Я з цытатай, як руля з цаўём,
Сцыпіёна цытую, Тацыта.
Між Харыбдай і Сцылай жывём
У чаканыі таго плебісцыта.

Сяржук Сокалаў

Жарсьці вакол рэфэрэндуму канчаткова прымусілі апухнуць электаратныя галовы. І ёсьць ад чаго. Некалькі варыянтаў новых канстытуцыяў, якія штодзень мяняюцца, дапісваюцца; пераносы даты галасаваньня, кулямётнай скарастрэльнасьці ўказы Лукашэнкі, народныя сходы, нацыянальныя кангрэсы, пастановы Вярхоўнага Савету, амоны і БТРы на вуліцах — гэта ўсё вакол рэфэрэндуму. Электарат паставілі ва ўмовы, калі трэба думаць самому.

У электарата ад адчаю сьлёзы ў вачах, крыўда і злосьць на абставіны, але ён мусіць выбіраць, ці «падыходзіць на крок бліжэй» у сытуацыі, калі адсутнічае магнэтычны позірк. Гэта нязвыкла.

Магнэтычнаму позірку выканаўчай улады не даюць засяродзіцца на аб'екце. То парлямэнт, то партыі, то Канстытуцыйны Суд — тыя, каго цалкам задавальняе Канстытуцыя, хто яе не парушае і карыстаецца ёю ў жыцьці. Апошнім часам у дачыненьнях паміж выканаўчай і заканадаўчай уладамі ініцыятыву трымае апошняя. Лукашэнку ўвесь час прыходзіцца гуляць другім нумарам, адказваючы на захады апанэнтаў. Звыклы да рэвалюцыйнага наступу прэзыдэнт у такой гульні пачувае сябе ня дужа ўпэўнена, бо шахматы не яго жарсьць. Адсюль гэтыя зрывы, шараханьні, пераносы датаў. Дачыненьні паміж Лукашэнкам і парлямэнтам нагадваюць адносіны факіра і зьмяі, дзе ролю факіра выконвае парлямэнт. Зьмяя вымушаная паўтараць рухі бамбукавай дудкі факіра, бо як толькі спрабуе нешта задумаць, атрымлівае той самай дудкай па носе і зноў вымушаная рухацца за дудкай.

Прыкладна тое самае адбывалася паўтары гады таму, калі з парлямэнцкай залі выкідалі апазыцыю БНФ. Толькі тады дудку факіра трымаў у руках прэзыдэнт.

Ініцыятыва — галоўнае для Лукашэнкі. Ён будзе старацца яе вярнуць любымі сродкамі. Палітычнымі мэтадамі яму гэта зрабіць наўрад ці пашчасьціць, а кансультатыўны рэфэрэндум абсалютна ніякай карысьці яму не нясе.

Аднойчы яго ўжо прымусілі саступіць, у выніку — страта ініцыятывы. Верагодна, больш такога чакаць ня варта, бо палітычнае суіснаваньне не ягоны шлях, яго стыхія — неабмежаваная ўлада. Ад яе Лукашэнка не адмовіцца ніколі, нягледзячы на ніякія ціскі звонку. Таму трэба чакаць таго, што яму перашкодзілі зрабіць 24 кастрычніка. Тым больш, што на ключавой пасадзе міністра абароны больш няма ненадзейнага генэрала Мальцава.

Інфармацыя старшыні Канстытуцыйнага Суда сп. Ціхіні пра магчымае спыненьне дзейнасьці гэтага дзяржаўнага інстытуту верагодная і датычыць ня толькі КС. Тое самае тычыцца і парлямэнту, і іншых установаў, што спрабуюць мець свой погляд на рэчы. Спроба вырашыць праблему сілавым спосабам магчымая яшчэ і таму, што зараз у Лукашэнкі няма ўпэўненасьці нават у выніках плебісцыту. А пад наглядам людзей у камуфляжы як трэба будуць галасаваць ня толькі «бандэрлёгі». Таму зараз набліжэньне да рэфэрэндуму сваім антуражам вельмі нагадвае набліжэньне да рэвалюцыі. А рэвалюцыі мала каму прыносілі шчасьце.

Алег Дашкевіч

Літаратура

Казка пра караля Мурдаса

Удадар займае будынкі сталіцы, перасьледуе апазыцыю — хрэстаматыйныя прыкметы дыктатуры. Але пачынасцца непазбыўны кашмар улады. Кароль вырашае бараніцца, прысьніць натоўпы падданых, поўныя любові і энтузіязму, вернае войска, горы зброі. Знакаміты польскі пісьменьнік Станіслаў Лем стварае яркі партрэт палітычнай шызафрэніі ў «Казцы пра караля Мурдаса».

На старонцы 14.

Без антракту

Севярын Квяткоўскі

Вы глядзіце відовішча. Ня важна, падабаецца яно вам, ці не. Так атрымалася, што вы мусіце прысутнічаць. Вы можаце апрануць на вушы плэер альбо прыняць пігулку снатворнага, але вы ня можаце пакінуць залю. Перад вамі гуляюць ці то ў спэктакаль, ці то ў рэальнасьць. Галоўнае — на сцэне сапраўдныя жывыя людзі. І вось, прыходзіць момант (невядома, экспромт гэта, ці ён ад пачатку закладзены ў сцэнар), калі галоўны «герой» здымае з дэкаратыўнай сьцяны сапраўдную стрэльбу, і пачынае страляць у гледачоў.

Здымак Аляксандра Клешчука

Магчыма, некаторыя з ахвяраў пасьпяваюць уцяміць перад сьмерцю, што ад самага пачатку яны былі ўдзельнікамі гэтага спэктаклю. Адно невялікая купка вымушаных гледачоў яшчэ пры ўваходзе ўбачыла, што стрэльба на сьцяне сапраўдная. Адныя зь іх вырашылі ўцячы з залі, а іншыя — засталіся, каб паспрабаваць спыніць выродлівую й небясьпечную дзею. Цяпер яны першымі кладуцца пад кулямі. Тым часам гледачы апладуюць. Яны ня бачаць рэальнасьці, пах сьвежай крыві ў залі для іх ня больш чым выкшталцоная бутафорыя. Яны не ўсьведамляюць, што ад куляў ужо гінуць некаторыя акторы на сцэне. Што сьмерць сапраўдная. Ужо невядома, ці застаўся ў залі хаця б адзін жывы, які бачыць, што ў спэктаклі цалкам згубленая якая-кольвек лёгіка. Стрэлы гучаць амаль бесьперапынна. Воплескі, сьмех, плач, сьвіст, пляскі пацалункаў, перадсьмяротныя хрыпы!.. Аркестар грае.

«Хто спыніць «героя»?» — пытаньне з залі, ці ў залю? Хто апусьціць заслону? Вахцёр?..

Адстрэл пачынаецца з самых слабых, з тых, за каго не заступяцца. З «заплямленых». Ціна Клыкоўская — з такіх. ГэБэ арыштавала яе, падазраючы ў прыналежнасьці да тэрарыстычнай групы. Яны ведалі, каго браць. У свой час у менскіх каляжурналісцкіх колах Клыкоўская напрацавала сабе ня вельмі прывабны імідж. Але Клыкоўская — чалавек, на якога НАШЫЯ праціўнікі «вешаюць» не йснуючы «грэх». Гэта значыць, што шлях у вязьніцу неўзабаве канчаткова адчыніцца для ўсіх — для «чыстых» і «нячыстых», для «чэсных» і «нячэсных». За два гады спэктаклю Актор намацаў залю. Апошнім часам ён упарта й пасьлядоўна рыхтуе яе да другога аддзяленьня: арышты «адыёзнага» Адамовіча, «неадназначнага» Рамашэўскага, «збанкрутаваных» лідараў БНФ і інш. Гэты «спэктакаль» ня можа мець антракту. «Гледачы» мусяць «абменьвацца ўражаньнямі» ў працэсе, так бы мовіць. Прычым, працэс увесь час паскараецца. Ад гледачоў-удзельнікаў вымагаецца хуткасьць рэакцыі. Уявім, Актор кажа памагатаму: «А выведзіце-ка на сцэну вунь тую, шастой рад, васьмое места. Мы яё расстраляем». А з залі: «Ну й правільна — яна канфетамі шаляцела, семкі грызла й на пол плювалася.» А калі павядуць чалавека, які не плюецца семкамі, і які заўжды паводзіць сябе прыстойна? Няўжо ўзьнікне сакрамэнтальнае беларускае пытаньне: «А можа так і трэба?»

Наш Актор дзейнічае жорстка, подла й вельмі хутка. Ён імкнецца «прасачыцца» ў слабыя месцы, у шчыліны грамадзтва, каб татальна разбурыць ягоны арганізм. Арганізм абароніць сябе ў выпадку, калі НЯ «ЗДАСЬЦЬ» НІВОДНАГА чалавека. Спачатку трэба выжыць, а ўжо пасьля высьвятляць, «хто ня змыў у прыбіральні».

Працяг тэмы на старонцы 2.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ



Выстава

СПАДЧЫНА, ЯКАЯ НАЛЕЖЫЦЬ БЕЛАРУСІ

Да 115-х угодкаў з нараджэньня І.Луцкевіча і 75-х угодкаў Беларускага музэя ў Вільні Нацыянальны Музэй Гісторыі і Культуры Беларусі ладзіць выставу, якая адкрыецца 12 лістапада а 15 гадзіне (Менск, вул. К.Маркса, 12).

ТЭЛЕПРАГРАМА

20 MTV

5 Навіны на рынку бэстсэлераў.

ПРЭС-РЭЛІЗ

6 Сьвет за тыдзень.

СПАЖЫВЕЦ

7 Тэст: стэрэамагнітолы і музычныя цэнтры.

ШУФЛЯДА

10 Кроніка дэмакратычнай апазыцыі ў Беларусі.

ІНСТРУКТАР

12 Як разглядаецца скарга на сваю дзяржаву.

Інфарматар

Размова з чытачамі

Вынікі анкеты

На анкету, якую мы надрукавалі ў нумарах 27 і 28 за 30 верасьня і 7 кастрычніка, рэдакцыя атрымала больш за 200 адказаў чытачоў (дакладна – 230). Падрабязныя вынікі анкеты мы надрукуем у наступным нумары «НН». А сёньня, як і абяцалі, назавем прозьвішчы тых дзесяці чытачоў, якія выйгралі наш прэзэнт — новую кнігу выдавецтва «НН» «Менская вясна — 1996». Гэта: Іваноў Уладзік зь Віцебску, Карась Алесь, Віталь Супрановіч і Ігар Жабянок зь Менску, Абялец Ала з Клецку, Засінец Мікола з Мазыра, Урвановіч Аляксандар з Гомеля, Шпакаў Міхал з Клімавічаў, Лаўрэш Л. зь Ліды і Ключановіч Георгі з Салігорску.

Падпіска дзеля знаёмства

У другім паўгодзьдзі многія ўстановы атрымліваюць «Нашу Ніву» бясплатна. Дзякуючы клопату Беларускага Фонду Сораса, наша газэта прыходзіць у навучальныя ўстановы, школы, музэі і клюбы па ўсёй Беларусі. За мінулыя месяцы Вы пазнаёміліся з «НН», і ў новую падпісную кампанію Вам будзе лягчэй зрабіць свой выбар — ці працягнуць падпіску самастойна, ці адмовіцца ад яе. Рэдакцыя вельмі разьлічвае на Ваш удзел.

Не забудзьцеся працягнуць Вашу падпіску на «НН».

Выпісаць тыднёвік можна на кожнай пошце.

Наш індэкс: 63125.

Сьвята ўплыву

Мінулы тыдзень адзначаны няхітраю спробай рэанімацыі старых ідэалягічных сымбаляў, якія ўжо пасьпелі страціць свой патэнцыял узьдзеяньня. Свае віншаваньні з нагоды Кастрычніцкай рэвалюцыі накіравалі грамадзянам Беларусі і А.Лукашэнка, і Вярхоўны Савет. Пры тым, што гэтыя суб'екты беларускай палітыкі зьяўляюцца антаганістамі, іхнія зваротывіншаваньні прадэкляравалі супадзеньне пазыцыяў у ацэнцы падзеяў 1917 г. Супольнасьць гэтых пазыцыяў можна зьвесьці да наступных пунктаў:

— Кастрычніцкая рэвалюцыя была заканамернай падзеяй;

— «была зроблена спроба прарыву з сыстэмы эксплюатацыі чалавека чалавекам да справядлівага грамадзтва», рэвалюцыя «аказала ўплыў на працэс дэмакратызацыі ў сусьветным маштабе».

Гэтыя тэзысы прыкладаюцца да гісторыі Беларусі і, больш таго, — усю найноўшую гісторыю Беларусі выводзяць з Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Калі розныя палітычныя сілы Беларусі наўмысна спрабуюць актуалізаваць спадчыну дзяржаўнага перавароту ў Расеі ў кастрычніку 1917 г. ды выкарыстаць яе ў сваёй барацьбе, то давядзецца акрэсьліць суадносіны паміж падзеямі ўласна беларускай гісторыі ды зьнешнімі ўплывамі, якія ўварваліся ў беларускую гісторыю, аказаўшы на яе драматычны ўплыў.

1917 г. сапраўды важны для гісторыі Беларусі, бо менавіта тады пачалося ўтварэньне інфраструктуры беларускай дзяржаўнасьці. Адбывалася структураваньне беларускіх сілаў, узьнікалі цэнтры палітычнай, тэрытарыяльнай і агульнанацыянальнай улады. У першыя дні сакавіка 1917 г. прайшла пашыраная нарада ўдзельнікаў беларускага нацыянальнага руху, была адроджаная Беларуская Сацыялістычная Грамада, прадстаўнікі якой потым будуць вызначаць гэтак моцную левую плыню ў БНР. 25-27 сакавіка ў Менску адбыўся Зьезд беларускіх нацыянальных арганізацыяў. А ў ліпені на Зьезде прадстаўнікоў беларускіх партыяў утвараецца Беларуская Рада, якая з кастрычніка стане звацца Вялікай Беларускай Радаю. Менавіта яна ініцыявала й разам зь сялянскімі арганізацыямі правяла 14-18 сьнежня Першы Усебеларускі кангрэс, працу якога няхай і перапынілі балышавікі, але ўтвораныя на кангрэсе структуры прывялі да абвяшчэньня БНР.

Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі былі ў Беларусі шмат у чым экзатычнымі й хуткаплыннымі. Бальшавіцкі Менскі савет 26 кастрычніка абвясьціў пра пераход улады ў свае рукі. Аднымі зь першых актаў новай улады сталі ўвядзеньне цэнзуры ды ліквідацыя органа мясцовага самакіраваньня — гарадзкой думы. Ужо тады закладаліся элемэнты рэпрэсіўнага мэханізму, заснаванага не на праве, а на прынцыпе рэвалюцыйнай мэтазгоднасьці. Савецкая гістарыяграфія створыць потым важны для сябе тэзыс пра тое, што Кастрычніцкая рэвалюцыя перамагла ў Беларусі на наступны дзень пасьля яе перамогі ў Петраградзе. Для паўнаты гэтага вобразу была непатрэбнай узгадка, што ўжо 27 кастрычніка ў Менск увайшлі антыбальшавіцкія расейскія фармаваньні. Тут, у дзейнасьці мілітарных фармаваньняў іншых дзяржаваў, і схавана тлумачэньне «кастрычніцкіх» падзеяў у Беларусі. Гэтыя падзеі — прыўнесены фон. Прызнаўшы савецкую ўладу ў Расеі, Беларуская Рада не прызнавала яе ў Беларусі. Інструмэнтам правядзеньня бальшавіцкай палітыкі ў Беларусі быў Выканаўчы камітэт Заходняй вобласьці й фронту, які разглядаўся Радаю як чыста франтавы орган расейскага войска. Кіраўніцтва Выканкамзаха складалася толькі з прадстаўнікоў фронту і ў ім не было ніводнага беларуса. Вось адкуль зьявіліся на беларускім ляндшафце мясьніякяны й кнорыны. У расейскім войску, якое дыслякавалася ў Беларусі, практычна не было беларусаў. Яшчэ царскі Генштаб накіраваў ваяваць пераважную большасьць беларускіх мужчынаў, змабілізаваных у расейскае войска, на Паўднёвы фронт, і таму яны, маючы ў руках зброю, не змаглі паўплываць на хаду драматычных падзеяў на сваёй Радзіме.

Беларускім сілам прыйшлося супрацьстаяць мілітарнай машыне іншай дзяржавы, да таго ж захопленай бальшавікамі. Сыстэма кіраваньня расейскіх бальшавікоў функцыянавала праз надзвычайныя органы: ваенрэўкомы, надзвычайныя камісіі, рэвалюцыйныя трыбуналы, рознага роду ўпаўнаважаных, камісараў... Гэтая машына была звышканслідаванай, бо ў Беларусі бальшавікі здолелі аб'яднаць фронт і ягоныя тылавыя адзінкі ў адну структуру — Заходнюю вобласьць і Заходні фронт. Гэта было адзінае ваенна-грамадзянскае квазідзяржаўнае ўтварэньне на тэрыторыі Расейскай імпэрыі. Вось дзе матор падзеяў Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі — у моцным зьнешнім мілітарным уплыве, а не ва ўнутрыпалітычнай калапсе беларускага грамадзтва.

Алег Дзярновіч

«НН» – 90

Люстэрка

Паднясіце люстэрка да люстэрка і Вы ўбачыце бясконцасьць. Дзеці любяць люстэркі, бо зь іхняй дапамогай можна выдумляць сябе іншым, чым ёсьць. Для дзяцей гэта гульня, для безьлічы дарослых — сродак, каб трызьніць на яве. Але люстэрка йснуе не для таго. Адзін з маіх першых дзіцячых жахаў зьвязаны зь люстэркам. Я паднес да яго свой твар гэтак, каб зрок сфакусаваўся адно на зрэнках, і так глядзеў доўга-доўга. Я хацеў УБАЧЫЦЬ СЯБЕ. Але я ня ўбачыў нічога — гэта было жахліва. З гэтага выпадку я доўгі час абходзіў люстэркі бокам, аж да таго моманту, пакуль не зразумеў уласную памылку. Упершыню я ўбачыў СЯБЕ ў вачах адной дзяўчыны. Я стаўся ейным люстэркам.

Калі не выдумляць (ствараць) сябе й навакольную рэальнасьць, то як зьмяняцца? Чым ёсьць тлумачэньне, як ня вымыслам? Навошта фіксаваць факт, калі яго не тлумачыць? Люстэрка фіксуе факт. Газэта — люстэрка. У 1906 годзе газэта «Наша Ніва» стварылася, каб «зазірнуць усюды» — каб «быць люстрам жыцьця». Па зачыненьні ў ваенным 1915 годзе яна аднавілася ў 1991 — «каб стацца люстэркам дзён і жаданьняў». Газэта аднавілася ў месцы нараджэньня, у Вільні. Але на той час горад зьнік зь беларускай прасторы. Таму ў 1996-м газэта пераехала ў сталіцу сёньняшняй Беларусі, бо «Наша Ніва» — БЕЛАРУСКАЯ газэта. Паміж сёньняшняй «НН» і газэтай пачатку стагодзьдзя ёсьць хіба адно адрозьненьне. Цяперашняя «НН» існуе ў канкрэтнай беларускай рэальнасьці. Яна ня мусіць, як раней, выконваць асьветніцкую працу, для гэтага мы маем іншыя інстытуцыі. «НН» — выданьне аўтараў, то бок яна скіраваная на суб'ектыўнае адлюстраваньне рэчаіснасьці. Гэта найлепшы сродак, каб убачыць, зразумець сябе. Для БЕЛАРУСКАЙ газэты гэта значыць зразумець і стварыць Беларусь.

Люстэрка — непатрэбная рэч, калі йснуе адно для цябе самога. Вітальны артыкул першага нумару «Нашай Нівы», які выйшаў 10 лістапада 1906 году, сканчаўся словамі «заклікаем усіх тых, хто разумее нашыя мэты, хто адчувае, што мы чуем... падтрымаць нас у працы». Нягледзячы на больш чым сямідзесяцігадовае маўчаньне, газэта аднавілася й разьвіваецца ў няспынным дыялёгу з чытачамі. Урэшце, гэты дыялёг ніколі не перапыняўся, ён існаваў у розных формах, у розных фарматах. Як вынік — Вы трымаеце ў руках чарговы нумар «НН».

Часам «Нашу Ніву» называюць элітным выданьнем. Я магу пагадзіцца з гэтым меркаваньнем толькі пры адной умове — калі элітным лічыцца жаданьне зразумець сябе. Зразумець сябе, прыняць сябе такім, які ёсьць, бяз гульняў і трызьненьняў — вельмі складана. Але гэта неабходна, каб зьмяніць сваё жыцьцё ў бок жаданага.

Сяварын Квяткоўскі

Паляваньне на вядзьмарак

Сэзон паляваньня на вядзьмарак у Беларусі адкрыты. На гэты раз ловяць не абстрактнага Ведзьмака-Лысагорскага, а канкрэтных людзей, вядомых сваімі «нязгоднымі» поглядамі. У «бліжэйшым асяродзьдзі» «завалілі» Мальцава, а ў «далейшым»...

У суботу 2 лістапада, на Дзяды, у сваім пакоі была арыштаваная журналістка Ціна Захараўна Клыкоўская. Калісьці яна была даверанай асобай кандыдата ў прэзыдэнты Лукашэнкі А., потым перайшла ў апазыцыю, ажанілася і разышлася зь вядомым паэтам Славамірам Адамовічам.

У пакоі Ц.Клыкоўскай адначасова з арыштам быў зроблены пératрус. Невядома, што адшукалі ў яе міліцыянты Маскоўскага РАУС і сьледчы пракуратуры Маскоўскага раёну сталіцы сп. Дрозд, але, са словаў адваката Ц.Клыкоўскай, ёй інкрымінуюць артыкул 166 Адміністратыўнага кодэксу (удзел у масавых беспарадках) і артыкул 67 частку 3 Крымінальнага кодэксу (стварэньне і ўдзел у арганізацыі з мэтаю зьмяненьня існуючага канстытуцыйнага ладу пры дапамозе замежных арганізацыяў). За апошні артыкул у нас даюць 10 гадоў пазбаўленьня волі. Аднак улады, пратрымаўшы Клыкоўскую трое сутак у КПЗ Маскоўскага раёну, адпусьцілі яе пад падпіску аб нявыезьдзе. Напэўна, у следчага Дразда ня вельмі моцныя доказы віны журналісткі.

Заўважым, што той самы артыкул КК (толькі ў частцы 1 — заклікі да зьвяржэньня існуючага канстытуцыйнага ладу) інкрымінуецца былому мужу Клыкоўскай С.Адамовічу, які ўжо дзьвяты месяц утрымліваецца ў СІЗО. Цалкам магчыма, што такім чынам «справа Адамовіча» ператвараецца ў «справу арганізацыі Адамовіча». Улады зразумелі, што адзінкавы «тэрарыст» — гэта не тэрарыст, і цяпер ствараюць арганізацыю з былых мужа і жонкі — так бы мовіць, «сямейны падрад». Альбо Клыкоўскую маглі ўзяць дзеля таго, каб лішні раз націснуць на Адамовіча.

Ёсьць і іншая вэрсія: перад рэфэрэндумам уладзе ня трэба лішніх галасоў «супраць». Ціна Клыкоўская — даверараная асоба кандыдата ў прэзыдэнты Лукашэнкі, супрацоўніца апазыцыйнай газэты «Здравый смысл» — гэта якраз такі голас. Нездарма ж у рэдакцыі таксама быў праведзены пératрус з канфіскацыяй падрыхтаваных у нумар матэрыялаў арыштаванай журналісткі.

Іншая справа з «замежнымі арганізацыямі». Ц.Клыкоўская — сяброўка ўкраінскіх палітвязьняў, якія дагэтуль сядзяць на Валадарцы ў Менску. Яе арышт — дадатковая нагода зрабіць іх становішча ў турме яшчэ больш невыносным.

Падчас допыту Ц.Клыкоўская адмовілася ад прысутнасьці адваката, хоць той і сядзеў пад дзьвярыма пакою, у якім адбываўся допыт. Ці ж можна паверыць, што чалавек, якому пагражае 10 гадоў зьняволеньня і які можа імгненна зьвярнуцца да адваката, дабраахвотна адмовіўся ад ягоных паслугаў? Як у нас робяцца такія «адмовы», мы бачылі ў часе «Менскай вясны — 1996»...

Сёньня Ц.Клыкоўская чакае тэрміну ў 10 дзён. Альбо Маскоўская пракуратура ў гэты тэрмін выставіць абвінавачаньне, альбо закрые гэтую справу.

S.P.

Ц.Клыкоўская і А.Лукашэнка.

"Наша Ніва" незалежны тыднёвік НАША НІВА
заснаваны ў 1906, адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец Павал Жук
рэдактар Сяргей Дубавец
адказны сакратар Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
навіны Уладзімер Бараніч
рэдактар дадатку "Інфарматар" Андрэй Лапцёнак
макет Віктар Корзун
вёрстка Іна Жызьнеўская
набор Таццяна Чуйвід
стыль і карэктура Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)
АДРАС ДЛЯ ДАПІСАЎ 220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78-49
E-mail: edit@niva.minsk.by
Падпісны індэкс 63125
Пасьведчаньне аб рэгістрацыі перыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.

БЕЛАРУСКІ ФОНД СОРАСА
ІНСТЫТУТ «АДКРЫТАЕ ГРАМАДСТВА»
запрашаюць да ўдзелу ў конкурсе па праграме
«ARTSLINK»
прафесійных рэжысёраў, акцёраў, мастакоў, мастакоў-дызайнераў, архітэктараў, танцораў, музыкантаў, пісьменнікаў і менеджэраў у галіне культуры і мастацтваў.
Пераможцам конкурсу будзе прадастаўлена права прайсці ***пяцітыднёвую стажыроўку ў ЗША ў канцы 1997 года.***
Абавязковыя патрабаванні да ўдзельнікаў конкурсу:
адпаведны прафесійны статус
добрае валоданне англійскай мовай
Для ўдзелу ў конкурсе неабходна прадаставіць:
· заяўку паводле распрацаванай формы
· біяграфічныя звесткі (curriculum vitae) на дзвюх мовах - англійскай і беларускай (рускай)
Апошні тэрмін падачы дакументаў на конкурс - 2 снежня 1996 года.
Конкурсны адбор будзе праводзіцца ў Нью-Йорку.
Пераможцы павінны будуць здаць экзамен па англійскай мове.
Форму заяўкі можна атрымаць па адрасах:
220027 г. Мінск, пр.Ф.Скарыны, 65, корпус 11А БДПА, пакой 107, Беларускі Фонд Сораса
210026 г. Віцебск, вул. Замкавая, 4, пакой 215, Віцебскае аддзяленне БФС
246652 г. Гомель, вул. Кірава, 32-а, Гомельскае аддзяленне БФС
224005 г. Брэст, вул. Наганава, 3, пакой 31
230023 г. Гродна, вул. Будзёнага, 48-а, «Ратуша»
212030 г. Марылёў, пр. Міра, 10, пакой 31
Заяўкі падаюцца на названы вышэй адрас Беларускага Фонду Сораса
© полифстрим 077

Экспэрымэнтальная гісторыя

Сярод гісторыкаў распаўсюджаная думка, што ў працэсе дасьледаваньня неабходна вытрымліваць дыстанцыю як найменш у адно пакаленьне, а дасьледаваньне таго, што пададзенае ва ўчорашняй прэсе, зьяўляецца папросту несалідным. Але сёньняшні дзень становіцца гісторыяй хутчэй, чым, напрыклад, дзень у даваенны пэрыяд. І інфармацыя з учорашніх газэтаў робіцца ўжо тэмаю для гісторыка. Гэта значыць, што сучасная гісторыя стварае іншае вымярэньне часу, чым тое існавала раней.

Адначасова пераадольваецца погляд на гісторыю, як на цэльнасьць, што паддаецца агляду. Ці, як скажа, асэнсоўваючы Найноўшую гісторыю, Карл Яспэрс: «Мы знаходзімся ўнутры не завершанага, а толькі магчымага прыстанку гістарычнай цэльнасьці, якая пастаянна распадаецца».

Гэтая адмова ад татальнай гісторыі прымушае знаходзіць сярод гістарычнага матэрыялу разнастайнасьць і зьмяняе суадносіны паміж «цэнтрам» і «маргіналіяй». Можна, да прыкладу, паддавацца ілюзіям татальнасьці савецкага маналіту ды заганяць у гэты бэтон усю гісторыю Беларусі другой паловы XX ст. Але варта стварыць кроніку дэмакратычнай апазыцыі й палітычных рэпрэсіяў у Беларусі, каб пабачыць, што ўсе гэтыя гады існавала іншая, несавецкая Беларусь, дзе на тле афіцыёзу фармавалася зусім іншае, непадкантрольнае грамадзтва.

Можна зрабіць другі, кампрамісны крок — абвесьціць апазыцыйны рух маргінальным, які мала што вызначаў у грамадзкіх працэсах. У такім разе набыццё Беларусяй незалежнасьці сапраўды зьяўляецца актам нечаканым. І вось тут варта зноў пагартаць кроніку, каб зразумець, што «цэнтральныя» падзеі канца 1980-х — пачатку 90-х гадоў у Беларусі вызначаліся менавіта лёгікаю разьвіцьця апазыцыйнага грамадзтва, якое «раней» было «маргінальным». Праявы незалежнага беларускага жыцьця, якія характарызаваліся як маргінальныя, насамрэч былі цэнтральнымі падзеямі ў жыцьці ўласна беларускага грамадзтва. Таму яшчэ невядома, дзе быў цэнтар, а дзе маргіналія.

Мы можам зрабіць яшчэ адзін правакацыйны ход ды перакінуць новы масток ад сучаснасьці да «маргіналіі». Калі ў 1978 годзе, пасьля прачытаньня на «Нямецкай хвалі» нарыса пра русыфікацыю Беларусі «Скрадзеная Бацькаўшчына» аўтар, Міхал Кукабака зноў арыштоўваецца, на Захадзе яго пачынае бараніць чалавек, які ў 1996 годзе мог стаць прэзыдэнтам Злучаных Штатаў Амэрыкі —сэнатар Робэрт Доўл.

Але галоўная спэцыфіка Найноўшае гісторыі палягае на тым, што функцыі мастка-злучніка паміж «цэнтрам» ды «маргіналіяй» выконваюць нашыя ўспаміны, эмоцыі, развагі. Найноўшая гісторыя — гэта жывая гісторыя, дзе дадатковаю крыніцай інфармацыі зьяўляецца эмпірычны досьвед жывых людзей, якія дзейнічаюць у момант вывучэньня іхняга мінулага. Таму Найноўшая гісторыя насычаная «адкрытымі» фактамі, акалічнасьці ўзьнікненьня якіх нам вядомыя, але наступствы якіх мы ня ў стане прадбачыць. У ранейшай гісторыі мы маем справу, галоўным чынам, з «закрытымі» фактамі, якія зазначаныя ў гістарычным працэсе ў сваёй адноснай цэльнасьці, так што магчыма ў пэўнай ступені ахарактарызаваць месца гэтага факту ў гістарычным працэсе.

Наша сучаснасьць (з Найноўшай гісторыяй праз Сучасную гісторыю), апроч унікальнага шанцу ў пазнаньні гісторыі праз уласны досьвед (такой магчымасьці ня маюць дасьледчыкі ранейшых эпохаў), адначасова стварае складаную праблему асабістых адносінаў да гісторыі — канфлікт паміж гісторыяй «прыватнай» і афіцыйнай, напісанай. Гісторыя БССР характарызуецца нарастаньнем гэтага канфлікту, што выяўляецца, апроч іншага, у браку адлаведнае мовы, якою трэба весьці гаворку пра найноўшую гісторыю Беларусі. Бракуе менавіта падставовых паняцьцяў, якімі можна акрэсьліць грамадзкія працэсы. У тым ліку таму мы маем такую дыстанцыю паміж навуковым і звычайным дыскурсамі блізкага мінулага.

Тое, што мы сьцьвярджаем пра Найноўшую гісторыю, можна разглядаць як маніфэстацыю розных спосабаў сваіх адносінаў з навакольным сьветам. Замест прызнаньня «сапраўднасьці сучаснай гісторыі Беларусі» можна сказаць пра «сябе ў сучаснай гісторыі Беларусі».

Такім чынам, мы распачынаем размову пра тыя зьявы й падзеі, якія ўтвараюць тую гісторыю Беларусі, на якую мы можам уплываць. Таму Найноўшая гісторыя зьяўляецца для нас экспэрымэнтальнай гісторыяй. Праз набыццё рэаліяў ужо можна адмовіцца ад канцэпцыі «беларускай ідэі» і прапанаваць замест яе сьветаўспрыманьне «беларускай ідэі Найноўшай гісторыі».

Адчуваньне шматмернасьці, непрадказальнасьці й наяўнасьці нашай асабістай сувязі з блізкай гісторыяй Беларусі прывяло да паўстаньня новага незалежнага праекту — Архіву Найноўшае Гісторыі.

Мэта гэтай інстытуцыі і кола людзей, якія аб'ядналіся вакол Архіву — збор і фіксацыя сьведчаньняў пра тыя падзеі Найноўшае гісторыі Беларусі, якія не знаходзілі адлюстраваньне на старонках савецкай прэсы. Афіцыйна гэтых падзеяў нібы не існавала, але яны былі й ёсьць уласна гісторыяй Беларусі. Напаміны пра такую гісторыю захаваліся ў шуфлядах сталоў і шуфлядах памяці непасрэдных удзельнікаў падзеяў. Таму засноўваецца «Шуфляда» — адмысловая архіўная старонка «НН».

Шуфляда — гэта мэтафара чаканьня ўспамінамі й дакумэнтамі таго моманту, калі яны будуць прапанаваныя для шырокага азнаямленьня. Публічнасьць робіцца важным прыёмам мэтодыкі Архіву. Працэдура калектыўнай дыскусіі актыўна выкарыстоўваецца ў навуковай практыцы на стадыі абмеркаваньня ўжо створанага інфармацыйна-навуковага прадукту. Але спэцыфіка матэрыялу Найноўшае гісторыі Беларусі такая, што сам праект вывучэньня гэтай гісторыі можа распачынацца, усе этапы збору інфармацыі могуць праводзіцца толькі пры ўмове шырокага абмеркаваньня тэмаў праекту з боку непасрэдных удзельнікаў і сьведкаў падзеяў. Неверагодна, але ад нас можа сысьці сучаснае, мы можам згубіць рэчаіснасьць з-за таго, што мы жывем нібы ў іншым месцы, жывем фантастычным жыцьцём.

У першым выпуску «Шуфляды» публікуецца «Кроніка дэмакратычнай апазыцыі і палітычных рэпрэсіяў у Беларусі 1953-88 гадоў». Ня ўсе даты ў Кроніцы абсалютна дакладныя, сюды, вядома, ўвайшлі ня ўсе падзеі. У бліжэйшых плянах Архіву Найноўшае Гісторыі — публікацыя Каталёгу непадцэнзурных выданьняў 1971-90 гадоў, матэрыялаў даведніка «Слоўнік апазыцыі Беларусі 1953-91 гадоў», матэрыялаў пра ўзброены антысавецкі супраціў і палітычную апазыцыю ў пасьляваенны пэрыяд, матэрыялаў пра ўзброены сялянскі супраціў у 20-я гады, сьпісаў ахвяраў рэпрэсіяў, дакумэнтаў пра сучасныя падзеі... Распачынаецца новая праграма вывучэньня беларускага незалежнага мастацтва. Публікацыя ўсіх матэрыялаў у «Шуфлядзе» — гэта прапанова да абмеркаваньня. Гісторыя прымушае таго, хто ў яе ўглядаецца, зьвярнуцца да самога сябе й да свайго знаходжаньня ў сучаснасьці.

Тое, што памятаем — таксама наша гісторыя.

Алег Дзярновіч

Просьба ўсе заўвагі і ўдакладненьні дасылаць на адрас: Менск 220123, а/с 71, Архіў.

Кроніка апублікаваная на старонцы 10 гэтага нумару «НН».

Пэрспэктыва Беларусі:

Краіна-запаведнік

З 30 кастрычніка да 3 лістапада ў Менску адбываўся міжнародны сэмінар «Трансрэгіянальныя і інтэрнацыянальныя аспэкты культурнае палітыкі». Сярод арганізатараў імпрэзы: Рада Эўропы, Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт (Менск), Цэнтар культурных тэхналёгіяў (Масква), шэраг беларускіх міністэрстваў і камітэтаў...

У межах сэмінару Рада культурных ініцыятываў (Менск) наладзіла творчую майстэрню «Беларусь: культурная спадчына, культурны краявід» пад кіраўніцтвам сп. Лестэра Барлея — генэральнага сакратара асацыяцыі «Europa-Nostra», якая лучыць звыш 200 інстытуцыяў, што займаюцца захаваньнем культурнае спадчыны ў 30-ці краінах Эўропы.

На творчай майстэрні, прысьвечанай пэрспэктыве разьвіцьця міжнароднага турызму ў Беларусі, беларускія ўдзельнікі эмацыйна і незьмястоўна даводзілі замежным экспэртам і адзін адному, што наша краіна мае сваю гісторыю і прыродныя рэсурсы. Як кажуць, ня горш чым у людзей... Беларуская пазыцыя хрэстаматыйная — тры кіты: прырода, помнікі і сэрвіс. Прырода яшчэ там-сям ёсьць, помнікі — адбудуем, сэрвіс — сам запрацуе, толькі кінь кліч...

На гэта дырэктар Рассійскага інстытуту культуралёгіі сп. Разлогаў выказаў некалькі зьедлівых заўвагаў, але прапанаваў сваё бачаньне канцэпцыі разьвіцьця турызму ў Беларусі. На думку сп. Разлогава, будаваць нацыянальную канцэпцыю міжнароднага турызму трэба не на тым, чым беларусы падобныя да іншых, а на тым, чым мы адрозныя, а значыць, цікавыя для іншых.

Сапраўды, нягледзячы на насычаную глябальнымі для Эўропы падзеямі гісторыю Беларусі, сучасны стан нашых урбаністычных цэнтраў, помнікаў і прыроднага асяродзьдзя варты адно скрухі. Пры роўных умовах выбару, няцяжка прагназаваць, куды адправіцца эўрапеец - аматар чыстае прыроды: на фінскія азёры, у андорскія горы ці ў якую зь «беларускіх Швэйцарыяў»... А куды захочуць паехаць на тыднёвы адпачынак аматары старасьвеччыны? У Вэнэцыю, Каір, Афіны, ці, да прыкладу, у Ліду — паглядзець, як будуюць замак? Сучасны цывілізацыйны ўзровень Беларусі, сытуацыя з аховаю прыроды і культурнае спадчыны, недаразьвітасьць элемэнтарных рынкавых адносінаў, — не пакідаюць турыстам выбару. Але гэта не падстава для пэсымізму.

На думку многіх удзельнікаў сэмінару, сучасная Беларусь адрозьніваецца ад усёй Эўропы і Расеі тым, што ў нас некранутымі засталіся цэлыя ансамблі таталітарнае эпохі. Такім чынам, для замежнага турыста наша краіна патэнцыйна цікавая як эўрапейскі запаведнік савецкага каляніялізму з сапраўды сусьветна значнымі помнікамі манумэнталізму і сацрэалізму. Гэта, на бягучы момант, у спалучэньні з культурнай палітыкай А.Лукашэнкі — бадай, самая казырная карта ў руках сёньняшняга беларускага турыстычнага бізнэсу.

Што ж, яшчэ Сэнэка раіў вучыцца годна пераносіць тое, чаго ня можаш зьмяніць адразу. Эўрапейцы раяць нам на гэтым жа і зарабляць, бо так канвэргенцыя савецкага мэнталітэту пройдзе больш натуральна і рацыянальна. Сапраўды, ці не здаравей прадаваць муляжы лукашэнкаўскай, брэжнеўскай, сталінскай эпохаў, чым паліць партрэты і трушчыць манумэнты?

Трэба канстатаваць, што мы пакуль па-ранейшаму «савецкі народ», уладальнікі самае квінтэсэнцыі савецкае спадчыны. Беларуская савецкасьць — эндэмічны рэліктавы пляст эўрапейскае цывілізацыі, самы жывы і багаты культурны рэсурс са сваімі этнаграфіяй, архітэктурай і нават культам, якога нам хопіць на пакаленьне наперад. Усё астатняе — толькі ў архівах, запасьніках альбо ў праектах. З гэтага і трэба сыходзіць, ставячы нацыянальны турызм на індустрыйныя рэйкі. Ня трэба ўкладаць ні капейкі ў Савецкую Беларусь, дастаткова стварыць адпаведнае асьвятленьне...

Ці трэба з гэтым спрачацца, шукаючы альтэрнатываў? Першасных прыродных краявідаў у нас вельмі мала, а іх крохкія экасыстэмы вельмі далікатныя. Дастаткова згадаць хоць бы Сьвіцязь, якая ўжо сёньня патрабуе рэанімацыі. Нашыя помнікі архітэктуры найперш патрабуюць доўтага і руплівага вывучэньня перад тым, як зь іх нашыя «спэцыялісты» зробяць Траецкае прадмесьце... А гэта неймаверныя капітальныя ўкладаньні, плёну якіх сёньняшняе пакаленьне не пабачыць.

Магчыма, ёсьць сэнс кансэрваваць руіны панішчаных камуністамі помнікаў, каб мы самі не забывалі гэтых урокаў? Музэі савецкай індустрыі могуць уражваць ня менш, чым музэі вандалізму. Хай сабе працуюць заводы, вырабляюць нешта, невядомага прызначэньня, каб пасьля ізноў пусьціць на разборку, пераплаўку. І гэта ж на абсталяваньні, вывезеным зь Нямеччыны ў 1945 годзе! А работнікі ў камбінэзонах узору 1964 года! І ўсё рухаецца, рухаецца... Толькі ўжо за грошы. За нармальныя грошы. А якія маглі б быць маршруты! У Гальшанскі замак, у Бярозаўскі кляштар картузаў, у Салігорск, на «Бабруйскшыну», у Музэй польска-савецкага вайсковага сяброўства, на тыповыя могілкі, у тыповую краму, у тыповую школу, на беларускае тэлебачаньне... І паўсюль леніны, чапаевы, дзяржынскія...

Першымі да ідэі рэстаўрацыі і перахаваньня Савецкае Беларусі даўмеліся не музэефікатары з рэстаўратарамі, а самі ўлады. І народ падтрымаў ініцыятыву... Можна і парады з дэманстрацыямі рабіць часьцей, каб ехалі, як на карнавалы ў Вэнэцыю ці Рыо.

У якасьці ўнікальнага запаведніка чэкісцка-калгаснае спадчыны ў нашай краіны ёсьць супэр-шанец быць сходу ўлучанай у Сьпіс Сусьветнае Спадчыны UNESCO цалкам. Ну а там... і патокі інвэстыцыяў, і росквіт бізнэсу, і вялікія пэрспэктывы. Зрэшты, такі прагноз ужо атрымаў пэўную падтрымку: міжнародны сэмінар «Транснацыянальныя і інтэрнацыянальныя аспэкты культурнае палітыкі» адбыўся ў Культурна-асьветным цэнтры кіраўніцтва справаў прэзыдэнта РБ. Удзельнікаў аўтарытэтнага міжнароднага сэмінару шчыра віталі прадстаўнікі Адміністрацыі.

Вадзім Глыньнік



Здымкі Анатоля Клешчука

МІЖНАРОДНЫ КАМЭНТАР

Цэнтральная Эўропа павяртае направа

3 лістапада на выбарах у самай беднадзейнай з эўрапейскіх краінаў, у Румыніі, посткамуністычная кіраўнічая кааліцыя пацярпела паразу.

Асноўны апазыцыйны блёк — Дэмакратычная Канвэнцыя — сабраў 32% галасоў, кіраўнічая Партыя Сацыяльнай Дэмакратыі — толькі 25%. Яшчэ 12% галасоў атрымалі сацыял-дэмакраты. Апазыцыя змагла перамагчы, бо ўпершыню пасьля падзеньня Чаўшэску згуртавалася вакол кандыдата на прэзыдэнта Эміля Канстанцінэску.

Праўда, перамога на выбарах у парлямэнт — гэта толькі паўперамогі, бо менавіта прэзыдэнт у Румыніі вызначае палітычны ды эканамічны курс дзяржавы. А прэзыдэнта вызначыць другі тур.

У першым цяперашні кіраўнік дзяржавы Ион Ілієску сабраў 31% галасоў, а Канстанцінэску — 28%. Шмат што ў гэтай сытуацыі залежыць ад «румынскага Лебедзя», былога прем'ер-міністра Пэтрэ Романа, што атрымаў 23% галасоў.

Між тым, у Баўгарыі ўсё вырашылася канчаткова. Кандыдат ад дэмакратычнай апазыцыі Пётар Стаянаў сабраў каля 60% галасоў, на цэлую галаву выперадзіўшы сацыяліста. У Баўгарыі прэзыдэнт мае збольшага прадстаўнічыя функцыі і не ўплывае на ўнутраную палітыку, аднак перамога апазыцыі можа стаць падставай для правядзеньня новых парлямэнцкіх выбараў.

Пятру Стаянаву 44 гады, ён адвакат. Нарадзіўся ў Плоўдзіве, і, што цікава, будзе першым прэзыдэнтам Баўгарыі, які нарадзіўся ў горадзе. У папярэднім урадзе Саюзу дэмакратычных сілаў займаў пасаду намесьніка міністра юстыцыі.

Цяперашні прэзыдэнт Баўгарыі Жэлю Жэлеў ня ўдзельнічаў у прэзыдэнцкіх выбарах. Рэч у тым, што баўгарскія дэмакраты вырашылі дзейнічаць паводле амэрыканскага мэтаду: спачатку правесьці «праймэрыз», папярэднія выбары, у якіх узялі ўдзел усе патэнцыйныя кандыдаты. Стаянаў аказаўся больш папулярным сярод дэмакратаў, чым Жэлеў, і дысыдэнт-прэзыдэнт не вылучаў сваёй каныдатуры.

Такая сьціпласьць годная перайманьня. Трэба заўважыць, што аналягічны досьвед скарысталі і ў Румыніі, і там, як бачна, таксама посьпехі дэмакратаў бясспрэчныя.

Відавочна, што эпоха посткамунізму вось-вось скончыцца.

Андрэй Трацюк

Украіна і Беларусь: час збліжэньня?

У Львове адбыўся міжнародны сэмінар «Новая Ўкраіна і новая Эўропа: час збліжэньня». Неяк само сабой атрымалася, што ўдзельнікі з Кіева зводзілі размову на «ўсходняга монстра», зь Нямеччыны — на праблемы турэцкай меншасьці ў роднай краіне, аўстрыйцы — на Інтэрнэт, галічане — на Ёзэфа Рота, швэды з вольнага гораду ўсіх пісьменьнікаў Гётэборга — на неабходнасьць быць стрыманымі і ветлівымі ў дыскусіі.

Што з гэтага выйшла? Пан Соскін з Кіева назваў расейскую культуру нэкрафільскай з прычыны таго, што Ленін ляжыць у маўзалеі, і, абураны пярэчаньнямі іншых удзельнікаў, пакінуў залю. У швэдаў у кавярні скралі пашпарты. Інтэлектуальны правадыр усіх галічан і рэдактар часопіса «І» Тарас Вазьняк пры канцы першага дня працы роспачна заклікаў прыгадаць тэму сэмінару і ўсё ж шукаць адказ на пытаньні «што такое эўрапейскасьць?» і «якою будзе Эўропа, калі туды трапіць Украіна?»

Ігару Бабкову ў такіх умовах не заставалася нічога, як задаць тон агульнаму мысьленьню сваім дакладам пра новую мадэрнасьць Сярэдняй Эўропы, а Андрэю Дынько — правакатыўна заклікаць Украіну да экспансіі ў Беларусь.

Беларускія спавешчаньні і вызначылі сюжэт сэмінару. Праўда, дыскутанты не паддаліся на спакусы экспансіі і вабноты мадэрнасьці і засяродзіліся на сфармуляванай Бабковым ідэі сярэднеэўрапейскага трохкутніка Вільня-Менск-Львов і развагах Дынько пра эўрапейскасьць як успрыманьне чужой культуры ў якасьці свайго чужога.

Цікавасьць да сёньняшняй паваротнай сытуацыі ў Беларусі праявілася і ў тым, што інтэрвію ў беларускіх удзельнікаў узялі ледзьве ня ўсе мясцовыя газэты і радыёстанцыі. Сапраўдным інтэлектуальным хітом сэзону стаў менскі часопіс «Фрагмэнты», які цытаваўся на сэмінары ва ўсякай прыгодзе і ўсякую пору.

Ю.Каленік

Кулі і людзі

Аляксандар Лебедзь, які меў падчас перадвыбарчай кампаніі гешэфт з Барысам Беразоўскім, працытаваў словы апошняга наконт міру ў Чачэніі: «... і развалілі нам добры бізнес. Ну дык і што, што там забіваюць — заўсёды забівалі...»

Цяпер намесьнік сакратара Рады бясьпекі Расеі Беразоўскі будзе займацца пытаньнямі адбудовы чачэнскай эканомікі.

Барыс Беразоўскі вырашыў выкарыстаць магчымасьці, якія адкрывае афіцыйная фармальная ўлада перад чалавекам, якому ўжо належыць сапраўдная нефармальная ўлада ў сёньняшняй Расеі —тэлебачаньне. Менавіта тэлебачаньне здольнае за некалькі тыдняў стварыць краіне новага героя ці новага ворага. Менавіта тэлебачаньне робіць чалавека прэзыдэнтам бяскрайніх эўразійскіх прастораў. Не Чубайс захацеў бачыць Барыса Абрамавіча на высокай пасадзе. Тыя, хто ўтрымлівае сапраўдную ўладу ў Маскве, запатрабавалі ад Чубайса «гарантыі захаваньня курсу рэформаў» ва ўмовах, калі Ельцын ці то жывы, ці то...

Расея зноў пачынае нагадваць «імпэрыю праўды». Інфармацыя кантралюецца Масквой са стараннасьцю, якая мяжуе з таталітарызмам. ОРТ, «Независимая газета», «Огонёк» належаць Беразоўскаму. НТВ, газэта «Сегодня» ды часопіс «Итоги» новаму сябру Беразоўскага Уладзіміру Гусінскаму. Абодва спрычыніліся да адстаўкі Каржакова, вяртаньня Чубайса, перавыбараў Ельцына.

Яны кіруюць Трэцім Рымам.

Барысу Беразоўскаму 50 гадоў. Усяго пяць галоў таму ён узначаліў «Логоваз», празь які былі прададзеныя дзясяткі тысяч машынаў. З 1993 году ён узначальвае Ўсерасейскі аўтамабільны альянс АВВА, рэкляму якому рабіў Вазьнясенскі, і атрымлівае крэдыт на 150 мільёнаў даляраў ад швэйцарскага аддзяленьня французскага банку BNP. Летам 1994 году ў выніку выбуху бомбы пад ягоным «Мэрсэдэсам» Беразоўскі быў цяжка паранены. За наступныя паўгода ў Тальяці забілі 52 крымінальных аўтарытэты. Газэты намякалі, што гэтая вайна ў Тальяці —гэта адказ...

Ягонае імя ня раз усплывае таксама ў сувязі з забойствам Лісьцева. Якраз у 1995 годзе Беразоўскі стаў старшынём Рады дырэктараў Грамадзкага Расейскага Тэлебачаньня...

Вельмі цяжка сфармуляваць, чаго ж канкрэтна мы чакаем ад інтэграцыі з Эўропай. Вельмі лёгка зразумець, чаму мы так баімся ўсходняга суседа.

Крывавая разбэшчанасьць каляпалітычных сфэраў уласьцівая ня толькі Расеі. Дастаткова нагадаць пра забойства былога баўгарскага прэм'ера, бізнэсмэна Лук'янава.

На мінулым тыдні загінуў таксама старшыня Лібэральнай партыі Ўкраіны, былы губэрнатар Данецкай вобласьці Яўген Шчэрбань.

Шчэрбань вяртаўся з Масквы, дзе, як кажуць, спрабаваў дамагчыся перадзелу газавага рынку Ўкраіны. На борце самалёта знаходзіўся Шчэрбань, ягоная жонка, сын, целаахоўнікі і супрацоўнікі, і пяць членаў экіпажу. У Данецкім аэрапорце першым з самалёта выйшаў ахоўнік, спусьціўся па трапу, але нічога трывожнага не заўважыў. Ня мелі падазрэньняў і тыя ахоўнікі, што чакалі Шчэрбаня за агароджай пасадачнай паласы. Але калі Шчэрбань ступіў на трап, трое невядомых, апранутых у форму авіятараў, адкрылі агонь. Шчэрбань атрымаў тры кулі навылёт у галаву, некалькі аўтаматных чэргаў у грудзі, потым яго штурханулі ледзьве не пад колы браняванага «Лінкольна», што пад'яжджаў да трапа, каб забраць гаспадара. Загінула таксама жонка Шчэрбаня ды авіятэхнік самалёта, сын Шчэрбаня пасьпеў закаціцца пад машыну. Расстраляўшы тых, што спускаліся па трапу, забойцы адкрылі агонь па вокнах аэрапорту.

Пасьля гэтага злачынцы на машынах даехалі да дальняга краю пасадачнай паласы. Празь некалькі хвілінаў белая «дзявятка», на якой кілеры, прад'явіўшы пасьведчаньні супрацоўнікаў МУС, галзінай раней трапілі на пасадачную паласу, выбухнула і згарэла. Спачатку было незрузумела, ці кілеры падарваліся разам з аўто (значыцца, тады б непадалёк прысутнічаў нехта, хто кіраваў апэрацыяй). Пазьней гэтая вэрсія не пацьвердзілася.

Загадка злачынства — зброя, зь якой быў забіты Шчэрбань. Такія пісталеты-кулямёты тыпу «Кедр» альбо «Клін» знаходзяцца на ўзбраеньні спэцпадразьдзелаў накшталт «Алмаза».

Зразумела, што забойства ажыццявілі былыя або сёньняшнія прафэсіяналы са спэцгрупаў. Незразумела, чаму забойства было такім жорсткім.

Шчэрбань узначальваў расейскамоўную, але не прарасейскую партыю. Шчэрбань, агульнавядома, вараграваў з прэм'ер-міністрам Украіны Лазарэнкам. Летась ад выбуху на стадыёне загінуў данецкі мафіёзны аўтарытэт Алік-Грэк. Зноў жа, сьцьвярджалася, што Алік-Грэк належаў да крымінальнага клану — канкурэнтаў клану Шчэрбаня...

Усё гэта — рэчаіснасьць грамадзкага жыцьця ва Ўсходняй Эўропе. Жыцьця, якое стала люстэркам тэлебачаньня.

Андрэй Рудкоўскі

Антыфашызм і анты-антыфашызм

Гэтак называлася выстава маскоўскіх авангардыстаў, у рамках якой 26-27 кастрычніка адбыўся кангрэс маладых антыфашыстаў Усходняй Эўропы.

Проста перад уваходам на выставу была выстаўленая фальш-сцэна аўтарства Ю.Хэнстлера. Такім чынам кожны, хто ўваходзіў, павінен быў выбіраць, куды йсьці — направа або налева. Гэтак Ю.Хэнстлер ставіў перад гледачамі праблему таталітарнасьці выбару: правыя/левыя — фашызм/антыфашызм.

У цэнтры выставы знаходзіўся праект Пэ Рыгвавы. Аўтар рэпрэзэнтаваў 4 пытаньні на фоне відэаматэрыялу, зробленага паводле матываў фільму Э.Хорхала «Мінэт». (У фільме паказаны твар мужчыны, у якога бралі мінэт.) А вось гэтыя 4 пытаньні: 1) якія ўмовы дыскурсу? 2) як ён узьнік? 3) хто яго суб'ект? 4) якія функцыі будуць выконваць суб'екты? На думку аўтара праекту, гэта галоўныя пытаньні антыфашыстоўскай дыскусіі ў цяперашнюю пару. У выпадку, калі ня будзе адказу, антыфашыст застанецца маніпуляваным або маніпулятарам. Што, дарэчы, адно і тое.

Удзельнікі кангрэсу прыехалі ў Маскву ў вясёлы час. Амаль напярэдадні невядомыя «начысьцілі рэпу» фюрэру карлікавай, але шумлівай партыі нацыянал-бальшавікоў — Э.Лімонаву. Гэтае ж ночы нехта пранік у штаб-кватэру «лімонаўцаў» і выкраў партыйныя сьпісы. Такога ўздыму антыфашыстоўскай барацьбы Масква ня бачыла з пачатку 1995-га, калі баевікі-габрэі з групоўкі «Кагана» атакавалі баркашоўскія патрулі. «Карычневыя» адказалі такой самай манэтай. У будынак, дзе праходзіла выстава і дзе плянавалася праводзіць канфэрэнцыю, падклалі бомбу. Зранку 26 кастрычніка супрацоўнікі МУРу прывезьлі сваіх «мухтараў» і ачапілі будынак. Канфэрэнцыю давялося пачынаць на двары.

Дэлегаты пагадзіліся, што пашырэньне ўстаноўкі «фашызм — гэта кепска, антыфашызм — гэта добра» дыскрэдытавала антыфашыстоўскі рух. Цяпер усе — антыфашысты. Лукашэнка змагаецца з апазыцыяй, ідэнтыфікуючы яе як спадчыньнікаў калябарантаў. Апазыцыя, каб набраць папулярнасьць, раскручвае Лукашэнку як сымпатызанта А.Гітлера. Фашыстамі пагадзіліся быць сёньня толькі палітычныя маргіналы (баркашоўцы) або дзеячы культуры, якія жадаюць эпатаваць грамадзтва (С.Адамовіч). Адказ на пытаньне, што такое антыфашызм сёньня, трэба, з пункту гледжаньня ўдзельнікаў кангрэсу, шукаць у рэфлексіях авангардавага мастацтва. Гэта вынікае з антыаўтарытарных традыцыяў арт-рухаў, з інтэрнацыянальнай прыроды мовы мастацтва, з таго, што «альтэрнатыўнае мастацтва» не належыць да прадажнай масавай культуры.

Што да дэфініцыяў сучаснага фашызму, то тут арганізатар выставы А.Асмалоўскі прапанаваў наступныя мэтадалёгіі.

Па-першае, фашызм як жаданьне чалавека ў дадзеных сацяльных умовах быць зьняволеным. Гэты падыход зьвязаны з школай постмадэрністаў. У кнізе «Капіталізм і шызафрэнія» Дэлез і Гватары пісалі: «Існуе 2 паласы трызьненьня. Ёсьць паранаідальна-фашыстоўскі полюс: так, я ваш, я належу да вышэйшай клясы, да выбранага народу (у беларускім варыянце, мабыць, трэба ганарыцца, што мы жывем у адзінай стабільнай краіне былога СССР). Супрацьлеглы полюс — шызафрэнічна-рэвалюцыйны: я належу да ніжэйшай расы, так, я падаўбень, я нэгар...».

Постмадэрнісцкі шызаналіз дазваляе разгарнуць непрымірэнчую крытыку фашызму як зьявы (непрымірэнчую ня ў сэнсе «антыфашызму», які ёсьць часткай бінарнай апазыцыі і складае адзінае цела з фашызмам, а ў сэнсе спробы сапраўднага антыфашыстоўскага мысьленьня і паводзінаў).

Прадстаўлены на выставе твор М.Удальцова зьвязаны з вобразам Жукава. Гітлераўскія вусікі, што малюе Жукаву, — гэта своеасаблівы пратэст супраць спробаў расейскіх уладаў зрабіць культ асобы савецкага маршала, які павінен цяпер замяніць скампрамэтаванага Сталіна.

Наступная дэфініцыя фашызму анархісцкая, яна суадносіць з фашызмам усякі тып улады. З гэтай мэтадалёгіяй зьвязаныя імёны лідараў студэнцкіх рухаў 60-х.

Нарэшце, палітычныя дэфініцыі фашызму: фашызм — гэта канкрэтны палітычны рух. В.Райх пісаў, што азначэньне «фашыст» ня лаянкавае, як, напрыклад, «буржуй». Яно проста аб'ядноўвае паняткі, якія абазначаюць мэтады кіраваньня масамі з ужываньнем аўтарытарных сродкаў.

У кожнай вышэйпрыведзенай дэфініцыі, на думку ўдзельнікаў канфэрэнцыі, відаць адзін пункт, які і зьяўляецца лякмусавай паперкай фашызоідных рэжымаў. Гэта страх фашыстаў перад ІНШЫМ. (Як правіла, гэта іншае — нацыянальная культура або авангард.) Галоўны пункт актыўнасьці фашыстаў — гэта кансэрвацыя грамадзтва, недапушчальнасьць зьменаў пры поўным кантролі сацыяльных працэсаў. Сапраўднаю альтэрнатывай фашызму можа быць адкрыцьцё ўсіх «шлюзаў» творчых, палітычных, эканамічных... Сапраўды значнае супрацьпастаўленьне сёньня ня «левыя/правыя», не «прагрэс/рэгрэс», а «рух/спыненьне».

А.ЦьвяткоЎ — «СапраЎднЫ ШызафрэніК», БылЫ ЧлеН РэдкалегіІ «ЛімонкІ», ВядомЫ АнархісТ ВыступіЎ АўтараМ СтылізаваныХ ДарожныХ ЗнакаЎ, ІдэнтыфікуючЫ ФашызМ Зь ЛюбоЙ ФормаЙ ЗаканатворчасьцІ, Зь ЛюбымІ Наперад ЗададзенымІ ПравіламІ.

З гэтага гледзішча антыфашызм — гэта творчы масавы пэрманэнтны рух, які ня мае нічога агульнага з сымуляцыямі накшталт палітычнай апазыцыі. Палітычны антыфашызм карумпаваны, зыходзячы з таго, што ён уваходзіць з фашызмам у адзіны мэханізм-дзяржаву, дзе кожны рух першага вызначае паводзіны другога. Выхад з гэтага замкнутага кола трэба бачыць у стварэньні новага антыфашыстоўскага полюсу, то бок «анты-антыфашызму». Яго першачарговае заданьне — правакаваць у антыфашыстоўскім асяродзьдзі новыя ідэі й новыя амбіцыі.

Палітычныя антыфашыстоўскія маніфэстацыі супраць Лукашэнкі вычарпалі сябе. Гэта ясна паказалі падзеі 19 кастрычніка. На гэтым фэсьце Фронту рэжым сканцэнтраваў увесь рэпрэсіўны апарат. Цяпер трэба шукаць новыя «арыгінальныя сродкі» супраціву, зьвязаныя не з традыцыйна-палітычнымі схемамі, а з паэтычна-культурным мысьленьнем. Як казаў Артур Рэмбо: «Паэзія - гэта рэвалюцыя, таму што яна расколвае кайданы, якія прыкоўваюць асобу да цьвярдыні ўмоўнасьці».

Лёлік Ушкін

11

№ 32/96
11-17 лістапада

Інфарматар
НАША НІВА

Новае слова на рынку беларускае прэсы — штотыдзень 8 палосаў патрэбнае інфармацыі

ШТОТЫДНЁВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ НАША НІВА

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ
BELARUSIAN PUBLIC RELATIONS ASSOCIATION

БІРЖА ПРАЦЫ • КНІГІ • РЫНАК • ТРАНСПАРТ • АДПАЧЫНАК • АДУКАЦЫЯ • СПАЖЫВЕЦ • ЗДАРОЎЕ • КІНО • ТБ • ТЭЛЕСАТ • РАДЫЁ • СПОРТ • МУЗЫКА • ЗА МЯЖОЮ

Прывітаньне, Шаноўны Слухач!!!
Вітаем Цябе сярод сяброў Рэдакцыі Польскага Радыё

У праграмах радыё:
Навіны з Польшчы і са сьвету, агляды польскай прэсы, актуальныя камэнтары; Сустрэчы зь людзьмі палітыкі, эканомікі, культуры; Інфармацыі пра Польшчу і польска-беларускія стасункі; Жыцьцё беларускай меншасьці ў Польшчы.

а 14.30 на кароткіх хвалях 41,18 м і 42,89
а 16.30 на кароткіх хвалях 41,27 м і 49,22 м
а 18.30 на кароткіх хвалях 41,78 м і 49,22 м
а 21.00 на кароткіх хвалях 41,78 і 50,72 м.

Нашыя перадачы знойдзеце таксама дзякуючы спадарожнікавай сувязі, а канкрэтна спадарожніку ЭЎТЭЛЬСАТ II Ф-6 Hot Bird, 13 градусаў усходняе даўжыні, частата 11,474 ГГц, гарызантальная палярызацыя, нясучая гуку (аўдыё) 7,38 МГц. Штодзённа а 6.00, 11,00 і 17.00 — усе гадзіны паводле менскага часу.

Тэлефон: (048-2) 645 93 66, 645 92 82
Факс: (048-2) 444-123

ЗАЯЎКА Ў "КАНЦЭРТ ВІНШАВАНЬНЯЎ"
БЕЛАРУСКАЙ РЭДАКЦЫІ ПОЛЬСКАГА РАДЫЁ

Прашу на хвалях Беларускае Рэдакцыі Польскага Радыё перадаць віншаваньні / прывітаньні (імя, прозьвішча, горад, вуліца, нумар дому, нумар кватэры):
Прапанаваны тэкст віншаваньняў/прывітаньняў:
Калі перадаць віншаваньні/прывітаньні:
Хто віншуе (імя, прозьвішча, горад, вуліца, нумар дому, кватэра):
Колькасьць патрэбных блянкаў, на якіх можна дасылаць заяўкі ды інфармацыйных улётак з раскладам нашых перадачаў дзеля раздачы сярод знаёмых.
Дакладныя каардынаты адрасатаў віншаваньняў ды тых, хто віншуе, патрэбныя дзеля лясаваньня невялікіх узнагародаў, якое будзем праводзіць раз на тры месяцы сярод усіх ахвотных прыняць удзел у "Канцэрце Віншаваньняў".
Просім пісаць выразна.

Паслугі ксэракопіі, выгадна, хутка. Тэлефон: 253-92-26

Прапаную працу на даму. Ад Вас — капэрта са зваротнай адрэсай. 231800, г.Слонім, а/с 23

Навучаю францускай мове хутка і якасна. Тэлефон: 231-06-33.

Баўгарская , польская мовы: пераклады, індывідуальныя заняткі. Тэл. 221-24-81

Куплю лядоўню М-131 б/к. Печ СВЧ — танна. Тэл. 294-16-99.

Прадаю драўляны новы дом 100 м2 на беразе возера ў мястэчку Камень ля Лепеля. 1 га зямлі. Лепельскі раён, в. Камень т. 2-39-70

Куплю не прыдатны да рамонту электрычны рубанак. Тэл. 294-16-99.

Бясплатныя прыватныя абвесткі

Набуду нятанна маленькі жоўценькі слоўнік ангельска-беларускі, беларуска-ангельскі. Тэлефон: 254-32-24

Шукаю спонсараў для выданьня кнігі і паштоўкі, прысьвечаных 90-ым угодкам генэрала Міхала Вітушкі. Тэлефануйце ў Слонім: 2-17-633 (да абеду)

Праца ў Даніі, сбор садавіны, 650 кг прыблізна 9$ на гадзіну, 2 капэрты са зваротнай адрэсай і купон бясплатнай абвесткі. 220073, Менск, а/с "3" Шышкоўскі В.А.

Запрашаю да перапіскі прыхільнікаў права-радыкальнага накірунку. 246012, г.Гомель, а/с 124

30 лістапада, субота, Міжнародны дзень зьмяншэньня спажываньня (No Shop Day). Перад тым, як нешта набыць, падумайце: "А ці трэба?!"

СП "Арбор" Паліграфічныя паслугі ад блянкаў да кніг. Кошты памяркоўныя. Тэлефануйце: 262-49-04.

Праца на даму са штодзённым атрыманьнем грошай, укладаньне цыркуляраў, ад 6$ на дзень, капэрта са зваротнай адрэсай. 220073, Менск, а/с 26 "РНД"

Навучаю ангельскай мове. Маю кембрыджскі сэртыфікат найвышэйшага ўзроўню, досьвед працы і навучаньня ў Лёндане. Тэлефон: 47-61-18

Шукаем беларускіх патрыётаў з г.Смалявічаў і раёну. 222210, г.Смалявічы, вул.Савецкая, 156-24

Прадаю відэакаталёг "Leonard Maltin's movie and video Guide 1994" (США, 19000 фільмаў) Тэл. 63-24-03

Куплю "Яву" нядорага. Тэлефон у Берасьці: 26-51-68

Прадам 2-х томнік А.А.Грамыкі "Памятное" (па-расейску). Гомель, тэлефон: 47-49-26

Малады абаяльны лідар-патрыёт шукае прывабную дзяўчыну-беларусачку, аднадумку і магчыма спадарожніцу жыцьця. 222310 г.Маладэчна, вул.Палявая, 39. Сяргей Юркевіч.

НАДРУКУЕМ, ПАМНОЖЫМ
БЛЯНКІ, ВІЗЫТОЎКІ, РЭКЛЯМОВЫЯ ДЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ЎЛЁТКІ.
Хутка — 1.000 асобнікаў за 10 хвілінаў.
Танна — ад 108 рублёў за копію.
На паперы якое заўгодна шчыльнасьці і на картоне.
Тэл. 39-78-49

КУПОН
Бясплатнай прыватнай абвесткі

Імя і прозьвішча

Адрэса, тэлефон

Тэкст:

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна.
220123, Менск, а/с. 71
НАША НІВА

The Publishers Weekly Bestsellers
Сьпіс бэстсэлераў на 4.11.96

На гэтым тыдні	На мінулым тыдні	Назва кнігі. Аўтар	Выдавецтва	Колькасьць тыдняў у сьпісе
1	1	The Deep End of the Ocean Жаклін Мітчард	Viking	8
2	2	The Laws of Our Fathers Скот Тароў	Farrar, Straus & Giroux	5
3	5	My Gal Sunday Мэры Хігінс Кларк	Simon & Schuster	2
4	3	Desperation Стывэн Кінг	Viking	2
5	10	The Tailor of Panama Джон Ле Карэ	Knopf	2
6	7	The Regulators Рычард Бахман	Dutton	5
7	4	Executive Orders Том Клэнсі	Putnam	11
8	6	To the Hilt Дзік Фрэнсыс	Putnam	5
9	9	The Third Twin Кэн Фолет	Crown	8
10	9	The Notebook Нікалас Спаркс	Warner	3

@1995 Cahners Publishing Company

20 ЛЕПШЫХ СЫНГЛАЎ АНГЛІІ на 03.11.1996

Месца на гэтым тыдні	Месца на на мінулым тыдні	Назва песьні	Выканаўца
1	(0)	What Becomes Of The Broken Hearted	Робсан & Джэрам
2	1(2)	Say You'll Be There	Spice Girls
3	2(1)	If You Ever	East 17
4	(0)	Angel	Simply Red
5	4(1)	Un-Break My Heart	Тоні Брэкстан
6	(0)	I Belong To You	Джына Джы
7	7(2)	You're Gorgeous	Baby Bird
8	5(2)	Insomnia	Faithless
9	3(2)	Words	Boyzone
10	(0)	Don't Make Me Wait	911
11	8(2)	It's All Coming Back To Me Now	Сялін Дыён
12	(0)	This Is For The Lover In You	Babyface
13	(0)	Possibly Maybe	Б'ёрк
14	6(1)	Place Your Hands	Reef
15	(0)	1st Of Tha Month	Bone Thugs-N-Harmony
16	12(5)	Alisha Rules The World	Alisha's Attic
17	9(1)	Follow The Rules	Livin' Joy
18	13(1)	Breakfast At Tiffany's	Deep Blue Something
19	11(1)	Neighbourhood	Space
20	15(11)	I Love You Always Forever	Дона Льюіс

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусі
АБАНЭМЭНТ на газэту **63125**
НАША НІВА

Колькасьць камплектаў

На 1996 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды _____ (паштовы індэкс) (адрэса)

Каму _____ (прозьвішча, ініцыялы)

ДАСТАЎНАЯ КАРТКА
на газэту **63125**
НАША НІВА

ПВ | месца | Літэр

Кошт	падпіскі	руб.	Колькасьць камплектаў
	пераадрас.	руб.	

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды _____ (паштовы індэкс) (адрэса)

Каму _____ (прозьвішча, ініцыялы)

С Ь В Е Т З А Т Ы Д З Е Н Ь

НЯДЗЕЛЯ, 3 лістапада

БЕЛАРУСЬ. Памёр рэжысэр Віктар Тураў.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ АФРЫКА. Ва ўзросьце 75 гадоў памёр былы дыктатар Жан-Бэдэль Бакаса. У сталіцы краіны Бангі прайшлі жалобныя цырымоніі. Бангійцы даравалі Бакасу і ўласнаручныя забойствы людзей, і людажэрства і гэрор, які панаваў у краіне падчас ягонага кіраваньня з 1966 па 1979 год.

ІЗРАІЛЬ. Былы савецкі дысыдэнт міністар працы Ізраіля Натан Шаранскі заклікаў урад падрыхтаваць народ краіны да магчымай вайны з Сырыяй за Галянскія высоты.

ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. Міністар замежных справаў Вялікабрытаніі Малькальм Рыфкінд назваў незаконным будаўніцтва габрайскіх пасяленьняў на Заходнім беразе ракі Ярдан і ў сэктары Газа, і магчымым стварэньне незалежнае палестынскае дзяржавы. Рыфкінд выступіў з гэтай заявай у горадзе Хэброне, у якім сярод ста тысячаў арабаў жыве 450 ізраільскіх пасяленцаў.

РАСЕЯ. У Маскве застрэлены з аўтамата Калашнікава амэрыканскі бізнэсмэн Пол Тэйтум, які быў суўладальнікам пяцізорачнага гатэлю "Рэдысан - Славянская". У гэтым гатэлі неаднаразова спыняўся прэзыдэнт Злучаных Штатаў Біл Клінтан і іншыя прадстаўнікі амэрыканскага істэблішмэнту.

РУМЫНІЯ. Завяршаецца сьмігадовае кіраваньне краінаю посткамуністаў на чале з прэзыдэнтам Іліеску. На парлямэнцкіх выбарах ягоная Партыя сацыяльнай дэмакратыі атрымала каля 25 працэнтаў галасоў выбаршчыкаў, у той час як апазыцыйная Дэмакратычная канвэнцыя - каля 35, што дазваляе апошняй разам зь іншымі апазыцыйнымі сіламі атрымаць кантроль над парлямэнтам. У першым туры прэзыдэнцкіх выбараў, якія прайшлі адначасова з парлямэнцкімі, Іліеску апярэдзіў кандыдата ад Дэмакратычнай канвэнцыі Эміля Канстанцінэску ўсяго на некалькі пунктаў.

БАЎГАРЫЯ. Лідар правай апазыцыі Пётар Стаянаў перамог у другім туры прэзыдэнцкіх выбараў посткамуніста Івана Маразова, набраўшы 60 працэнтаў галасоў выбаршчыкаў.

ЮГАСЛАВІЯ. Трохпартыйная сацыялістычная кааліцыя прэзыдэнта Мілошэвіча захавала кантроль над парлямэнтам, атрымаўшы 50 са 108 месцаў на выбарах, якія прайшлі ў краіне. Дэмакратычная апазыцыя атрымала усяго 21 мандат.

ПАНЯДЗЕЛАК, 4 лістапада

БЕЛАРУСЬ. Беларускія спэцслужбы арыштавалі журналістку Ціну Клыкоўскую і правялі ператрус у рэдакцыі газэты "Здравый Смысл", у якой тая працавала. Ціну Клыкоўскую абвінавачваюць у распаўсюджаньні матэрыялаў, накіраваных на "гвалтоўнае зьмяненьне канстытуцыйнага ладу краіны".

БОСЬНІЯ і ГЕРЦАГАВІНА. Прэзыдэнт Алія Ізэтбэгавіч заявіў, што звольніць з пасады намесьніка міністра абароны Хасана Чэнгіча. Чэнгіч меў шчыльныя сувязі з Іранам, што выклікала незадаволенасьць Злучаных Штатаў, якія адмыслова затрымлівалі пастаўкі ваеннай тэхнікі ўраду Босьніі на суму ў сто мільёнаў даляраў.

ЯПОНІЯ. Пачаліся сумесныя манэўры японскіх сілаў самаабароны і амэрыканскіх войскаў, якія мусяць працягвацца два тыдні. У манэўрах бяруць удзел сухапутныя войскі, флёт і авіяцыя абедзьвюх краінаў і прыкладна 10 тыс. японскіх і 12 тыс. амэрыканскіх жаўнераў.

КІТАЙ. Злучаныя Штаты і Кітай пачалі перамовы ў Пэкіне па пытаньнях кантролю над узбраеньнямі і двухбаковых узаемных дачыненьняў. На прыканцы месяца чакаецца наведваньне Кітаю джяржаўным сакратаром ЗША Ўоранам Крыстафэрам.

ГРЭЦЫЯ. Урад Грэцыі выпусьціў новую банкноту ў 200 драхмаў. На банкноце зьмешчаны партрэт нацыянальнага паэта XVIII ст. Рыгаса Фэрэаса, аднаго з заснавальнікаў тайнай рэвалюцыйнай арганізацыі "Этэрыя", які быў павешаны аўстрыйскімі ўладамі.

АЎТОРАК, 5 лістапада

ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ. Біл Клінтан абраны прэзыдэнтам ЗША на другі тэрмін. За ягонае пераабраньне выказалася каля 50 працэнтаў выбаршчыкаў. Боб Доўл атрымаў 41 працэнт галасоў, а незалежны кандыдат Рос Пэро ўсяго 8. Адначасова з прэзыдэнцкімі ў 11 штатах праходзілі выбары губэрнатараў. Кандыдаты ад дэмакратычнай партыі перамаглі ў 7 штатах. Ня гледзячы на гэта, рэспубліканцы захоўваюць кантроль над абедзьвума палатамі Кангрэсу.

БЕЛАРУСЬ. Некалькі дзясяткаў беларускіх журналістаў правялі пікет у цэнтры Менску, пратэстуючы супраць зачыненьня Радыё-101,2 і перасьледу незалежнай прэсы.

ЗАІР. Прэм'ер-міністар Заіра Кенга Вадонда адмовіўся прыняць удзел у рэгіянальнай сустрэчы краінаў Арганізацыі Афрыканскага Адзінства, скліканай для абмеркаваньня канфлікту на Заірска-Руандыйскай мяжы. Заір абвінавачвае Руанду ў падтрымцы паўстанцаў племені тутсі, якія вядуць баі з заірскімі войскамі на ўсходзе краіны.

АЎГАНІСТАН. Талібы вядуць артылерыйскі агонь з дальнабойных гарматаў па тылах войскаў Шах Масуда і Дустума, заняўшых пазыцыі ў 40 км. на поўнач ад Кабулу. Працягваюцца таксама баі паміж талібамі і Дустумам каля гораду Герат. Авіяцыя Дустума бамбавала аэрапорт гораду.

РАСЕЯ. Апэрацыя аорта-каранарнага шунтаваньня на сэрцы Барыса Ельцына пачалася а 7 гадз. раніцы і пасьпяхова завяршылася ў 14.00. Са словаў амэрыканскага хірурга Майкла Дэбэйкі, прэзыдэнту Расеі былі ўведзеныя пяць шунтоў. Такая апэрацыя дазваляе значна палепшыць функцыі сэрца і засьцерагае ад інфаркту міякарда.

ПАКІСТАН. Прэзыдэнт Пакістану Фарух Лігары адправіў у адстаўку ўрад на чале з прэм'ер-міністрам Бэназыр Бхута і распусьціў парлямэнт краіны. Абавязкі прэм'ер-міністра часова выконвае былы сьпікер парлямэнту 80-ці гадовы Мірадж Халід. Фарух Лігары прызначыў на 3 лютага 1997 году новыя парлямэнцкія выбары. Бэназыр Бхута знаходзіцца ў Ісламабадзе пад хатнім арыштам. Для засьцярогі ад магчымых хваляваньняў у сталіцу ўведзеныя войскі.

ПАЎДНЁВАЯ КАРЭЯ. Два апошнія паўночнакарэйскія дывэрсанты, якія высадзіліся на ўзьбярэжжа два месяцы таму, застрэленыя ў 10 кілямэтрах ад дэмаркацыйнай лініі, што падзяляе Карэю на дзьве часткі.

РАСЕЯ. Каля 15 мільёнаў чалавек узялі ўдзел у аднадзённай акцыі пратэсту Фэдэрацыі Незалежных прафсаюзаў Расеі.

СЕРАДА, 6 лістапада

ПАКІСТАН. Бэназыр Бхута адмаўляецца ісьці ў адстаўку з пасады прэм'ер-міністра і хоча абскардзіць рашэньне прэзыдэнта Фаруха Лігары ў Канстытуцыйным Судзе.

АЛЬЖЫР. Больш за 30 чалавек забілі ісламскія фундамэнталісты ў адной зь вёсак на поўначы краіны. Гэта адзін з самых жудасных тэрарыстычных актаў пачынаючы з 1992 году, калі альжырскія вайскоўцы адмянілі вынікі выбараў у парлямэнт, на якіх перамаглі фундамэнталісты.

ФРАНЦЫЯ. Харватыю прынялі саракавым паўнапраўным сябрам Рады Эўропы, нягледзячы на выпадкі парушэньня правоў чалавека ў гэтай краіне.

ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ. Дзяржаўны сакратар ЗША Уоран Крыстафэр падаў у адстаўку. Ён пакіне гэтую пасаду пасьля інаўгурацыі Біла Клінтана 21 студзеня. Падае ў адстаўку і міністар абароны Ўільям Пэры.

ЛЮКСЭМБУРГ. Эўрапейская камісія па пытаньнях уводу адзінай эўравалюты адзначыла, што 12 з 15 краінаў Эўрапейскага Саюзу адпавядаюць патрабаваньням, неабходным для ўводу валюты ў 1999 годзе. На прагноз Камісіі толькі Вялікабрытанія, Грэцыя і Італія ня здолеюць дамагчыся трохпрацэнтнага дэфіцыту бюджэту, што зьяўляецца галоўнай умовай для ўваходжаньня ў агульнаэўрапейскую валютную сыстэму.

КІТАЙ. Кітайскія ўлады вызвалілі вядомага дысыдэнта, лідара дэмакратычнага руху 1989 году Чэнь Цзэміна, з-за рэзкага пагаршэньня стану ягонага здароўя. Чэнь Цзэмін хворы на рак, хваробу сэрца і іншыя захворваньні.

ЯРДАНІЯ. Прэзыдэнт Ізраіля Вэйцман сустрэўся з каралём Ярданіі Хусэйнам. Падчас сустрэчы абмяркоўваліся праблемы палестына-ізраільскага мірнага ўрэгуляваньня.

СУДАН. Урад Судану спыніў дзейнасьць у краіне Міжнароднага Чырвонага Крыжа, абвінаваціўшы арганізацыю ў падтрымцы паўстанцаў з Народнай Арміі Вызваленьня.

ЧАЦЬВЕР, 7 лістапада

ЭГІПЕТ. У Каіры адбылася сустрэча прэзыдэнта Хосьні Мубарака зь міністрам замежных справаў Ізраіля Леві. Сустрэча гэтая папярэднічае прызначанаму на 12-14 лістапада ў сталіцы Эгіпту эканамічнаму саміту краінаў Блізкага Ўсходу, у якім упершыню прыме ўдзел і Ізраіль.

ПАКІСТАН. Адмысловы пасланьнік ААН Норбэрт Хол сустрэўся ў Ісламабадзе з прадстаўнікамі талібаў і Ахмад Шах Масуда для абмеркаваньня праблемы замірэньня.

ЯПОНІЯ. Рутара Хасімота пераабраны на пасаду прэм'ер-міністра. Ён абвясьціў новы склад кабінэту міністраў, які цяпер складаецца толькі зь сябраў лібэральна-дэмакратычнай партыі.

БЭЛЬГІЯ. Прадстаўнікі краінаў Эўрапейскага Саюзу правялі ў Брусэлі нараду, дзе была абмеркаваная сытуацыя ў Заіры. Удзельнікі нарады зьвярнуліся да ААН з патрабаваньнем усталяваць на мяжы Заіра і Руанды калідоры для выратаваньня соцень тысячаў уцекачоў з зоны канфлікту і для пастаўкі медыкамэнтаў і харчаваньня.

БЕЛАРУСЬ. У Менску прайшла дэманстрацыя з нагоды дня кастрычніцкага пераварота. У дэманстрацыі брала ўдзел каля 2-х тысячаў чалавек.

ІНДЫЯ. Больш за 200 чалавек загінула ў выніку урагану, які абрынуўся на поўдзень Індыі. Хуткасьць ветру дасягала 150 кілямэтраў у гадзіну. Вецер з карэньнямі вырываў дрэвы і руйнаваў дамы. Дзясяткі тысячаў людзей засталіся без жытла. Сувязь зь некаторымі рэгіёнамі адсутнічае і колькасьць ахвяраў насамрэч можа быць значна большай.

ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ. Амэрыканскае касьмічнае агенцтва NASA зьдзейсьніла пасьпяховы запуск касьмічнага апарату "Глобэл Сэрвэер" на Марс. Запуск быў праведзены з касмадрому імя Кэнэдзі, што ў штаце Флорыда. Мэта - знайсьці доказы існаваньня жыцьця на плянэце. Каб дасягнуць Марса караблю спатрэбіцца 10 месяцаў, пасьля чаго "Глобэл Сэрвэер" будзе выведзены на арбіту Марса і прабудзе на ёй 1 марсіянскі год, які роўны двум зямным.

ЗАІР. У раёне лягеру ўцекачоў каля гораду Гома ізноў пачаліся баі. Пасьля сыходу зь лягеру прадстаўнікоў міжнародных гуманітарных арганізацыяў ужо некалькі дзён няма дакладных зьвестак пра лёс больш як чатырох соцень тысячаў уцекачоў. Паўстанцы тутсі абвесьцілі пра аднабаковае спыненьне агню.



ПЯТНІЦА, 8 лістапада

ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ. Легендарны сьпявак Фрэнк Сынатра ўжо тыдзень знаходзіцца ў шпіталі з дыягназам пнэўманіі і сардэчных захворваньняў. Адміністрацыя шпіталю паведаміла, што на імя Сынатры прыходзяць сотні тысячаў лістоў з усёй краіны.

БОСЬНІЯ І ГЕРЦАГАВІНА. Прэзыдэнт Сербскай рэспублікі ў Босьні Біляна Плаўшыч звольніла з пасады міністра абароны генэрала Ратка Младзіча. Разам зь ім быў цалкам звольнены ўвесь Генэральны штаб. Младзіча. Плаўшыч падзякавала Младзічу за паслугі перад басьнійскімі сербамі падчас вайны, заявіўшы, што звальняе генэрала толькі пад ціскам сусьветнай супольнасьці.

АЎГАНІСТАН. Талібы сьцьвярджаюць, што нанеслі моцны ўдар па фармаваньнях Рашыда Дустума і Ахмад Шах Масуда, захапіўшы дзьве вышыні каля абкладзенага Кабулу.

ЗАІР. Рада Бясьпекі ААН зьвярнулася да краінаў-сябраў з тым, каб яны паведамілі пра гатоўнасьць даслаць свае войскі ў Заір для замірэньня ваюючых бакоў. Па атрыманьні гэтай інфармацыі Рада Бясьпекі канчаткова вырашыць пытаньне пасылкі войскаў ААН у раён канфлікту.

НІГЕРЫЯ. З экранаў радараў зьнік самалёт "Боінг-727" са 141 пасажырам на борце. Мяркуецца, што самалёт разьбіўся.

ААН. Злучаныя Штаты ўпершыню пазбаўленыя месца ў кансультацыйнай радзе па адміністрацыйных і фінансавых пытаньнях ААН, куды ўваходзіць 16 дзяржаваў. Запазычанасьць ЗША бюджэту ААН складае каля 1,5 мільярды даляраў.

СУБОТА, 9 лістапада

НЯМЕЧЧЫНА. Мільёны людзей у краіне і па-за яе межамі сьвяткуюць сем гадоў зруйнаваньня Бэрлінскага муру, што стала сымбалем краху таталітарных сыстэмаў ва Ўсходняй Эўропе.

АЎСТРЫЯ. У горадзе Грац праходзіць нарада лідараў 15 краінаў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы, якія аб'ядналіся ў межах так званай Цэнтральнаэўрапейскай ініцыятывы. На нарадзе абмяркоўвалася пытаньне стабільнасьці ў рэгіёне, у тым ліку і на Балканах. Канцлер Аўстрыі Враніцкі заявіў, што бязь міру на Балканах немагчымы мір у рэгіёне ўвогуле.

РАСЕЯ. Дэлегацыя Эўрапейскага Саюзу правяла перамовы ў Маскве. Міністры замежных справаў Ірляндыі, Нідэрляндаў, Італіі і намесьнік старшыні эўрапейскай камісіі па замежных справах Вандэнбрук сустрэліся з кіраўніком расейскага МЗС Яўгенам Прымаковым. Бакі пагадзіліся, што нельга дапусьціць новага падзелу Эўропы на варожыя блёкі.

ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. Пісьменьнік Салман Рушдзі прыедзе ў Данію для атрыманьня літаратурнай прэміі Эўрапейскага Саюзу. Раней урад Даніі не хацеў даваць дазволу на прыезд пісьменьніка ў краіну, баючыся за ягоную бясьпеку.

ЗША. Нацыянальная кніжная прэмія Злучаных Штатаў за мастацкі твор у 1996 годзе прысуджаная Эндру Бэрэту за кнігу "Карабельная ліхаманка". У апавяданьні, якое дала назоў зборніку, апавядаецца пра эпідэмію ліхаманкі сярод ірляндзкіх перасяленцаў у 1840 годзе.

ВУГОРШЧЫНА. У Будапэшце адбылася канфэрэнцыя пацыфістаў Эўропы. Удзельнікі канфэрэнцыі заклікалі да рэформы закона аб вайсковай службе ў некаторых краінах Эўропы. Дагэтуль у Расеі, Баўгарыі, Турцыі, Румыніі і некаторых іншых краінах пацыфістаў, якія адмаўляюцца ад нясеньня вайсковай службы засуджаюць на зьняволеньне ў вязьніцу. Пацыфісты выступаюць за стварэньне альтэрнатыўнай службы ў тых краінах, дзе існуе абавязковая вайсковая павіннасьць.

БІРМА. Лідар апазыцыі Аўн Сан Су Чы абвінаваціла ўлады Бірмы ў правакацыях адносна яе асобы. Гэта выявілася ў нападзе натоўпу людзей на яе і іншых лідараў апазыцыі, калі яны рушылі на мітынг сваіх прыхільнікаў.

ЦЫТАТА

"Стварэньне ўпершыню ў гісторыі адзінай і дэмакратычнай Эўропы зьяўляецца асноўнаю мэтаю амэрыканскай зьнешняй палітыкі... Пашырэньне NATO будзе спрыяць разьвіццю сувязяў з дэмакратычнай Расеяй. Сярод наступных задачаў - мацаваньне міру на Блізкім Усходзе, у Босьніі і іншых рэгіёнах сьвету."

Прэзыдэнт ЗША Біл Клінтан



Стэрэамагнітолы і музычныя міні-цэнтры

Вы жадаеце набыць маленькую стэрэаўстаноўку, на якой можна праграваць кампакт-дыскі (CD) і касэты і каторая мае радыё? Штыфтунг Варэнтэст правяла выпрабаваньне 11 пераносных і 8 стацыянарных установак коштам ад 300 да 1100 нямецкіх марак

"Музычныя цэнтры" — так называюць стацыянарныя кампактныя ўстаноўкі, якія маюць невялікія памеры. Іх можна разьмясьціць амаль на любой кніжнай паліцы і пры гэтым яны маюць прыблізна тое ж самае абсталяваньне, як і вялікія стэрэаўстаноўкі: прайгравальнік CD, радыё і касэтную частку. Такое ж абсталяваньне маюць таксама выпрабаваныя стэрэамагнітолы, выкананыя з пераноснай ручкай і ўмантаванымі громкагучальнікамі для мабільнай працы. Дзякуючы гэтаму, яны могуць выкарытоўвацца ў дарозе ў якасьці крыніцы інфармацыі, дома — як музычныя цэнтры.

Паводле якасьці большасьць кампактных сыстэмаў пераўзыходзіць пераносныя прыборы. Дзякуючы асобным калонкам громкагучальнікаў яны валодаюць больш поўным і аб'ёмным гучаньнем. За выключэньнем мадэлі Sharp CD-S 350, усе іншыя мадэлі маюць гнёзды падключэньня зьнешніх антэнаў, што значна павышае якасьць радыёпрыёму.

Стэрэамагнітолы такой магчымасьці ня маюць. Паводле магутнасьці ўзмацненьня і абсталяваньня большасьць пераносных прыбораў саступае стацыянарным кампактным стэрэаўстаноўкам. На вечарыне музычны цэнтар прынясе Вам задавальненьне, але яго нельга выкарыстаць у дарозе: без разэткі няма сілкаваньня. Тут наступае зорная гадзіна стэрэамагнітафонаў, якія могуць атрымаць электрасілкаваньне і ад батарэек. Аднак гэта дарагое задавальненьне, бо для большасьці мадэляў неабходна ад 8 да 10 монаэлемэнтаў. Іх хапае ў сярэднім на 50 гадзінаў працы, а потым даводзіцца мяняць. У залежнасьці ад мадэлі адна гадзіна забаваў каштуе прыблізна 0,80 ням. марак. Натуральна, што гэтыя паказчыкі вар'ююць у залежнасьці ад гучнасьці і рэжыму працы. Найбольшую колькасьць энэргіі спажываюць прайгравальнікі CD, якія ўваходзяць у камплект.

Апроч таго, радыёмагнітолы даволі цяжкія. Больш за восем кіляў важыць самая цяжкая мадэль Panasonic RX DT 610 разам з батарэйкамі. Таксама і большасьць іншых мадэляў зьяўляюцца хутчэй нязручнымі, чым пераноснымі. Толькі мадэлі Aiwa CSD EX 08 і Sony CFD 20L адносна лёгкія.

Умантаваныя громкагучальнікі наўрад ці могуць узнаўляць аб'ёмнае стэрэагучаньне. І таму асабліва непрыемна, што аніводная з мадэляў ня мае гнёздаў падключэньня зьнешніх калонак. У мадэлі Panasonic RX-DT 610 хаця б можна здымаць громкагучальнікі і ўстанаўліваць іх асобна ад магнітолы.

Гучаньне і тэхнічны ўзровень

Калі б давялося супастаўляць кампактныя стэрэаўстаноўкі з асобнымі кампанэнтамі ўстаноўкі "Хайфі"-класы, то пераможцу можна было б прадвызначыць. Найперш громкагучальнікі, узмацняльнікі і касэтныя часткі абмяжоўваюць якасьць гучаньня нават добрых музычных цэнтраў.

Стэрэагучаньне большасьці музычных цэнтраў вельмі высокай якасьці. Зь пераносных радыёмагнітолаў самае лепшае ўражаньне засталося ад мадэлі JVC RC X 720. Яна, праўда, выдаткоўвае нямала батарэек. Увогуле мадэлі гэтай коштавай групы даволі рэдка могуць адпавядаць высокім патрабаваньням слухачоў. Так, напрыклад, у большасьці прыбораў выяўленыя ваганьні хуткасьці пры працы ў касэтным рэжыме, а ў прыбораў без сыстэмы шумападаўленьня (напрыклад, сыстэмы Dolby B) было выразна чуваць непазьбежны шум матаньня стужкі.

Хто сам жадае рабіць касэтныя запісы, таму варта набыць магнітолу, якая працуе на хромавых касэтах. Якасьць гэтых касэтаў значна вышэйшая за якасьць іншых. Умантаваныя прайгравальнікі кампактных дыскаў, дарэчы, маюць ва ўсіх прыборах бездакорную якасьць, толькі вось громкагучальнікі і ўзмацняльнікі ня ў стане перадаць чысьціню гучаньня. Навушнікі дазваляюць нашмат палепшыць якасьць гучаньня і тым самым павялічыць задавальненьне ад праслухоўваньня.

Абсталяваньне

Наяўнасьць гнязда падключэньня навушнікаў і зьнешняй радыёантэны ёсьць натуральнай зьявай для ўсіх выпрабаваных мадэляў. Увогуле ж са ступеньню абсталяваньня ўзрастае і кошт. Мяжа паміж мэтазгоднымі функцыямі і тэхнічнымі забаўкамі пры гэтым вельмі ўмоўная, таму мэта прызначэньня прыбора не ў апошнюю чаргу павінна вызначаць выбар пры набыцьці. Таму, хто, напрыклад, жадае запісваць гук ад тэлевізара ці перадаваць яго праз калонкі міні-цэнтру, трэба пры пакупцы зьвярнуць увагу на наяўнасьць гнязда з высокім уваходным узроўнем (Aux) у музычнага цэнтру. Для падключэньня прайгравальніка трэба выхадное гняздо Phono. Адзінымі магнітоламі з выхадным гняздом для падключэньня CD-прайгравальніка ёсьць Panasonic RX DT 610 і Quelle. Такім чынам сыгнал умантаванага прайгравальніка кампактных дыскаў можна выкарыстоўваць для перадачы праз больш высокаякасную HiFi-ўстаноўку. Гэта вельмі практычна, бо такім чынам Вы можаце карыстацца сваёй магнітолай нават і тады, калі Вашыя патрабаваньні ў галіне HiFi-прыбораў узрастуць і Вы набудзеце сабе новую прыладу.

Абслугоўваньне

Кампактныя памеры маюць і свае недахопы. У некаторых прыбораў кнопкі кіраваньня такія маленькія і разьмешчаныя так нязручна, што недасьведчаны карыстальнік вымушаны абслугоўваць прыбор нібыта ўсьляпую. Пахвалы заслугоўваюць прыборы, якія маюць дыстанцыйнае кіраваньне. Аднак мэтазгодна, каб усе кнопкі кіраваньня былі б і на самім прыборы: інакш у выпадку псаваньня пульта дыстанцыйнага кіраваньня нельга будзе карыстацца ўсім прыборам. Як ні дзіўна, менавіта з адносна неблагой магітолай JVC можа адбыцца такая сытуацыя.

Пры распрацоўцы кіраўніцтва па эксплюатацыі большасьць вытворцаў ня вельмі абцяжарвае сябе: часта кепскай аказваецца структура тэкстаў, а малюнкі ня вельмі дапамагаюць пры эксплюатацыі. І ўсё ж яўных памылак выяўлена не было. Адносна абслугоўваньня і кіраўніцтва па эксплюатацыі трэба асобна адзначыць абедзьве мадэлі музычных міні-цэнтраў фірмаў Grundig і Panasonic.

Нашая парада

Гучаньне ў музычных цэнтраў увогуле лепшае за гучаньне ў стэрэамагнітолаў, але яны і даражэйшыя. Найлепшыя мадэлі сярод кампактных установак, Panasonic SC-CH 11 і Grundig каштуюць каля 900 і 1100 ням. марак.

Радыёмагнітолу з адзнакай "добра" Вы, нажаль, ня знойдзеце ў нашым тэсьце. Але з-за даволі нізкіх коштаў (ад 350 да 900 ням. марак) некаторыя з "задавальняючых" мадэляў добрыя пры карыстаньні. Апроч таго, радыёмагнітоле JVC RC X 720 (каля 600 марак) толькі крыху не хапіла да агульнай адзнакі "добра".

Той, хто гатовы адмовіцца ад прайгравальніка кампактных дыскаў у радыёмагнітоле, можа сэканоміць ад 100 марак.

Радыёмагнітолы з CD-прайгравальнікам

Мадэль	Aiwa CSD EX 08	GRundig RR	JVC RC X 720	Panasonic RX DT 610	Phillips AZ 8320	Quelle Universum	Sanyo MCD-Z65 [1]	Sharp WQ CD 220	Sony CFD 20 L	Telefunken RC 990 CD
Кошт у ням. марках ад да	348-359	3000 CD348-449	498-599	548-649	348-649			328-399	370-449	
Сярэдні кошт у ням. марках	349	449	599	599	413	500	898	349	448	699
Агульная адзнака якасьці	Задавальняюча	Задаваль.	Задаваль.	Задаваль.	Задаваль.	Задаваль.	Задаваль.	Задаваль.	Задаваль.	Задавальняюча
Дадатковыя заўвагі	самая маленькая вага:3,5	вага: 5,3	крыху не хапіла да адзнакі "добра" вага 7,1	крыху не хапіла да адзнакі "добра" самая вялік.вага:8,2	вага: 6,1	вага: 5,3	вага: 6,4	вага: 4,9	вага: 4,2	вага: 5,9
Праца ў рэжыме радыё	задавальн.	задавальн.	добра	задавальн.	задавальн.	задавальн.	задавальн.	задавальн.	задавальн.	задавальн.
Прыём у дыяпазоне УКХ	o	o	o	o	+	o	o	o	-	o
Слыхавы тэст на УКХ	o	o	+	-	-	o	-	o	o	o
Прыём у дыяпазонах СХ	+	+	+	+	+	o	+	+	+	+
Праца ў рэжыме прайграваньня CD	задавальн.	задавальн.	добра	добра	добра	добра	добра	добра	добра	задавальн.
Тэхнічнае выпрабаваньне	+	+	+	o	++	+	o	+	++	+
Слыхавы тэст	o	o	+	+	+	+	+	+	+	o
Праца ў касэтным рэжыме	задавальн.	задавальн.	задавальн.	задавальн.	задавальн.	задавальн.	задавальн.	задавальн.	задавальн.	зь недахопамі
Тэхнічнае выпрабаваньне	+	o	o	o	o	o	o	o	o	o
Слыхавы тэст (уласныя запісы)	o	o	o	o	o	o	o	o	o	-
Слыхавы тэст (набытыя ў музычных крамах касэты)	-	-	o	o	o	-	-	-	-	
Выхадная магутнасьць	сярэдняя	высокая	высокая	сярэдняя	сярэдняя	высокая	сярэдняя	сярэдняя	высокая	сярэдняя
Расход элемэнтаў сілкаваньня	сярэдні	невялікі	вялікі	сярэдні	сярэдні	сярэдні	вельмі вялікі	невялікі	невялікі	вельмі вялікі
Абслугоўваньне	задавальн.	добра	задавальн.	задавальн.	задавальн.	добра	зь недахопамі	задавальн.	задавальн.	задавальн.
Кіраўніцтва па абслугоўваньні	o	o	o	o	o	o	-	+	o	o
Зручнасьць пры карыстаньні	o	+	o	o	o	+	-	o	o	o

[1])Больш не вырабляецца

Музычныя цэнтры

Мадэль	Grundig Mini 10	JJVC UX A3	Panasonic SA-CH 11	Samsung MAX 36 [1])	Siemens RS 232	Sony FH-B 155	Phillips FW 21	Sharp CD S 350 [2])	Quelle Universum
Кошт у ням. марках ад да	899-1099	595-799	798-899	648-749	598-799	749-999	695-799	498-599	
Сярэдні кошт у ням. марках	1099	799	899	699	699	959	699	599	
Агульная адзнака якасьці	добра	добра	добра	добра	добра	добра	задавальняюча	задавальняюча	задавальняюча
Дадатковыя заўвагі	лепшы цэнтар у тэсьце разам з Panasonic		лепшы цэнтар у тэсьце разам з Grundig	ацэнка "добра" пастаўленая з нацяжкай	ацэнка "добра" пастаўленая з нацяжкай				
Праца ў рэжыме радыё	добра	задавальн.	добра	добра	добра	добра	задавальн.	добра	задавальн.
Прыём у дыяпазоне УКХ	+	o	+	+	+	+	+	+	+
Слыхавы тэст на УКХ	+	o	o	+	o	o	+	+	o
Прыём у дыяпазонах СХ	++	o	++	o	+	+	+	+	-
Праца ў рэжыме прайграваньня CD	вельмі добра	вельмі добра	вельмі добра	добра	добра	добра	добра	задавальн.	добра
Тэхнічнае выпрабаваньне	+	++	++	+	++	o	+	++	++
Слыхавы тэст	++	++	++	+	+	+	+	o	+
Праца ў касэтным рэжыме	добра	добра	вельмі добра	задавальн.	задавальн.	добра	задавальн.	заадавальн.	задавальн.
Тэхнічнае выпрабаваньне	o	o	+	o	o	+	o	o	o
Слыхавы тэст (уласныя запісы)	++	++	++	o	o	o	-	o	o
Слыхавы тэст (набытыя ў музычных крамах касэты)	+	++	++	o	+	+	o	o	+
Выхадная магутнасьць	высокая	высокая	высокая	вельмі высокая	сярэдняя	вельмі высокая	вельмі высокая	высокая	вельмі высокая
Расход элемэнтаў сілкаваньня	выкарыстаньне батарэек немагчымае								
Абслугоўваньне	добра	задавальн.	добра	задавальн.	задавальн.	задавальн.	задавальн.	задавальн.	зь недахопамі
Кіраўніцтва па абслугоўваньні	+	o	+	-	o	+	o	o	o
Зручнасьць пры карыстаньні	+	o	+	o	o	o	o	o	-

[2])Больш не вырабляецца. Новая мадэль S 360

ПАНЯДЗЕЛАК, 11

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 «Дзе яно, каралеўства Лябедзія?» Д/ф.
8.50 «Бюро знаходак». Мультфільм.
9.25 «Маленькая чараўніца». Х/ф.
10.30 Фінансавы час.
10.50 Тэлевізійны Дом кіно.
11.50 «Залатыя ключы».
15.00 Навіны.
15.10 Мультфільмы.
15.30 ТБ - школе.
16.00 Студыя «Вакно».
17.05 На добры лад.
17.20 «Гэтага мы не праходзілі...»
17.35 Крок.
18.05 Фінансавы час.
18.25 Музычны антракт.
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.00 Рэфэрэндум: шчырая размова.
19.45 Бар'еры.
20.15 Люстра.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.50 «Волга-Волга». М/ф.
23.30 Музыка бязь межаў.
24.00 Навіны.

КАНАЛ «РАСЕЯ»

16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
16.20 Блёк-нот.
16.35 Гульня ўсур'ёз.
17.05 Ваш партнэр.
17.15 L-клюб.
18.00 Момант праўды.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 «Санта-Барбара». М/ф.
20.30 Схаванай камэрай.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 «На вастрыі нажа». М/ф.
22.05 Тэлескоп.
22.30 Прахалодны сьвет.
23.25 Тавары — поштай.
23.35 Ня сьпі і глядзі.
24.00 Музыка ўсіх пакаленьняў.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 0.30 Інфарм ТБ.
12.10 «Партрэт жанчыны».
13.00 Тэрмін адказу — сёньня.
13.30 Парады садоўнікам.
13.40, 20.35 Тэлеслужба бясьпекі.
14.10 «Убойны аддзел».
15.00 «Каварства і каханьне».
15.40 Скарбы Пецярбурга.
16.05 Храм.
16.35 «Інспэктар Гэджэт».
16.55 «Парад парадаў».
17.40 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 «Партрэт жанчыны».
20.10 Рытмы гораду.
20.50 Спартовы агляд.
21.00 «Убойны аддзел».
21.55 Падзея.
22.10 Гістарычныя досьледы.
22.50 «Старое танга». А.Райкін.
23.00 «Адрэса - тэатар». Т/ф.

ОРТ

8.00 Навіны
8.15 «Новая ахвяра».
9.05 «Поле цудаў»
10.00 Чалавек і закон
10.30 «Адгадай мэлёдыю».
11.00 Навіны
11.10 «Зьберажы сябе»
11.55 «Народжаная рэвалюцыяй».
13.15 Брэйн рынг
14.00 Навіны
14.20 «Касьмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша».
14.45 Маратон-15
15.00 Зорная гадзіна
15.40 «Карын і яе сабака».
16.05 Джэм
16.30 «Вакол сьвету».
17.00 Навіны
17.20 «Новая ахвяра».
18.10 Гадзіна пік
18.35 «Адгадай мэлёдыю».
19.00 «Калі...»
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Гадзіна
20.40 «Багз-2». «Бітва за ўраджай»
21.45 Прэс-клюб
22.40 Навіны
22.50 «Лінія кіно». «Гангофэр».

НТБ

7.00 Сёньня ранкам.
9.00 М/ф «Сямейка Флёдэр».
11.00 Сёньня апоўдзень.
12.00 РАСЕЙСКІЯ ЎНІВЭРСЫТЭТЫ.
13.00 Сёньня ўдзень.
13.15 Вялікая часінка.
15.00 Сёньня ўдзень.
15.30 Дыстанцыя 60.
16.30 М/ф «Блакітнае дрэва». С. 1.
17.30 Футбольны клюб.
18.00 Сёньня ўвечары.
18.35 Герой дня.
19.00 Сьвет кіно. «Жалезны прэфэкт».
21.00 «Сёньня ўвечары».
21.35 Гадзіна сэрыялу. «За мяжой магчымага».
22.30 Часінка.
23.00 Сёньня апоўначы.
23.20 Тэніс апоўначы.

АЎТОРАК, 12

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 «Гэтага мы не праходзілі...»
8.30 Абібок.
9.00 ТБ - школе.
9.30 Мультфільмы.
9.50 Тураб'ектыў.
10.20 «Галасы мінулага».
10.50 «Трапічная сьпёка».
11.50 Чацьвертае вымярэньне.
12.25 Акаляда.
15.00 Навіны.
15.10 М/ф для дзяцей.
16.00 Мультфільмы.
16.20 ТБ - школе.
16.50 «Усё пра ўсё».
17.15 Востры вугал.
17.45 Заняткі Н.Наважылавай.
18.15 «Будзьце здаровыя».
18.25 Музычны антракт.
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.35 «Трапічная сьпёка».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.10 М/ф «Кроў за кроў».
23.50 Навіны.

КАНАЛ «РАСЕЯ»

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па даросе на працу.
6.35 «Мак і Матлі».
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20 Прыёмная доктара Багданава.
7.30 Ранішні экспрэс-2.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 «Дарагая рэдакцыя...»
8.55 «Санта-Барбара». М/ф.
9.50, 23.25 Тавары — поштай.
16.20 Блёк-нот.
16.35 «Чэленджэрс».
17.10 Тэлечасопіс «Здароўе».
17.20 Кропка апоры.
17.45 Надзвычайны канал.
18.10 Лідар-прагноз.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 «Санта-Барбара». М/ф.
20.30 Раз на тыдзень.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 Мужчына і жанчына.
21.45 Ціхі дом.
22.25 Эх, дарогі!
23.35 Хто на што здатны.
23.50 Гарачая дзясятка.
0.45 Музыка ўсіх пакаленьняў.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 23.35 Інфарм ТБ.
12.10 «Партрэт жанчыны».
13.00 Тэрмін адказу — сёньня.
13.30 Парады садоўнікам.
13.40, 20.40 Тэлеслужба бясьпекі.
14.05 «Убойны аддзел».
14.55 Творчая сустрэча.
16.10 Тата, маці і я — спартовая сям'я.
16.35 «Інспэктар Гэджэт».
17.05 Дзіцячае ТБ: «Дзецям пра зьвяроў».
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 «Партрэт жанчыны».
20.15 Раман з героем.
20.55 Спартовы агляд.
21.05 «Убойны аддзел».
21.55 Падзея.
22.10 «Інспэктар паліцыі». М/ф. С. 1.

ОРТ

8.00 Навіны
8.15 «Новая ахвяра».
9.05 «Калі...»
9.45 Сьмехапанарама.
10.15 «Не хачу і ня буду». Мультфільм
10.30 «Адгадай мэлёдыю».
11.00 Навіны
11.10 «Мы і рынак»
11.55 «Народжаная рэвалюцыяй». С.3
13.15 Брэйн рынг
14.00 Навіны
14.20 «Касьмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша».
14.45 Квар'етэ «Вясёлая кампанія»
14.55 Мульцітролія
15.10 Чароўны сьвет, ці Сьнэма
15.40 «Карын і яе сабака».
16.05 ...Да шаснаццаці і болей
16.30 «Вакол сьвету».
17.00 Навіны
17.20 «Новая ахвяра».
18.10 Гадзіна пік
18.35 «Адгадай мэлёдыю».
19.00 Тэма
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Гадзіна
20.40 Фільм «Сяброўкі»
22.35 Хакей. Эўраліга. «Дынама»(Масква) - «Валерэнген»(Осла). Т. 2, 3.
0.05 «Пятніца, 13».

НТБ

7.00 Сёньня ранкам.
9.00 М/ф «Сямейка Флёдэр у Амэрыцы».
11.00 Сёньня апоўдзень.
12.00 РАСЕЙСКІЯ ЎНІВЭРСЫТЭТЫ.
13.00 Сёньня ўдзень.
13.15 Вялікая часінка.
15.00 Сёньня ўдзень.
15.30 Дыстанцыя 60.
16.30 «Блакітнае дрэва».
17.30 «Вуліца Сэзам».
18.00 Сёньня ўвечары.
18.35 Герой дня.
19.00 Сьвет кіно. «Малыш Бонэр».
20.45 Доктар Угал.
21.00 Сёньня ўвечары.
21.35 Гадзіна сэрыялу. «За мяжой магчымага».
22.30 Часінка.
23.00 Сёньня апоўначы.
23.20 Кавярня Абломаў.

ЧАЦЬВЕР, 14

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 Аўта-парк.
8.30 «Прыроды храм нерукатворны». Д/ф.
9.00 Канцэртны сэзон.
9.25 Мультфільм.
9.35 «Тэлебом».
10.35 Мультфільм.
10.55 «Трапічная сьпёка».
11.55 Майстроўня.
12.15 Відзьма-нявідзьма.
15.00 Навіны.
15.10 Мультфільмы.
16.00 Сядзіба.
16.30 «Дзядзька Язэп». Д/ф.
16.50 Крэда.
17.10 Канцэртны сэзон.
17.55 Госьці ў хату.
18.25 Музычны антракт.
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.35 «Трапічная сьпёка».
20.35 «Хто гэта?»
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Аўта-парк.
22.20 М/ф «Вустрыцы зь Лязаны».
23.35 Супэргол.
0.05 Навіны.
0.20 Каралеўскае паляваньне.

КАНАЛ «РАСЕЯ»

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па даросе на працу.
6.35 «Мак і Матлі».
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20 Новая адвакатура.
7.30 Ранішні экспрэс-2.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 «Дарагая рэдакцыя...»
8.55 «Санта-Барбара». М/ф.
9.50, 23.25 Тавары — поштай.
10.20 «Пастка». С. 3.
16.20 Блёк-нот.
16.35 «Чэленджэрс».
17.05 Тэлечасопіс «Здароўе».
17.15 Даміно Міхаіла Баярскага.
17.45 Суайчыньнікі.
18.10 Клюб губэрнатараў.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 «Санта-Барбара». М/ф.
20.30 «Гарадок».
21.05 Надвор'е на заўтра.
21.10 «Парад плянэтаў». М/ф.
23.35 «Хто на што здатны».
23.50 Ня сьпі і глядзі.
0.15 Музыка ўсіх пакаленьняў.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 23.25 Інфарм ТБ.
12.10 «Гісторыя каханьня».
13.00 Тэрмін адказу — сёньня.
13.25 Парады садоўнікам.
13.40, 20.40 Тэлеслужба бясьпекі.
14.10 «Убойны аддзел».
15.00 «Тэлекампакт».
15.40 «Парад кветак». Д/ф.
16.10 Асабістая справа.
16.40 Дом кіно.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 «Гісторыя каханьня».
20.10 «Таямніцы палацаў». С. 3.
20.55 Спартовы агляд.
21.05 «Убойны аддзел».
21.55 Падзея.
22.10 «Інспэктар паліцыі». С. 2.

ОРТ

8.00 Навіны
8.15 «Новая ахвяра».
9.05 Тэма
9.50 «У сьвеце жывёлаў»
10.30 «Адгадай мэлёдыю».
11.00 Навіны
11.10 Кантакт.
11.55 «Народжаная рэвалюцыяй». С. 4
13.30 Брэйн рынг.
14.00 Навіны
14.20 «Касьмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша».
14.45 Кактус і К
14.55 До-мі-соль
15.10 Покліч джунгляў
15.40 «Карын і яе сабака».
16.05 Тэт-а-тэт
16.30 «Вакол сьвету».
17.00 Навіны
17.20 «Новая ахвяра».
18.10 Гадзіна пік
18.35 «Адгадай мэлёдыю».
19.00 «У пошуках страчанага».
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Гадзіна
20.40 Фільм «Сібірыяда». С. 1.
22.05 «Жыцьцё і сьмерць Зоі Фёдаравай». Вэрсіі
23.05 Навіны
23.15 «Пятніца, 13».

НТБ

7.00 Сёньня ранкам.
9.00 Раніцні сэанс. «Арабскі сябра».
10.30 «Вуліца Сэзам».
11.00 Сёньня апоўдзень.
12.00 РАСЕЙСКІЯ ЎНІВЭРСЫТЭТЫ.
13.00 Сёньня ўдзень.
13.15 Вялікая часінка.
15.00 Сёньня ўдзень.
15.30 Дыстанцыя 60.
16.30 «Блакітнае дрэва».
17.30 «Вуліца Сэзам».
18.00 Сёньня ўвечары.
18.35 Герой дня.
19.00 Сьвет кіно. «Малыш Бонэр».
20.45 Доктар Угал.
21.00 Сёньня ўвечары.
21.35 Гадзіна сэрыялу. «За мяжой магчымага».
22.30 Часінка.
23.00 Сёньня апоўначы.
23.20 Кіно не для ўсіх. «Бельня ночы».

ПЯТНІЦА, 15

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 Аксамітавы сэзон.
8.45 «Адлюстраваньне». Д/ф.
9.00 ТБ - школе.
9.20 Студыя «Калыханка».
9.50 «Зробагаміне жартуюць». М/ф.
10.55 «Трапічная сьпёка».
11.55 Люстра.
12.20 Майстроўня.
12.45 «Зорная ростань».
13.20 Творцы.
13.55 «Кіроўца аўтобуса». М/ф. С. 1.
15.00 Навіны.
15.10 «Кіроўца аўтобуса». С. 2.
16.15 Мульфільмы.
16.55 ШАНС.
17.25 «Крок».
17.55 Кантрасты.
18.25 Музычны антракт.
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны.
19.35 «Трапічная сьпёка».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.10 «Жонка містэра О'Хара». М/ф.
23.40 «12, ці На ноч гледзячы».
24.00 Навіны.
0.15 Акаляда.

КАНАЛ «РАСЕЯ»

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па даросе на працу.
6.35 «Мак і Матлі».
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20 Мультфільм.
7.30 Ранішні экспрэс-2.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 «Дарагая рэдакцыя...»
8.55 «Санта-Барбара». М/ф.
9.50, 23.25 Тавары — поштай.
10.20 Гандлёвы дом «Ле Монці».
10.35 «Пастка». С. 5.
16.20 Блёк-нот.
16.30 Часопіс часопісаў.
16.45 Імпэрыя гульняў.
17.35 Крок за крокам.
17.45 Вэртыкаль.
18.10 Бясконцае вандраваньне.
18.40 Асабліва важныя пэрсоны.
19.30 «Санта-Барбара». М/ф.
20.30 Сам сабе рэжысэр.
21.05 Надвор'е на заўтра.
21.10 «Лісты ў мінулае жыцьцё». М/ф.
22.45 Рэк-тайм.
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 «Слухаць пададзена».

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 0.20 Інфарм ТБ.
12.10 «Гісторыя каханьня».
13.00 Тэрмін адказу — сёньня.
13.25 Парады садоўнікам.
13.40, 20.40 Тэлеслужба бясьпекі.
14.05 «Убойны аддзел».
15.45 Мультфільм.
16.05 Ток-шоў «Наўздагад». В.Ліванаў.
16.35 Мультфільм.
16.55 Тэлекампакт.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 «Гісторыя каханьня».
20.10 Памяці ўладыкі Іаана.
20.55 Спартовы агляд.
21.05 «Убойны аддзел».
21.55 Падзея.
22.10 Як быць каханымі.
22.40 «Дуплет». М/ф.

ОРТ

8.00 Навіны
8.15 «Новая ахвяра».
9.10 «Мая сям'я»
9.50 «Пакуль усе дома».
10.25 Грай, гармонік любы!
11.00 Навіны
11.10 Ад пятніцы да пятніц.
11.55 «Народжаная рэвалюцыяй».
13.30 Брэйн рынг.
14.00 Навіны
14.20 Фільм-казка. «Агонь, вада і ... мядзяныя трубы».
15.45 «Карын і яе сабака».
16.10 Дзейсныя асобы
16.30 «Вакол сьвету».
17.00 Навіны
17.20 «Новая ахвяра».
18.15 Чалавек і закон
18.45 Поле цудаў
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Гадзіна
20.40 «Сібірыяда». С. 3.
22.15 Погляд
23.00 Навіны
23.10 Начная кіназаля. «Таямніца»

НТБ

7.00 Сёньня ранкам.
9.00 М/ф «Мая сямейная рэліквія».
10.30 «Вуліца Сэзам».
11.00 Сёньня апоўдзень.
12.00 РАСЕЙСКІЯ ЎНІВЭРСЫТЭТЫ.
13.00 Сёньня ўдзень.
13.15 Вялікая часінка.
15.00 Сёньня ўдзень.
15.30 Дыстанцыя 60-ых.
16.30 М/ф «Блакітнае дрэва».
17.30 Футбольны клюб.
18.00 Сёньня ўвечары.
18.35 Герой дня.
19.00 Фільм «Каханьне на высьпе сьмерці».
20.45 Доктар Угал.
21.00 Сёньня ўвечары.
21.35 Гадзіна сэрыялу. «За мяжой магчымага».
22.30 Часінка.
23.00 Сёньня апоўначы.
23.20 Сьвет кіно. «Крывавая маці».
0.50 Начны канал. Эратычныя шоў сьвету.

СУБОТА, 16

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 «Зорка Максіма». Д/ф.
8.00 Навіны.
8.15 Сугучнасьць.
8.35 Сутнасьць.
9.05 «Лёс мой і надзея».
9.40 Здароўе.
10.15 Заняткі Н.Наважылавай.
10.45 Усё пра ўсё.
11.10 Мультфільм.
11.40 Бон тон.
12.10 Асілак.
13.10 Шматгалосьсе.
13.40 Алімп: ад падножжа да вяршыні.
14.00 Каляж.
14.30 Сьвет прыроды і забаваў.
15.00 Навіны.
15.10 Мультфільмы.
15.40 «Цяжар». М/ф.
16.10 Беларускі дом.
16.50 Радавод.
17.10 Прэс-імпрэза.
17.50 «Крок».
18.20 Галерэя.
18.50 Навіны.
19.05 Музычная праграма.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.10 М/ф «Ад імя ўсіх сваіх». Ч. 1.
23.30 Відзьма-нявідзьма.

КАНАЛ «РАСЕЯ»

7.00 Лукамор'е.
7.25 Мультфільмы.
8.05 «Мак і Матлі».
8.30 На вашыя лісты.
9.00 Кнігарня.
9.15 Парлямэнцкі тыдзень.
10.00 Весткі ў адзінаццаць.
10.15 Тэлечасопіс «Здароўе».
10.30 Добрай раніцы.
11.00 Доктара выклікалі?
11.30 Ананімныя суразмоўцы.
12.00 Паэт у Расеі - болей, чым паэт.
12.30 Прасьцей простага.
13.00, 19.00, 23.55 Весткі.
13.20 «Залатыя гады». С. 3.
14.15 Нічога, апроч...
14.30 Дэ факта.
15.00 Настаўнік года-96.
15.30 Свая гульня.
16.00 Сад культуры.
16.25 Рэпартэр.
16.40 «Амаль сьмешная гісторыя». М/ф.
19.35 Суботні вечар зь Людмілай Касаткінай.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 Двайны партрэт.
22.00 «Спадар Лёс». М/ф.
0.10 Праграма «А».

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

9.25 Па рацэ плыве сякера.
9.55, 11.55, 13.55, 15.55, 18.55 Інфарм ТБ.
10.10 «Гонар маю».
10.35 «Колькі пачуцьця ў родным напеве». Ф/к.
11.10 Ток-шоў «Наўздагад». А.Макарэвіч.
11.40 Жарсьці-мардасьці.
12.10 «Двайнік». Тэлеспэктакаль.
14.10 Тэатральная правінцыя?..
14.35 «Помнік Пятру Вялікаму». Д/ф.
14.50 Мультфільм.
15.10 Спартовы агляд.
15.25 Парадоксы гісторыі.
16.10 «Уік-энд» з дэтэктывам.
16.35 Дзіцячае ТБ: «Сьмяхотрашкі». «Ад і да...»
17.05 «Іржавыя правады».
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.20 «Місіс Айрыс едзе ў Парыж». М/ф.
20.55 Сьвецкая кроніка.
21.10 Блеф-клюб.
21.45 Раман з героем.
22.10 «Уік-энд» з дэтэктывам.
22.30 «Парад парадаў».

ОРТ

7.00 М/ф «Штрафны ўдар»
8.30 Аўтамабіль і я
8.45 Хатняя бібліятэка
9.00 Навіны
9.10 Слова пастыра.
9.30 «Не пазяхай!»
10.00 Ранішняя пошта
10.35 Смак
10.55 Вяртаньне Трацьцякоўкі.
11.20 М/ф «Камітэт 19-ці».
14.00 Навіны
14.20 Відавочнае-неверагоднае
14.50 Мультфільмы.
15.45 Сонечная выспа палкоўніка Кадафі
16.15 «Кола гісторыі»
17.00 Навіны
17.20 У сьвеце жывёлаў
18.00 Фільм «Жаніцьба Бальзамінава»
19.45 Дабранач, дзеці!
20.00 Гадзіна
20.50 «Сібірыяда». С. 4
22.15 «Калямбур».
22.45 Фільм «Ліханманка ў джунглях».

НТБ

7.00 Сёньня ранкам.
9.00 М/ф «Робін Гуд». Ф. 1.
10.35 «Зразумей мяне».
11.00 Сёньня апоўдзень.
12.00 Хакей. Чэмпіянат Расеі.
14.30 Парад рэпартэраў.
15.00 Сёньня ўдзень.
16.00 Сэрыял што зьходзіць. «ЦРУ». С. 2.
16.30 «Вялікая ілюзія. Вялікая вандроўка ў Галівуд». Фільм 1.
17.00 Мультсэрыял «Чалавек-павук». С. 1.
17.30 «Дог-шоў. Я і мой сабака».
18.00 Сёньня ўвечары.
18.30 «Чалавек у масцы».
19.20 «Крымінальная Расея: Сучасныя кронікі».
20.00 Надоечы.
20.45 Ляпькі.
21.00 Сёньня ўвечары.
22.35 Сьвет кіно. «Заўсёды».
23.45 Трэцяе вока.
0.30 Начны канал. «Плэйбой».

НЯДЗЕЛЯ, 17

БТ

8.00 «Забароўна», «Ёсьць край адзін...» Д/ф.
8.40 Творцы.
9.10 «Канон».
9.35 «Уся справа ў капелюшы».
10.10 «Усё нармальна, мама!»
10.40 Тураб'ектыў.
11.10 Збройны.
11.40 Вяршыня сьвету.
12.00 Студыя «Вакно».
12.55 Міжнародны кур'ер.
13.25 «Гісторыя каханьня».
13.45 Вяскоўцы.
14.30 «Віншуем вас!»
15.20 «Вайна ў паветры».
15.45 Вяршыня сьвету.
16.05 Элеанора Язерская запрашае...
17.30 Абібок.
18.05 М/ф «Твая воля, Госпадзе!»
19.40 Калыханка.
20.00 Рэзананс.
20.50 Спартовы тэлекур'ер.
21.10 Навіны-ТБ.
21.25 Ток-шоў «Карамболь».
22.00 «Хрустальны бусел».
22.15 «Ад імя ўсіх сваіх».
23.30 Аксамітавы сэзон.
24.00 «Цёмны пакой».

КАНАЛ «РАСЕЯ»

7.00 Лукамор'е.
7.25 Мультфільм.
7.50 Лято-мільён.
8.05 «Мак і Матлі».
8.30 Пілігрым.
9.00 Вуснамі дзіцяці.
9.30 Прысяга.
10.00 Весткі ў адзінаццаць.
10.15 Рассейскае лято.
10.55 Прыз групы «Сава».
11.00 Чалавек на Зямлі.
11.30 Кнігарня.
12.00 Тэлетэатар. М.Горкі. «Каханьне на плыце».
12.30 Прасьцей простага.
13.00, 23.30 Весткі.
13.20 «Залатыя гады». С. 4.
14.15 Нічога, апроч...
14.30 У сьвеце жывёлаў.
15.00 Караоке па-расейску.
15.30 XX стагодзьдзе ў кадры і за кадрам.
16.10 Футбол бязь межаў.
16.40 «Ва ўсіх на вуснах».
17.00 Чароўны сьвет Дысней.
17.55 Анцыляг і К.
19.00 Люстра.
19.55 Надвор'е на заўтра.
20.00 Рэпартаж ні пра што.
20.15 «Сэрцы чатырох». М/ф.
21.55 «Хітрык-22».
22.50 У Ксюшы.
23.25 Дзелавыя гульні.
23.45 Лепшыя гульні НБА.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

9.25 Тата, маці і я — спартовая сям'я.
9.55, 11.55, 13.55, 15.55, 18.55 Інфарм ТБ.
10.10 Овэртайм.
10.35 «Неўтаймаваная Афрыка».
11.05 Флёту быць.
11.15 «Старое танга».
11.40 Увесь гэты цырк.
12.10 «А кароль толы...» Тэлеспэктакаль.
13.45 Мультфільм.
14.10 Яшчэ адна Расея.
15.10 «Фантанны дом».
16.10 Спартовая праграма.
16.35 Дзіцячае ТБ: «Залаты ключ», «Каша-малаша», «Брасайка».
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Скарбы Пецярбургу.
19.25 «Блакітнавокі». М/ф.
20.55 Усе бачаць.
21.10 Ноў смокінг.
21.55 Міжнародны агляд.
22.20 «Паглядзім».
22.35 «Кумпарсыта». М/ф.

ОРТ

7.00 Фільм «Русалка»
8.30 Мультфільм «Маўглі».
9.00 Навіны
9.15 «Непуцёвыя нататкі» Д.Крылова
9.30 Пакуль усе дома
10.10 Раніцняя зорка
11.00 «Служу Расеі!» «Вайсковы кур'ер».
11.30 Грай, гармонік любы!
12.00 Правінцыйныя гісторыі.
12.30 Сэрыял «Падводная адысэя каманды Кусто». «Трагедыя неркі»
13.25 Сьмехапанарама.
14.00 Навіны
14.20 Зоркі оперы. Хасэ Карэрас
15.10 Клюб вандроўнікаў
15.55 Мультфэерверэрк.
16.40 «Сам на сам»
17.10 «Шчасьлівы выпадак»
18.00 «Што ведае пра каханьне каханьне...»
19.00 Гадзіна
19.40 КВЗ - 96.
21.50 Футбольны агляд.
22.20 Навіны
22.30 М/ф «Мыс боязі»

НТБ

7.00 Сёньня ранкам.
9.00 М/ф «Робін Гуд: Бойка за карону».
10.35 «Зразумей мяне».
11.00 Сёньня апоўдзень.
12.00 Фільм «Закон есьць закон».
13.35 «НТБ-Плюс».
14.00 «Дзікая прырода».
15.00 Сёньня ўдзень.
16.00 Тэлегульня «Ключы ад форту Баяр».
17.30 «Сто да аднаго».
18.00 Сёньня ўвечары.
18.30 М/ф «Вольная ад мужчынаў».
20.00 Вынікі.
21.10 Сьвет кіно. «Прароцтва».
23.00 Лепшыя шоў і вар'етэ сьвету. «Парадзі Лятэн».

11.11 - 17.11

КІНО. МЕНСК

АЎРОРА *(Прытыцкага, 23, тэл. 533-360, 533-361)* — Вандроўная куля, 11-17 — 16.30, 20.30 Прыгадаць усё, 11-17 — 18.30 Для дзяцей: Пабочным уваход дазволены, 11-13 — 14.30 Чароўная спадчына, 14-17 — 14.30

БЕРАСЬЦЕ *(пр. газэты "Праўда", 25, тэл. 728-660, 716-888)* - Паміж анёлам і бесам, 11-12, 13 — 16.20, 19.20; 13 — 17.20, 20.30; 15-16 — 17.00; 17 — 18.40 Запавет блакітнага дзядзькі, 11-12, 14 — 18.00, 21.00; 13 — 19.00; 15-16 — 18.40; 17 — 20.20, 21.40 Інфармацыйна-забаўляльная праграма, 15-16 — 20.00 Для дзяцей: Мультфільмы, 11-12, 14 — 15.00; 13 — 10.00; 17 — 14.30 Шляхцянскае гняздо, 13 — 15.00; 15-16 — 14.30 Інфармацыйна-забаўляльная праграма, 17 — 16.00

ВІЛЬНЯ *(Каліноўскага, 55, тэл. 655-262)* - Дасканалыя бандыты, 11-16 — 15.00; 17 — 15.00 (ільготны) Назіральнік жарсьці, 11-17 — 16.50,, 18.20, 19.50, 21.20 Інфармацыйна-забаўляльная праграма "Усьмешка", 12, 16-17 — 21.00 Альтэрнатыўная дыскатэка, 14 — 21.00 Танцавальны вечар "Для тых, каму за 30", 15 — 20.30 Кіна-дыска-шоў для падлеткаў, 17 — 15.00

ДРУЖБА Дэтэктыў КІД, 11-12 — 18.00 Інфармацыйна-забаўляльная праграма для моладзі, 15-16 — з 20.00 па 23.00 Начная інфармацыйна-забаўляльная праграма, 15-16 — з 23.00 па 5.00 Штодзень працуе відэабар з 12.00 па 23.00

ЗЬМЕНА *(Даўгабродзкая, 4, тэл. 353-903)* - Чайкоўскі (2 сэрыі) (у гал. ролі І.Смактуноўскі), 11-17 — 16.30 Студэнцкія вакацыі (камэдыя), 11-17 — 20.00 Клетка, 11-17 — 14.00 Для дзяцей: Залатыя рогі, 13 — 10.00, 14.00; 15 — 10.00; 16-17 — 12.00

КАМСАМОЛЕЦ *(Жылуновіча, 39, тэл. 454-194)* - Вулічны паляўнічы, 11-17 — 17.00, 20.30 Уварваньне ў таямніцу, 11-17 — 14.30, 19.00, 20.50 Прывіды ў замку Шпэсарт, 11-17 — 12.00, 16.00 Заля індыйкага фільму: Кароль без імя (2 с.) (прэм'ерны паказ), 11-17 — 14.00, 18.00 Відэапаказ: Крывавы спорт, 11-17 — 14.00, 16.00 Рэшка — жывы, арол — мёртвы, 11-17 — 18.00

Для дзяцей: Залатыя рогі, 11-12, 15-17 — 10.30 У сьвеце казак (кіналектар), 13 — 10.20, 10.30, 12.00, 13.00; 14 — 11.30 Чараўнік Смарагдавага гораду, 15-17 — 11.00

КАСТРЫЧНІК *(пр. Ф.Скарыны, 73, тэл. 329-325, 329-429)* - Двое: я і мой цень, 11-15 — 14.10, 17.40, 19.20; 16-17 — 14.10 (ільготны), 17.40, 19.20 У Сыэтле ня сьпяць, 11-17 — 15750, 21.00

КІЕЎ *(бульвар Шаўчэнкі, тэл. 373-270)* - Прафэсіянал, 12-15, 17 — 15.00; 16 — 15.00 (ільготны) Маладая лэдзі Чатэрлей-2, 12, 14 — 16.50, 18.20, 19.50; 13, 15-17 —16.50, 18.20 Відэапаказ, 11-17 — 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00 Для дзяцей: Амэрыканскі кікбаксэр-1, 12 — 13.30 Лятучы карабель (мультфільмы), 17 — 13.30

МАСКВА *(пр. Машэрава, 13, тэл. 231-448, 231-533)* - Глыбінная зорка, 11-15 — 16.40 Скала, 11-15 — 18.40, 21.00

МІР *(Казлова, 4а, тэл. 333-771)* - Сабакі пекла (новы стэрэаскапічны фільм, апошні экранны паказ), 11-14 —14.00, 16.00, 18.00, 20.00; 15 — 14.00, 16.00, 18.00, 19.30; 16-17 —12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 19.30 Схватка, 11-17 — 13.30, 18.10 Каханьне і магія, 11-14 — 16.30, 21.10; 15-17 — 16.30 Інфармацыйна-забаўляльная праграма, 15-17 — з 20.00 па 23.00

ПАРТЫЗАН *(Талбухіна, 18, тэл. 663-526)* - Апошні кінагерой, 11-13, 15-17 — 16.30, 20.30; 14 — 16.30 Жанчына ў полымі, 11-17 — 18.45 Для дзяцей: Сьвет жывой прыроды (кіналектар), 13 — 14.30

ПЕРАМОГА *(Інтэрнацыянальная, 20, тэл. 237-245)* - Прыдуркі ў Галівудзе, 11-17 — 15.00 Тутэйшыя, 11-17 — 17.00 Кінаклюб "Гімэнэй": Гудбай, Эмануэль, 11-17 — 19.00 Інфармацыйна-забаўляльная праграма, 13-17 — 21.00 Інфармацыйна-забаўляльная праграма для дзяцей і падлеткаў, 17 — з 16.00 па 18.00 Дэнс-шоў, 15-15 — з 24.00 па 6.00

ПІЯНЭР *(Энгельса, 20, тэл. 278-945)* - Залатая расколіна, 11 — 16.30; 12-13 — 13.00, 17.00; 14-15 — 13.20, 17.00; 16-17 — 14.00, 17.40 Праз каналізацыю, 12-13 — 15.00, 19.00; 14 — 19.00; 15 — 15.00; 16-17 —15.40 І карабель плыве (2 с.), 11 — 19.00 Для дзяцей: Фантастычная гісторыя, 11-13 — 10.00 Апэрацыя "Скрыпкавы футарал", 11 — 12.00; 12-13 — 11.30 Хлопчык зь вялкім чорным сабакам, 14 — 10.00, 15.00; 15 — 10.00 Месяц-44, 14-15 — 11.30; 16-17 — 12.00 Малы — але ўдалы (мультфільмы), 16-17 — 10.30

РАДЗІМА *(Лізы Чайкінай, 16, тэл. 426-779)* - Хто каго?, 11 — 14.30 (ільготны), 18.20; 13-17 — 14.30, 18.20 Кемлівыя дзяўчаткі, 11, 13-14 — 16.30, 20.20; 15-17 — 16.30 Музычна-забаўляльная відэапраграма, 11 — з 18.00 па 22.00; 17 — з 11.00 па 16.00 Музычна-забаўляльная праграма, 15-17 — з 20.00 па 24.00 Клюб знаёмстваў "Для тых, каму за 30", 14 — з 20.00 па 24.00 Відэа-дыска-шоў для падлеткаў, 13 — з 18.00 па 22.00 У кінатэатры пачынае працаваць кавярня "Малютка", 17 — з 11.00 па 16.00 Для дзяцей: Залаты ключык, 13-14 — 10.30; 16-17 — 13.00 У дапамогу настаўніку (кінаклюб), 13 — 12.00, 14.00 Падлетак (кінаклюб), 14 — 15.00

САЛЮТ *(пр. Ракасоўскага, 150а, тэл. 474-167)* - Махнаты сарцаед-2, 11-15 — 16.00, 19.00; 16-17 — 14.00, 17.00, 20.00 Сьмяротны танец, 11-15 — 17.30, 20.30; 16-17 — 15.30, 18.30, 21.30 Начны танцавальны рух, 15-16 — з 21.00 па 6.00 Для дзяцей: Начны экіпаж, 11-12 — 14.00 Гэта вам ня хлопчык (дакумэнтальны фільм), 13-14 — 14.00 Мараплаваньне Солнышкіна (мультзборнік), 13-14 — 14.10

СУЧАСЬНІК *(Харкаўская, 70а, тэл. 515-563)* - Хуткасьць, 11-12, 14-16 — 14.30 Сны пажадлівасьці, 11-17 — 16.30 Вар'яцкія ночы Клеапатры, 11-17 — 20.30 Для дзяцей: Кінаклюб "Падлетак і закон": Дзіцячая пляцоўка, 13 — 13.00 Маўглі, 13 — 14.30 Робат Джокс, 17 — 14.30

ЦЭНТРАЛЬНЫ *(пр. Ф.Скарыны, 13, тэл. 208-297)* - На халяву, 11-17 — 13.10, 16.20, 19.30 Паўночная сьпёка, 11-17 — 11.30, 14.40, 17.50, 21.00

ЭЛЕКТРОН *(Казінца, 117, тэл. 789-563)* - Нанятыя для забойства, 11-12, 14-17 — 12.30, 17.40; 13 — 17.40 Зрэдку яны вяртаюцца, 11-12, 14-17 — 14.10, 19.20; 13 — 19.20 Блакітны пярун, 11-17 — 15.50, 21.00 Табар сыходзіць у неба, 13 — 13.30 Для дзяцей: Белыя ваўкі, 16-17 — 11.00

ВІДЭАСАЛЁН: "Лавец Сонца" (Рэжысэр Майкл Чыміна, у галоўнай ролі Вудзі Харэльсан, крымінальны баявік 1996 г.) Сьмяротна хворы злачынца захоплівае ў закладнікі доктара. Пачынаецца неверагодная пагоня на Захадзе Злучаных Штатаў. Хто застанецца жывым, і ці так ужо глыбокая прорва паміж злодзеем і ахвярай?.. 11-14 — 11.00, 13.00, 15.00, 17.00

"У пошуках прыгодаў" (Рэжысэр Жан-Клёд Ван Дам, у галоўнай ролі — Жан Клёд Ван Дам, прыгодніцкі баявік 1996 г.) Крыс Дзюбуа, вулічны злачынца, накіроўваецца ў вандраваньне ў пошуках свайго мінулага і будучыні. Ягоная вандроўка скончаецца выпрабаваньнем на гонар і мужнасьць у старадаўніх спаборніцтвах "Ган-гэнг" — баях да апошняга канца. Хто ж стане пераможцам і возьме прыз — Залатога Дракона? 15-17 — 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00

Тэатры

11 лістапада — 17 лістапада

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТАР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

16 субота – М.Захаранка. Паехалі!.. Нябоская камэдыя ў 2-х дзеях паводле твораў М.Крапіўніцкага.

8 пятніца – Далецкія, М.Чарот. Ажаніцца – не журыцца. Беларускія вадэвілі ў 2-х частках.

11 панядзелак, 13 серада – В.Дунін-Марцінкевіч. Ідылія. Пастараль у 2-х актах.

14 чацьвер, 15 пятніца, 25 панядзелак – Прэм'ера. Ф.Дзюрэнмат. Ромул Вялікі. Гістарычна недакладная камэдыя ў 2-х дзеях.

17 серада – Р.Горын. Памінальная малітва. Камэдыя ў 2-х частках на матывы твораў Шолам-Алейхема.

ВОЛЬНАЯ СЦЭНА

12 аўторак – М.Адамчык, М.Клімковіч. Чорны квадрат. Кабарэ-дэтэктыў.

14 чацьвер – У.Рудаў. Брат мой Сымон. Драматычныя сны.

17 нядзеля, 23 субота – У.Шэкспір. Макбэт. Трагедыя. Прэм'ера.

ДЗЕ-Я

5, аўторак 19.00, 6, серада 19.00 "Імжа", Й.Кофта.

NEWS

РОК-ЗОРНЫЯ НАВІНЫ

- **Лаям Галахер** - малады чалавек, які дзякуючы заўсёдна капрызнаму выразу твара і эканомным рухам на сцэне, ужо даўно прасіўся на старонкі часопісаў мод, годна ацэнены. "Наш малыш", як называюць лідара гурта **OASIS** ня толькі ягоныя сябры, падпісаў кантракт на суму $75,000 з Вэрсачы на паказ восеньскай і зімовай мужчынскай вопраткі гэтага італьянскага мадэльера.

- Таксама вырашыла паспытаць сябе ў новай якасьці былая басгітарыстка гурта BELLY **Гэйл Грынвуд**. Яна знайшла новы гурт, які больш адпавядае яе "крутому прыкіду" і буйным паводзінам на сцэне. Зараз яна грае ў мэталічнай камандзе **"L7"**, дзе яна замяніла заснавальніцу гурта Джэніфэр Фінч. Чарговае турнэ **"L7"** пачне ўжо ў будучым годзе пасьля выхаду свайго трэцяга альбому.

- Здаецца, "культавы" гурт **STONE ROSES** можа хутка падвесьці рысу пад сваім існаваньнем. Адпаведнна інфармацыі ангельскага музычнага штотыднёвіка **"New Musical Express"**, басісту "Каменных ружаў" Мані было прапанавана перайсьці ў каманду **PRIMAL SCREAM**. Калі гэта адбудзецца, вакаліст Іян Браўн застанецца адзіным зь першага складу Stone Roses.

- **VELOCITY GIRL** таксама пакуе рэчы пасьля апошняга выступу 27 кастрычніка ў **Уэст Палм Біч**, Фларыда. Гэты гурт з Вашынтону выпусьціў тры альбомы і лічыўся адной з самых перспектыўных камандаў незалежнага року. Некалькі ўдзельнікаў "Хуткаснай дзяўчынкі", уключаючы вакалістку **Сару Шэнан**, плянуюць працягнуць у новым складзе, тады як гітарыст і аўтар песень Арчы Мур зоймецца ўласным праектам - **HEARTWORMS**.

- Майстра чорнай магіі і панкроку **Глен Данцыг** падпісаў кантракт з гуказапісальнай кампаніяй "Галівуд рэкардс", якая зьяўляецца падразьдзяленьнем карпарацыі "Уолт Дысней". Сама карпарацыя, якая ганарыцца вялікім сьпісам музыкі, якая выйшла зь ейных сьценаў, "музыкі для сямейных забаваў", не ў захапленьні ад гэтага выбару. Прынамсі прадстаўнік карпарацыі заявіў, што ён асабіста лічыць музыку Danzig "некалькі змрочнай". Тым ня менш новы альбом гурта пад назвай "Blackacidevil" выйшаў дакладна ў запланаваны тэрмін - 31 кастрычніка (Хэлоўін).

ВІДЭА

11 лістапада

НОВЫЯ ФІЛЬМЫ:

"УЦЁКІ З ЛОС-АНДЖЭЛЕСА"

ЗША, 1996, 101 хвіл, Маст/кам ацэнка: 3.0/4.5, Escape From L.A.; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў. Рэж. Джон Карпэнтэр, у р. Курт Расэл, Валерыя Галіно. Самы круты фантастычны баявік-сыквэл гэтага году зь вялікай колькасьцю спэцэфэктаў. Новае заданьне супэрваяр Пліскін па мянушцы "Зьмей" (актор Курт Расэл) атрымлівае ўжо ў 2013 годзе...

"ЛАВЕЦ СОНЦА"



ЗША, 1996, Маст/кам ацэнка: 3.5/3.5, The Sunchaser; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў. Рэж. Майкл Чыхвіла ("Паляўнічы на аленяў", "Гадзіны адчаю"), у р. Вудзі Харэльсан, Джон Сэда. Добра пастаўлены, але які не выклікае асаблівага захапленьня трылер-баявік-драма. Малады злачынца, які невылечна хворы бярэ ў закладнікі аднагодка — доктара з добрай практыкай...

"МАЛЕНЬКІЯ ЧАРАЎНІЦЫ"

ЗША, 1996, 88 хвіл, Маст/кам ацэнка: 2.5/3.5, Little Witches; узроставае абмежаваньне: ад 13 гадоў. Рэж. Джэйн Сымпсан, у р. Джэніфэр Рубін, Джэк Нэнс. Эратычны фільм жахаў. У царкве, якую рэстаўруюць, будаўнікі знайшлі таемны замураваны склеп, увесь набіты мерцьвякамі...

"ЛАСКАВА ЗАПРАШАЕМ У ЛЯЛЕЧНУЮ ХАТКУ"

ЗША, 1996, 85 хвіл, Маст/кам ацэнка: 4.5/2.5, Welcome To The Dollhouse; узроставае абмежаваньне: дзецям лепш глядзець сумесна з бацькамі. Рэж. Тод Солянд, у р. Хіцер Матараца, Дар'я Калініна. Жыцьцёвы фільм с элемэнтамі камэдыі і драмы. Школьнікі могуць паглядзець на сябе з боку і пабачыць свае праблемы на вялікім экране, а іхныя бацькі будуць у шоку, як даведаюцца, чым і як жыве дзіця па-за домам...

"БАЛВАНЫ"

1996, 92 хвіл, Маст/кам ацэнка: 3.0/3.5, Stupids; узроставае абмежаваньне: ад 13 гадоў. Рэж. Джон Лэндыс ("Паездка ў Амэрыку"), у р. Том Арнальд, Джэсыка Ландзі, Крыстафэр Лі. "Маскі-шоў" з-за акіяну. Самая "тупая" камэдыя году. Фільм распавядае пра адну незвычайную амэрыканскую сям'ю, дзе ўсе члены сям'і настолькі тупыя, што гэта робіць іх жыцьцё практычна бестурботнай, яскравай і радаснай...

"ЛЕТА НА РАНЧА КАЁТА"

1996, 91 хвіл, Маст/кам ацэнка: 3.0/3.0, Sliders; узроставае абмежаваньне: ад 13 гадоў. Рэж. Матыяс Альварас, у р. Ванэса Шоў, Сындзі Пікет. Прыгодная прыгодніцка-мэлядраматычная гісторыя пра вечныя каштоўнасьці і пра гарадзкую дзяўчыну, якая перабралася з шумнага сталічнага мэгаполіса на лета ў глухое і адасобленае ранча...

ФІЛЬМ-БЛІЦ:

"Рэнэгат" (Renegade; баявік-тэлесэрыял. У гал. р. Лярэнца Лямас);

"Ланцуговая рэакцыя" Chain Reaction; баявік. У гал. р. Кіну Рыўз.

На рынку зьявілася "лязэрная" копія фільма:

"Крывавы спорт-3" (BloodSport 3; баявік);

"Крымінальныя кронікі 1, 2, 3" (Perfect Crime; 300 хвіл, баявік. У р. Дэні Гловэр, Крыстафэр Лойд, Біл Пулмэн, Кіфэр Сазэрлэнд.)

***Фільмы прадастаўленыя студыяй "TON video" т. (017) 233-92-30*

Націскала на кнопкі пульта кіраваньня Тоня ВІДЗЯНКОВА

ПРЫСАДА ЗАЛАТОЙ АНТЫЛОПЫ:

Брэд Піт: Двойчы "сем" будзе дваццаць!

- Ходзяць чуткі, што **Брэд Піт,** здымаючыся ў новым фільме "Meet Joe Black", атрымае ганарар, які вагаецца паміж 15-20 млн. дал. Гэта даволі ладная сума для зоркі "Сем", калі ўлічыць, што ягоныя два папярэднія чэкі не перавышалі 10 млн. дал. "Meet Joe Back" — это рымэйк фільма Фрэдэрыка Марча "Death Takes A Holiday", зьнятага ў 1934 годзе.

"Лавец Сонца" супраць фізычных пакараньняў

- Вудзі Харэльсан лае брытанскага архіяпіскапа Кантэрбэрыйскага за выказваньне пра тое, што шлёпаць дзяцей зьяўляецца нармальным. Архіяпіскап Джордж Карэй, глава англіканскай царквы, заявіў на мінулым тыдні, што няма нічога няправільнага ў лёгкім шлёпку пры пакараньні дзяцей, калі "гэта робіцца стала з каханьнем і пры цьвёрдай дысцыпліне ўнутры сям'і". Такая заява прымусіла Харэльсана напісаць эмацыйны ліст у адну лёнданскую незалежную газэту. Актор напісаў: "Маёй старэйшай дачцэ каля 4-х гадоў і яна даволі крэпкая для шлёпаньня, але мне б хацелася ведаць, колькі часу мне давядзецца чакаць, перш чым я змагу пачаць шлёпаць сваё немаўля".

- Прыхільнікі фільма "Дарагая, я зьменшыў дзяцей" будуць радыя пачуць, што студыя "Дыснэй" распрацоўвае штотыднёвыя аднагадзінныя камэдыйна-прыгодніцкія сэрыі, заснаваныя на фільме. Стваральнік карціны **Джон Лэндзіс** (The Blues Brothers) выпрасіў грошы для вытворчасьці 22 сэрыяў, дэбют каторых адбудзецца ўвосень 1997 г. Ён сказаў, што фільм будзе працягнуты ў традыцыі такіх дыснэеўскіх фільмаў пра велікадушных "вар'яцкіх" навукоўцаў, як "Вар'яцкі прафэсар" (The Absent Minded Professor) і "Лахматы пёс" (The Shaggy Dog). Лэндзіс удакладніў, што дадзеная карціна будзе складацца з розных жанраў: часткова з прыгодніцкага баявіка, часткова з навуковай бэлетрыстыкі і фантастыкі.

- Магчыма, што праблемай "Воднага сьвету" **(Waterworld)** было тое, што дзеяньне адбывалася над вадой. MGM спасылаецца менавіта на гэта. Студыя пляную зьняць новы фільм з вялікім бюджэтам, дзе падзеі будуць адбывацца ўжо пад вадой. Адсюль і адпаведная назва — "Затоплены горад" (Submerged). Гісторыя апавядае пра будучае праз 20 гадоў, калі з-за магутнага землятрусу Лос-Анджэлес апынуўся на дне акіяну. Але жыхары Лос-Анджэлеса выжываюць у гэтым выпрабаваньні і спрабуюць прыстасавацца да новых умоваў жыцьця пад вадой. Большая частка здымак адбудзецца ў купалападобным падводным тэматычным парку, які ўзнаўляе некаторыя гістарычныя моманты горада да землятрусу.

- Прыхільнікі **Нікаласа Кэйджа** будуць задаволеныя, калі даведаюцца, што актор, валадар "Оскара", вырашыў праявіць сябе ў якасьці сцэнарыста. Сапраўды, ён ужо стаў пісаць. "У мяне было 70 старонак гатовага сцэнару, які зьяўляўся нейкім чынам аўтабіяграфічным, пра актора, які спрабуе ўцячы ад цёмных сілаў". Папярэджваючы непазьбежнае пытаньне пра цёмныя сілы, ён, пасьмейваючыся, кажа: "Так, гэта ня цалкам аўтабіяграфічная рэч, але галоўны герой зьяўляецца акторам. Я думаю, што лепш пісаць пра тое, што ведаеш". Гэта гучыць загадкава, але праект быў, што называецца, абрэчаны загадзя з-за некаторых сур'ёзных праблемаў з кампутарамі. Справа на тое, што Кэйдж па неасьцярожнасьці пракуліў і разьбіў яго, а копіяў ён ніколі не рабіў. Выпадак — больш чым часовая затрымка ў кар'еры Кэйджа як сцэнарыста: "Тэхніка стала палохаць мяне, — кажа ён.— Яна так спалохала мяне, што з гэтага моманту я не вярнуся да кампутара".

Зьбірала лісты Тоня ВІДЗЯНКОВА

САМАЕ СЬВЕЖАЕ ЗЬ ВІДЭАХІТОЎ
TON video
т. 233-92-30

КРОНІКА ДЭМАКРАТЫЧНАЙ АПАЗЫЦЫІ І ПАЛІТЫЧНЫХ РЭПРЭСІЯЎ У БЕЛАРУСІ (1953-88)

За храналягічныя рамкі пэрыяду ўзятыя даты, якія фіксуюць найважнейшыя вехі ў фармаваньні й разьвіцьці дэмакратычнай апазыцыі ў Беларусі. У другой палове 40-х гадоў XX ст. у нас яшчэ існавалі фармацыі ўзброенай антысавецкай апазыцыі (партызанка), а таксама няўзброеная палітычная апазыцыя (Саюз Беларускіх Патрыётаў, "Чайка" ды іншыя)... 1953 — год сьмерці Сталіна. Менавіта з гэтай датаю зьвязаныя спробы лібэралізацыі ў СССР. Зь лягераў пачалі вяртацца палітычныя вязьні, узьнікаюць апазыцыйныя асяродкі — мірная палітычная апазыцыя з акрэсьленымі нацыянальна-культурніцкімі патрабаваньнямі... Канец 1988 году адзначаны шэрагам публічных акцыяў апазыцыі, найважнейшая зь якіх — мітынг-рэквіем "Дзяды" і ягоны разгон, пасьля чаго дзейнасьць апазыцыі набыла адкрыты масавы характар і магла ўжо значна ўплываць на грамадзкія працэсы ў Беларусі. Чарговая веха — 1991 год, калі Беларусь стала незалежнаю. У 1994-м пачынаецца новы пэрыяд сучаснае гісторыі Беларусі: беларускае грамадзтва супрацьстаіць дыктатуры. Новае беларускае грамадзтва ў гэтым працэсе аб'яднала сілы старой апазыцыі, новых фармацыяў і трансфармаваных рэшткаў старога грамадзтва.

1953 — пачатак 1960-х — вяртаньне палітычных зьняволеных зь лягераў: Ларыса Геніюш (Зэльва), Язэп Сушынскі (Менск), Васіль Супрун (Слонім), Лявон і Юры Луцкевічы (Вільня), Цімох Вострыкаў (Гомель), былыя сябры Саюзу Беларускіх Патрыётаў ды інш. Пачатак стварэньня дысыдэнцкіх асяродкаў.

1953 — у бібліятэках Беларусі сканфіскавана 40.949 адзінак "палітычна шкоднай" літаратуры (Справаздача Галоўліта за 1953 г.).

1954, 28 ліпеня — пастанова ЦК КПБ "Аб стане і мерах паляпшэньня навукова-атэістычнай прапаганды ў рэспубліцы", узмацненьне ваяўнічага наступу супраць вернікаў і сьвятароў.

1956 — ЦК КПБ арганізуе разгром "нацыяналістычных поглядаў" М.Ларчанкі. Сыгналам стаўся артыкул Л.Абэцэдарскага і А.Сідарэнкі з абвінавачаньнямі М.Ларчанкі ў ідэйных памылках.

1957, лістапад — арыштаваны і асуджаны на 7 гадоў зьняволеньня па абвінавачаньні ў беларускім нацыяналізме выкладчык Гарадзенскага пэдінстытуту Браніслаў Ржэўскі.

1957, 14 сьнежня — у газэце "Літаратура і Мастацтва" надрукаваны артыкул Барыса Сачанкі "Шанаваць родную мову". Першы публічны выступ супраць русыфікацыі.

1957, люты — пастанова Савета Міністраў БССР "Аб удасканаленьні і частковай зьмене існуючага правапісу", далейшая русыфікацыя беларускай мовы.

1958, травень — у часопісе "Маладосьць" №5 апублікаваная аповесьць Аляксея Кулакоўскага "Дабрасельцы". У чэрвені на сумесным паседжаньні бюро ЦК ЛКСМБ і прэзыдыюму ўправы СП БССР аповесьць асудзілі як памылковы твор, які "паказвае калгасную вёску ў крывым люстры" (ЛіМ, 1958, 2 ліпеня). А.Кулакоўскі пазбаўлены працы на пасадзе галоўнага рэдактара часопіса "Маладосьць".

1959 — выступленьне ў Менску кіраўніка КПСС і савецкай дзяржавы М.Хрушчова з заклікам паскарэньня русыфікацыі. Закрыцьцё многіх пэрыядычных беларускіх выданьняў, зьмяншэньне тыражоў беларускіх кніжак, масавае закрыцьцё беларускіх школ, практычнае выцясьненьне беларускай мовы з усіх ВНУ.

пачатак 1960-х — складаецца "Акадэмічны асяродак" —апазыцыйныя групы ў Акадэміі навук БССР, якія ўтвараюцца паводле прынцыпу дыскусійных гурткоў.

1960-я — утварэньне студэнцкіх гурткоў у Беларускім Дзяржаўным Універсытэце (1962, 1968).

1963, 19 сакавіка — "Рэспубліканская нарада актыву творчай інтэлігенцыі", абвінавачаньні ў скажэньні партыйнай лініі пісьменьнікаў і літаратуразнаўцаў А.Кулакоўскага, І.Чыгрынава, В.Кваленкі, Н.Тарас.

1964, 19 чэрвеня — забіты Вітольд Дзіско — вясковы электрык і мастак-вальнадумца (Пастаўскі раён). Адкрыта выказваўся супраць камунізму, Сталіна, маляваў касьцёлы. Некалькі гадоў жыў пад прамым кантролем КГБ, зьмяшчаўся ў псыхушку. Забіты чатырма супрацоўнікамі КГБ.

сярэдзіна 60-х — спроба "Акадэмічнага асяродку" наладзіць пастаянныя сувязі з украінскім нацыянальна-вызваленчым рухам (М.Прашковіч).

1965, жнівень — пасьля апублікаваньня ў часопісе "Маладосьць" №7 аповесьці "Мёртвым не баліць" Васіль Быкаў па камандзе галоўных ідэолягаў КПСС М.Суслава і М.Зімяніна стаў аб'ектам афіцыйнае крытыкі, а рэдактар часопіса П.Панчанка неўзабаве звольнены з працы. Арганізуюцца калектыўныя лісты "незадаволеных" быкаўскім адлюстраваньнем вайны; правакатары б'юць вокны ў доме пісьменьніка ў Горадні. З востра дыскусіяй вакол В.Быкава зьвязаная актывізацыя "Акадэмічнага асяродку".

1966, люты — у газэце "Советская Белоруссия" (22 лютага) зьяўляецца артыкул В.Люкевіча і Я.Трашчонка, зь якога распачаліся нападкі на беларускіх літаратуразнаўцаў і гісторыкаў за "ідэалізацыю мінулага".

1967 — журналіст і гісторык Анатоль Сідарэвіч за крытыку Леніна і ленінізму звольнены з працы ў Ганцавіцкай раённай газэце.

1968 — пратэсты супраць савецкай акупацыі Чэхаславаччыны. Мікалай Якімовіч расклейвае ў Менску ўлёткі. Зьяўляюцца насьценныя надпісы "Праская вясна". Рэпрэсіі супраць удзельнікаў пратэстаў. Адкрыты выступ Міхася Кукабакі супраць акупацыі — у консульстве ЧССР у Кіеве. Пачатак рэпрэсіяў супраць М.Кукабакі. Пісьменьнік Фёдар Яфімаў публічна выступае супраць акупацыі Чэхаславаччыны, за што выключаецца з КПСС. Пазьней ён выступаў у абарону А.Салжаніцына і Л.Вакулоўскай.

1968, восень — пасьля допытаў супрацоўнікамі КГБ А.Сідарэвіч абвінавачваецца ў нацыяналізме, антысаветызме і "падтрымцы контрэвалюцыі ў замежных краінах" (за пратэсты супраць акупацыі Чэхаславаччыны) і заключаецца на чатыры месяцы ў псыханэўралягічнае аддзяленьне 2-й клінічнай бальніцы Менску.

1968, кастрычнік — актывізацыя незалежнага студэнцкага руху ў БДУ. Калектыўны пісьмовы зварот студэнтаў філфаку БДУ у ЦК КПБ з патрабаваньнем выкладаньня на беларускай мове. Зварот расцэнены як нацыяналістычны, а яго ініцыятараў Алеся Разанава і Віктара Яраца выключаюць з універсытэту.

2-я палова 60-х — фармаваньне адраджэнскага гуртка навуковай, творчай і студэнцкай моладзі "На Паддашку", які рэгулярна зьбіраўся ў майстэрні мастака Яўгена Куліка. Вяліся дыскусіі аб шляхах культурнага і палітычнага адраджэньня Беларусі, выпрацоўваліся спосабы дзейнасьці, зьбіраліся самвыдавецкія і забароненыя друкаваныя матэрыялы, ладзіліся краязнаўчыя экскурсіі, рыхтаваліся мастацкія выставы. "На Паддашку" — адзіная арганізацыйна пастаянная групоўка, якая з канца 60-х і да канца 80-х вяла мэтанакіраваную адраджэнскую працу. Сярод сяброў групоўкі: Я.Кулік, Л.Баразна, П.Драчоў, В.Ждановіч, муж і жонка Сьвентахоўскія, У.Крукоўскі, З.Пазьняк, М.Ткачоў, М.Чарняўскі, А.Марачкін, Г.Сакалоў-Кубай, З.Санько, Зьдзіслаў Сіцько, М.Купава і інш.

1970, красавік — М.Кукабака асуджаны на тры гады за "антысавецкую дзейнасьць", знаходзіўся на прымусовым псыхіятрычным "лячэньні". У 1976 вызвалены, некаторы час жыў у Маскве, потым у Бабруйску. Пісаў нарысы, артыкулы, якія распаўсюджваліся "самвыдатам", эмігранцкім друкам, замежным радыё. З 1978 зноў у зьняволеньні, вызвалены толькі ў 1988. У абарону вязьня выступалі амэрыканскі сэнатар Робэрт Доўл і эмігранцкі рух.

1971-74 — выданьне ў Наваполацку незалежнага рукапіснага літаратурнага часопіса "Блакітны ліхтар". Выдаўцы — В.Мудроў, В.Шлыкаў, А.Рыбікаў, А.Грабаў. Усяго выйшла 15 нумароў. КГБ выкрыла выданьне і спыніла яго выпуск. А.Грабаў забіты ў войску пры загадкавых абставінах.

1972, 15 жніўня — трагічна загінуў Лявон Баразна. Абставіны забойства дагэтуль нявысьветленыя, але шмат што паказвае на дачыненьне да яго КГБ. Л.Баразна — мастак, мастацтвазнаўца, адзін зь нефармальных лідэраў нацыянальна-адраджэнскага руху. У рознай ступені пад ягоным уплывам выхоўваліся такія дзеячы нацыянальнай культуры й палітыкі як З.Пазьняк, А.Марачкін, Я.Кулік, Ю.Хадыка ды шмат іншых. Непасрэдна перад сьмерцю рыхтаваў акцыі пратэсту беларускай інтэлігенцыі супраць разбурэньня Нямігі — гістарычнага раёну Менску.

лета 1973 — КГБ распачынае акцыі супраць "Акадэмічнага асяродку"; у верасьні рашэньнем П.Машэрава кампанія часова спыненая.

1974-76 — на гістарычным факультэце БДУ друкуецца самвыдатаўскі часопіс "Мілавіца" (асноўныя выдаўцы У.Арлоў, Г.Кулажанка, І.Чарняўскі). Выйшла 7 нумароў. Пад ціскам КГБ і камсамольска-палітычных органаў выданьне спыненае.

пачатак 1974 — прыезд у Беларусь прадстаўнікоў ЦК КПСС з санкцыяй на рэпрэсіі. "Справа пяцёх" — разгром органамі КГБ "Акадэмічнага асяродку". Справа атрымала сваю назву ад колькасьці "галоўных арганізатараў" у тым сцэнары, які стварыў КГБ. Пазбаўленыя працы супрацоўнікі Акадэміі Алесь Каўрус, Сьцяпан Міско, Мікола Прашковіч, Міхась Чарняўскі і супрацоўнік выдавецтва БелСЭ Валянцін Рабкевіч. Таксама звольнены з працы па абвінавачаньні ў нацыяналізме супрацоўнік Інстытуту геалёгіі Лапуць.

сярэдзіна 70-х — зьяўленьне ананімнай паэмы "Сказ пра Лысую гару".

1975-76 — заснаваньне і выданьне падпольнага публіцыстычнага пэрыёдыка "Тутарка: аб усім, што баліць" (машынапіс). Усяго выйшла 38 нумароў.

1975 — пасьмяротная выстава Л.Баразны — першая спроба апазыцыйных колаў наладзіць публічную мастацкую выставу. Мастакі-арганізатары імпрэзы (Я.Кулік, М.Купава, А.Марачкін і інш.) стануць ініцыятарамі стварэньня суполкі "Пагоня" (1991). Мастакі выклікаліся ў спэцслужбы на допыты.

1975 — пазбаўлены працы ў Акадэміі навук З.Пазьняк.

1975 — звольнены з працы старэйшы навуковы супрацоўнік акадэмічнага Інстытуту літаратуры Вячаслаў Зайцаў па абвінавачаньні ў распаўсюджваньні антысавецкіх і ідэалістычных поглядаў.

1976, 1 студзеня — звольнены з працы, а перад гэтым выключаны з КПСС журналіст і паэт Сяргей Панізьнік "за связь с националистическими деятелями, пропаганду их в печати и потерю классовой бдительности".

1977 — "Ліст да расейскага сябра" ("Письмо русскому другу") — зварот да расейскае інтэлігенцыі Алеся Каўкі (беларускага літаратуразнаўцы й публіцыста, які жыве ў Маскве). У лісьце аўтар даказвае права беларусаў на самавызначэньне, на ўласны шлях у гісторыі і на сваю мову. Ліст распаўсюджваўся ананімна на тэрыторыі СССР. У 1979 выдадзены як дакумэнт беларускага "самвыдату" ў Лёндане (Letter to a Russian Friend: A "samizdat" publication from Soviet Byelorussia), атрымаў шырокі розгалас, зачытваўся беларускай і ўкраінскай рэдакцыямі радыё "Свабода", зьмяшчаўся і цытаваўся ў эмігранцкім беларускім, расейскім, польскім друку.

1978 — паэт і лекар Алесь Наўроцкі выступае з публічнымі пратэстамі супраць прымяненьня псыхіятрыі ў палітычных мэтах, у знак пратэсту выходзіць з Саюзу пісьменьнікаў БССР. У 1981 падвяргаецца прымусоваму псыхіятрычнаму лячэньню, а перад гэтым звольнены з працы.

1978 — за публічныя выступы з крытыкай камуністычнага рэжыму амаль на 4 гады асуджаны да зьняволеньня В.Зайцаў.

1978, лета — нарыс М.Кукабакі "Скрадзеная Бацькаўшчына" (пра русыфікацыю Беларусі) трапляе на "Нямецкую хвалю", дзе і зачытваецца (друкуецца ў часопісе "Время и Мы", 1986, №3, Мюнхэн). М.Кукабаку зноў арыштоўваюць.

1979-80 — выданьне падпольнага пэрыёдыка "Люстрадзён" (Беларуская талеранцыйная грамада).

1979-82 — загадчык катэдры Менскага мэдінстытуту праф. У.Мірончык піша і распаўсюджвае "Сустрэчныя заклікі да ЦК КПСС", у якіх выступае супраць вайны ў Аўганістане, за дэмакратызацыю палітычнага жыцьця, супраць закрыцьця беларускіх школ. У.Мірончык выключаецца з КПСС, звальняецца з працы і зьмяшчаецца ў псыхіятрычную лякарню.

1979, 25 сьнежня — міліцыя разганяе ў цэнтры Менску Калядную працэсію, якую наладзілі студэнты БДУ і БДТМІ — будучыя заснавальнікі БСДМайстроўні.

з канца 70-х — у Ракуцёўшчыне пад Маладзечнам, у мясьціне, зьвязанай з жыцьцём М.Багдановіча, распачынаюцца штогадовыя рэгулярныя зборы адраджэнцаў Беларусі. Зборы ператвараюцца ў патрыятычныя маніфэстацыі з выкарыстаньнем забароненай нацыянальнай сымболікі.

канец 70-х — 80-я — праз "самвыдат" распаўсюджваюцца гістарычныя працы Міколы Ермаловіча, забароненыя да афіцыйнага друку з-за палітычных меркаваньняў.

пачатак 80-х — у Наваполацку арганізаванае самвыдавецкае памнажэньне і распаўсюджваньне забароненай патрыятычнай літаратуры, у тым ліку непадцэнзурных твораў Л.Геніюш (У.Арлоў, В.Мудроў).

пачатак 80-х — Сяргей Сокалаў-Воюш распачынае публічныя выступы з праграмамі ўласных песень сацыяльна-патрыятычнага зьместу. Выступам актыўна супрацьдзейнічаюць камсамол і КГБ. Некаторыя сустрэчы з моладзьдзю па розных прычынах наўмысна зрываюцца (напрыклад, 25 кастрычніка 1985 у Політэхнічным інстытуце).

пачатак 80-х — узьнікае "Філязофскі асяродак" — незалежны студэнцкі рух на філязофскім аддзяленьні БДУ. Арганізатары — студэнты В.Ламака, В.Залатар, І.Воіцкая, А.Малашчук, Л.Сьвярдлоў.

1980, студзень — у Менску створаная Беларуская Сьпеўна-Драматычная Майстроўня — дэмакратычнае аб'яднаньне моладзі.

1980 — "Тысячагодзьдзе Беларусі". Адзначалася неафіцыйна ў колах нацыянальнай інтэлігенцыі. Дата палягае на першых летапісных зьвестках пра Полацкага князя Рагвалода ды Тураўскага князя Тура, датаваных 980 г. Прапанаваў яе як пачатак беларускае дзяржаўнае гісторыі М.Ермаловіч. Мастакі Я.Кулік, М.Купава, У.Крукоўскі рыхтуюць юбілейныя паштоўкі і плякат, якія распаўсюджваюцца "самвыдатам", мастачка Васюк стварыла юбілейны мэдаль. Паштоўкі былі перавыдадзеныя ў Лёндане, атрымалі розгалас, і гісторыка-культурніцкая імпрэза набыла сэнс палітычнай вызвольнай акцыі. Справа расьсьледавалася КГБ.

1981, красавік — ліст студэнтаў-філёзафаў за акадэмічныя свабоды. Пад лістом падпісалася 80% студэнтаў аддзяленьня філязофіі. Быў расцэнены кіраўніцтвам факультэту як "бунт філёзафаў". Заведзеная справа ў КГБ. Справа курыравалася непасрэдна ЦК КПБ. Вымушаныя былі сысьці з універсытэту А.Малашчук, І.Воіцкая, В.Залатар. А.Малашчук пасьля беспасьпяховых спробаў аднавіцца ва ўнівэрсытэце публічна скончыў жыцьцё самагубствам: вясной 1985 (паводле іншых зьвестак — 25.07.1984) выкінуўся з вакна 6 паверху галоўнага корпусу БДУ.

1981 — сьвяткаваньне ўгодкаў І.Луцкевіча. Кансьпіратыўны сход у майстэрні мастака А.Маркаўца, на якім упершыню сабраліся разам прадстаўнікі розных дэмакратычных асяродкаў і вызначылі агульную стратэгію. Групоўка "На Паддашку" арганізуе мастацкую выставу, прысьвечаную І.Луцкевічу. Пазьней адбыліся выставы памяці І.Луцкевіча, В.Ластоўскага, М.Багдановіча, Цёткі. Выставы ладзіліся як патрыятычныя акцыі.

1983, вясна — пратэсты грамадзкасьці Менску супраць разбурэньня Дома Ваньковіча.

1[illegible] вясна — пачатак патрыятычных акцый ушанаваньня памяці паўстанцаў 1863 г., талокі моладзі Менску і Маладзечна, узьвядзеньне помніка на магіле паўстанцаў у в. Плябань Маладзечанскага р-ну.

1983, 17 сакавіка — у Купалаўскім парку ў Менску ладзіцца "Гуканьне вясны". З гэтага часу сьвяткаваньне робіцца штогадовым і масавым, што дае магчымасьць сабраць разам патрыятычна настроеных людзей.

1983, красавік — праз сродкі "чорнай прапаганды" і палітасьветныя камсамольска-камуністычныя структуры актыўна распаўсюджваюцца чуткі пра існаваньне ў Беларусі разгалінаванай арганізацыі беларускіх нацыяналістаў.

1983 — за спробу надрукаваць у альманаху "Спадчына" забароненую п'есу Я.Купалы "Тутэйшыя" нясуць адміністрацыйныя пакараньні дырэктар выдавецтва "Мастацкая літаратура" М.Дубянецкі, галоўны рэдактар С.Андраюк, загадчык рэдакцыі В.Палтаран. Набор альманаху рассыпаецца.

1983, 10 красавіка — у Зэльве адбываецца пахаваньне паэткі і дзеяча нацыянальна-вызваленчага руху Ларысы Геніюш. Удзельнічаюць прадстаўнікі патрыятычных колаў зь Менску, Горадні, Наваполацку, Баранавічаў ды іншых гарадоў, колішнія палітзьняволеныя, удзельнікі ўзброенага супраціву камуністычнай акупацыі. Савецкія ўлады і КГБ спрабуюць перашкодзіць нармальнай хадзе рытуалу пахаваньня.

1983, травень — у Менску на сьценах і агароджах зьяўляюцца намаляваныя выявы "Пагоні" і лёзунгі патрыятычнага зьместу.

зь лета 1983 — моладзь пачынае масава сьвяткаваць Купальле.

1984 — на базе БСДМайстроўні створанае Таварыства Беларускай Мовы, якое праводзіць шырокі збор заяваў бацькоў з патрабаваньнем беларускае школы. Акцыя спыненая КГБ.

1984, 13 чэрвеня — акцыя БСДМайстроўні ля будынку Менскага гарадзкога тэатру XIX ст. пад лёзунгам "Руйнуецца помнік гісторыі". Першы несанкцыяваны мітынг у Менску. Удзельнікі (В.Вячорка, І.Сташчанюк і інш.) затрыманыя міліцыяй.

1984, 13 чэрвеня — позна ўвечары невядомыя асобы расьпісалі патрыятычнымі лёзунгамі будынкі Савецкага райкаму камсамолу і КГБ у Менску. Сярод лёзунгаў: "Хай жыве Беларусь!"

1984, чэрвень — БСДМайстроўні забаранілі сьвяткаваць у Менску Купальле.

1984, восень — у Менску, Горадні, Маладзечне і іншых гарадах Беларусі ладзяцца патрыятычныя вечарыны памяці У.Караткевіча.

1985 — у Лёндане выходзіць кніга Алега Бембеля "Родная мова і маральна-эстэтычны прагрэс", якой папярэднічае акцыя аўтара па шырокім апытаньні людзей пра становішча беларускай мовы, што на гэты час зьяўляецца закрытаю тэмай.

1985, чэрвень-ліпень — Купальле каля Мікалаеўшчыны пад Стоўбцамі, наладжанае БСДМайстроўняй. Афіцэры КГБ зь Менску праводзяць аблаву і затрыманьне большасьці ўдзельнікаў. Допыты праводзяцца ў памяшканьні РАУС у Стоўбцах. С.Сокалаў-Воюш аштрафаваны і звольнены з працы, а яго сям'я выкінутая з кватэры.

1985, 14 жніўня — у Крэўскім замку і на Янавай гары пад Крэвам інтэлігенцыя зь Менску, Маладзечна, Горадні адзначае 600-я ўгодкі Крэўскай уніі.

1985, кастрычнік — на будынку Менскай мастацкай вучэльні імя Глебава два навучэнцы Уладзімер Макееў і Міхал Мірошнікаў вывесілі нацыянальныя беларускія сьцягі, сарваўшы сьцягі СССР. На працягу месяца КГБ вяло сьледзтва, падчас якога былі заведзеныя справы на 6 чалавек. У.Макееў вымушаны спыніць вучобу.

1985, лістапад-сьнежань — першыя зборы "Талакі" (Менск) —дэмакратычнага аб'яднаньня моладзі.

1986, красавік — у сувязі з публікацыяй у Лёндане кнігі А.Бембеля "Родная мова і маральна-эстэтычны прагрэс" распачынаюцца перасьледы ў Інстытуце філязофіі і права АН БССР; кіраўніцтва Інстытуту атрымлівае спагнаньні, А.Бембель праз тры ме-

Праца выканана ў рамках праекту "Адна зямля — Усходняя Эўропа". © Архіў Найноўшай Гісторыі, 1996.



Сярэдзіна 1980-х. Візыт у Вільню да Зоські Верас.
Здымак Алеся Крыштаповіча.

сяцы пазбаўлены працы. Уладзімер Конан вымушаны сысьці з пасады загадчыка Сэктару эстэтыкі і сацыяльнай псыхалёгіі, а сам Сэктар расфармоўваецца.

1986, 12 сакавіка — заснаваньне ў Горадні клюбу "Паходня" —нацыянал-дэмакратычнага й асьветніцкага асяродку.

1986 — у Віцебску ствараецца нефармальная патрыятычна-асьветніцкая арганізацыя "Узгор'е".

1986, 20 траўня — Гуканьне вясны, фальклёрнае сьвята на Траецкім прадмесьці ў Менску, якое ладзілі навучэнцы Школы-інтэрнату імя Ахрэмчыка пры ўдзеле навучэнцаў Мастацкай вучэльні. На моладзь напалі вэтэраны аўганскай вайны, нацкаваныя камсамолам.

1986, 29 траўня — заснаваньне клюбу перакладчыкаў "Бабілён". Клюб стаў незалежным асяродкам, дзе абмяркоўваліся надзённыя гуманітарныя праблемы Беларусі.

1986, жнівень — заснаваньне "Талакі" ў Гомелі, нацыянал-дэмакратычнага й асьветніцкага асяродку.

1986, сьнежань — заснаваньне "Тутэйшых" — незалежнага аб'яднаньня маладых літаратараў.

1987 — у Менску надрукаваны падпольны часопіс "Бурачок". Увесь тыраж другога нумару арыштаваны КГБ.

1987, травень — у Друі адбыўся заплыў беларускіх і латыскіх маладзёжных суполак — акцыя супраць будаўніцтва Дзьвінскай ГЭС.

1987, лістапад — адзначэньне Дзядоў у Купалаўскім парку ў Менску. Упершыню сярод такой шырокай аўдыторыі заяўлена пра генацыд з боку таталітарнага рэжыму.

1987, сьнежань — І Вальны Сойм Канфэдэрацыі Беларускіх Суполак у Палачанцы пад Ракавам.

1988, 3 чэрвеня — у "ЛіМе" апублікаваны артыкул З.Пазьняка і Я.Шмыгалёва "Курапаты — дарога сьмерці". Афіцыёзныя сродкі масавае інфармацыі актыўна пярэчаць праўдзе пра рэпрэсіі. Пачатак ушанаваньня ў Беларусі мясьцінаў расстрэлу палітвязьняў.

1988, 4 ліпеня — у Вільні створаны клюб "Сябрына". Гэта дала магчымасьць праводзіць незалежныя акцыі беларускай грамадзкасьці ў Вільні.

1988, 19 кастрычніка — у Менску ўтвораныя Беларускае грамадзкае гісторыка-асьветнае таварыства памяці ахвяраў сталінізму "Мартыралёг Беларусі" і аргкамітэт Беларускага Народнага Фронту. Групы падтрымкі БНФ узнікаюць па ўсёй краіне.

1988, 30 кастрычніка — Менск. Шматтысячны мітынг-рэквіем памяці продкаў "Дзяды" разагнаны атрадамі міліцыі і ўнутраных войскаў, узброеных дубінкамі, сьлезацечным газам і вадамётнай тэхнікай.

1988, лістапад — зьяўленьне першага нумару "Студэнцкай думкі" — друкаванага органу сьпярша суполкі "Сьвітанак", пазьней Згуртаваньня Беларускіх Студэнтаў і Задзіночаньня Беларускіх Студэнтаў.

1988, восень — 1989 — будынак Інстытуту гісторыі АН БССР, дзе працуюць актыўныя ўдзельнікі "Мартыралёгу Беларусі" і БНФ, бярэцца пад міліцэйскую ахову. Міліцыянты неаднаразова ўрываюцца ў кабінэты супрацоўнікаў, робяць спробы ператрусу асабістых рэчаў.

канец 80-х — утварэньне ў Менску клюбу камуністаў-рэфарматараў "Современник" (кіраўнік Л.Крывіцкі).

канец 80-х — утварэньне "Альтэрнатывы", маладзёжнага клюбу сацыял-дэмакратычнага кірунку.

Пасьля восеньскіх Дзядоў 1988 году і разгону мітынгу грамадзкія працэсы ў Беларусі актывізаваліся, што праявілася ў зьмене колькасных паказчыкаў дынамікі грамадзкіх зьяваў і колькасьці саміх зьяваў. Акцыі беларускай апазыцыі рабіліся публічнымі, рэальна ўплывалі на сытуацыю ў краіне. Вынікі гэтых працэсаў — зараджэньне незалежнага ад дзяржавы публічнага беларускага грамадзтва й здабыцьцё Беларусяй незалежнасьці ў 1991 годзе.

Сярод падзеяў у пэрыяд з 1989 да канца 1991 варта назваць II Вальны Сойм Канфэдэрацыі Беларускіх Суполак у Вільні (1989, 14-15 студзеня), які арганізацыйна аформіў беларускі дэмакратычна-незалежніцкі маладзёжны рух; першы легальны мітынг у лютым 1989; стварэньне незалежнага прафсаюзнага руху (Свабодныя прафсаюзы); "Чарнобыльскі шлях" 1989; мітынг у лютым 1990; утварэньне Беларускага дэмакратычнага блёку ў 1990; Дзень Волі-90; утварэньне Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады (2-3 сакавіка 1991); страйкі ў красавіку 1991; супраціў пучу ў жніўні 1991. Гэты пэрыяд адзначаны зьяўленьнем сталых незалежных выданьняў, найбольш значныя зь іх — "Навіны Беларускага Народнага Фронту", "Свабода", "Наша Ніва".

Гэта быў ужо якасна новы пэрыяд у гісторыі дэмакратычнага руху Беларусі.

У стварэньні Кронікі бралі ўдзел: Вацлаў Арэшка, Ігар Бабкоў, Міхал Баразна, Алег Дзярновіч, Сяргей Дубавец, Сяргей Харэўскі, Міхась Чарняўскі.

Кніга — пошта

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць кнігі:

1. Адам Глёбус. Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы. – Менск: Сучасная літаратура, 1995. – 310 с. 39.000 БРБ
2. Адам Глёбус. Скрыжаваньне. – Менск: БАДППР – "Ковчег", 1993. – 46 с. 7.000 БРБ
3. Юліяна Вітан-Дубейкаўская. Мае ўспаміны. – Вільня, 1994. – 192 с. 24.000 БРБ
4. Вацлаў Лесьмян. Пан Блішчынскі / Пераклад з польскай. – Вільня-Менск: "Наша Ніва" – "Мастацкая Літаратура", 1994. – 93 с. 10.000 БРБ
5. Вітаўт Кіпель. Беларусы ў ЗША. – Менск, 1993. – 362 с. 25.000 БРБ
6. Брэтон Ф., Пру С. Выбух камунікацыі. – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 336 с. 24.000 БРБ
7. Говард Майкал. Сучасная культурная антрапалёгія. – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1996. – 486 с. 35.000 БРБ
8. Лоўэ Дж. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі. – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 328 с. 24.000 БРБ
9. Энтані Сьміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі. – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1995. – 272 с. 20.000 БРБ
10. Джын Эйчысан. Гаваркія істоты: Уводзіны ў псыхалінгвістыку. – Менск: БФС – "Кліч", 1995. – 312 с. 20.000 БРБ
11. Браян М. Фэйган. Уводзіны ў археалёгію. – Менск: БФС, 1996. – 272 с. 24.000 БРБ
12. Беларускі рок-н-рол: Тэксты ("Бонда", "Крама", "Мроя", "Новае Неба", "Уліс"). – Менск: "Ковчег", 1994. – 64 с. 7.000 БРБ
13. Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст. Камплект каляровых паштовак (12 асобнікаў). – Менск: НВФ "Vaukalaka", 1996. 25.000 БРБ
14. Беларускі гістарычны агляд. 1996, т. 3, сшытак 1. 35.000 БРБ
15. Ш.Дабаш, Ж.-М.Пант'е. Уводзіны ў палітыку. – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1996. – 624 с. 40.000 БРБ
16. М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1765-1794). – Менск, 1994. – 168 с., каляровыя іл. 20.000 БРБ
17. Z.Fedecki. Цёплыя вечары... ды халодныя ранкі, czyli co śpiewano w Feliksowie. – Warszawa, 1992. – 160 с. 20.000 БРБ
18. Юрг Штайнэр. Эўрапейскія дэмакраты. — Менск: БФС — "Лекцыя", 1996. — 343 с. 45.000 БРБ.
19. Джон Бэрдшоў. Эканоміка. Ч. 1: Мікраэканоміка / Дапаможнік для студэнтаў. — Менск: БФС — "Тэхналёгія", 1996. — 560 с. 50.000 БРБ.
20. Ўэстан Ла Бар. Асабістасьць з псыхааналітычнага пункту гледжаньня. — Менск: "Тэхналёгія", 1995. — 47 с. 15.000 БРБ.
21. Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры). №1, 1996. 35.000 БРБ.
22. Жана Эрш. Філязофскае здумленьне: Гісторыя заходняе філязофіі. — Менск: Эўрафорум-БФК, 1996.– 400 с. 35.000 БРБ.

Зьвяртайцеся на адрас: Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89. У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.

ПЕРШЫ ЛІТОЎСКІ СТАТУТ



"Мы, Жигимонт, з ласки Божьи король польский и великий князь литовский, руский, пруский... и иных, маючи собе достаточное розмышленье, умыслом добрым и з ласки нашое господарское, хотячи обдаровати правы хрестьянскими, всим прелатом..., вельможам, рыцерем повышоным, шляхте и всему поспольству и их подданым а тубыльцом земль Великого князьства нашого Литовского, которого бы кольвек стадла а стану были, все их правы и привилья: костельные, так латынского закону, яко и грецеского, тэж и светцкие..., справедливе слушные, справные... хочем так мети моцне, якобы в тые листы наши слово от слово были вписаны... потвержаем и вмоцняем, сказуючи их мети моц вечными часы".

(З прадмовы да Першага Статуту 1529 г.)

Беларускі Гуманітарны Фонд "Наша Ніва" распачынае новы праект, мэта якога — забясьпечыць беларускіх навукоўцаў і аматараў тэкстам Першага Літоўскага Статуту 1529 г., які стаў прававою базаю для наступных выдатных кадыфікацыйных помнікаў Айчыны нашых продкаў — Статутаў 1566 і 1588 г.

У XX ст. Першы Статут выдаваўся толькі ў 1960 г. у Менску (зусім мізэрным накладам) і ў 1991 г. у Вільні. Віленскае выданьне самае поўнае й акадэмічнае — паралельна са старабеларускім тэкстам ідуць старапольскі (пераклад зроблены ў 1532 г.) і лацінскі (1530 г.). У канцы выданьня знаходзіцца чатырохмоўны слоўнік тэрмінаў са Статуту. Тэксты сканцэнтраваныя ў томе N3 віленскага акадэмічнага выданьня, якое наш Фонд мае намер завезьці ў Беларусь.

*Даведкі й замовы праз тэл. **239-78-49**; зьвяртацца да **Андрэя Андрыеўскага.***

НОВЫ БЕЛАРУСКІ КНІЖНЫ ПРАЕКТ

Беларускі Гуманітарны Фонд "Наша Ніва" наладзіў распаўсюджаньне найноўшых беларускіх выданьняў у галіне гуманістыкі, а таксама мастацкае літаратуры. Наша мэта — зрабіць новую беларускую кнігу жывым фактарам сучаснае культуры.

Сыстэма "Новага беларускага кніжнага праекту" дзейнічае ў гарадах:

БЕРАСЬЦЕ

Кнігі Браяна М. Фэйгана "Ўводзіны ў археалёгію", Энтані Сьміта "Нацыяналізм у XX ст.", Ш.Дэбаша й Ж.-М.Пант'е "Ўводзіны ў палітыку" можна набыць у кнігарнях "СЬВІТАНАК" (бульвар Касманаўтаў, 120) і "АСЬВЕТА" (вул. Маскоўская, 57). У "Сьвітанку" таксама прадаецца камплект каляровых паштовак "Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст."

ГОМЕЛЬ

У памяшканьні Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі (пл. Перамогі, 2) пры Аддзеле інфармацыйных тэхналёгіяў (тэл. 55-71-97) адкрыты кніжны аддзел. Гэта адзіная кропка ў 500-тысячным горадзе, дзе можна набыць такі асартымэнт сучасных беларускіх кніг — мастацкую літаратуру, дасьледаваньні ў галіне гуманістыкі, найноўшыя пераклады. Апроч кніжак тут таксама можна прыдбаць самыя апошнія запісы беларускае музыкі.

ГОРАДНЯ

Продаж кніжнай прадукцыі адбываецца ў шапіку "ВАСІЛЁК" (насупраць Універсытэту).

МАЛАДЗЕЧНА

Кнігі можна набыць у шапіку ТБМ (на чыгуначным вакзале).Па даведкі можна зьвяртацца праз тэл. 6-71-70 да Алеся.

МЕНСК

Кніга Браяна М. Фэйгана "Ўводзіны ў археалёгію" прадаецца ў кнігарнях "Сьветач", "Акадэмкніга", "Кнігарня пісьменьніка", "Паліткніга". Кнігі Адама Глёбуса "Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы" й "Дамавікамэрон" прадаюцца ў крамах "Сьветач" і "Кнігарня пісьменьніка", у шапіку ў фае Нацыянальнай бібліятэкі.

СЬВЕТЛАГОРСК

Кнігі можна набыць у філіі БГАКЦ, Зялёная вул., дом 10, паверх 2. Тэл. (8-02342) 2-71-77.

КАСЭТЫ — пошта

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт — 25.000 БРБ):

1. **НОВАЕ НЕБА.** Сон у трамваі.
2. **НОВАЕ НЕБА.** Go home (1995).
3. **НОВАЕ НЕБА.** Дзеці чорнага гораду (1991).
4. **КРАМА.** Камэндант (1995).
5. **КРАМА.** Хворы на Rock-n-Roll.
6. **КРАМА.** Гэй там налівай! (1994).
7. **N.R.M.** LaLaLaLa (1995).
8. **ULIS.** Life (1996).
9. **УЛІС.** Чужаніца (1991).
10. **УЛІС.** Краіна доўгай белай хмары (1990).
11. **БОНДА.** Найлепшыя песьні.
12. **МЯСЦОВЫ ЧАС.** Наша ўскраіна (1991).
13. **ПАЛАЦ.** Палац (1996).
14. **Песьні беларускіх бардаў** (1992).
15. **РЭНЭСАНС** (беларускі джаз).
16. **БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ.**
17. **БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА** (1-3)
18. **БЕЛАРУСКАЯ ГІТАРНАЯ МУЗЫКА.**
19. **ЗАЛАТЫ ФОНД БЕЛАРУСКАГА РОК-Н-РОЛУ** (1-3).

Т.1: Бонда. Уліс. Мроя. Рэй. Мясцовы Час. Блізьняты.
Т.2: Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае Неба. Мясцовы Час. Тутэйшыя хлопцы.
Т.3: Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & "Доктор Моро". Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо.
Т.4: Палац. Уліс. Крама. Новае Неба. Мроя.
Т.5: Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Red Dynamite. Флэт.

20. **МРОЯ.** Найлепшыя песьні з праграмаў 1987-90 г.
21. **УЛІС.** Блуканьне (1996).
22. **ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ.** Смутны беларускі блюз (1996).
23. **КАМЭЛОТ.** У краіне талераў (1995).
24. **ZINDAN** (1994).
25. **КРАМА.** The Best (1996).

Зьвяртайцеся на адрас: 220094 Менск, а/с 89, Андрыеўскаму Андрэю Паўлавічу. У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.

НОВЫЯ КНІП, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Законьнікаў С. Вячэра пад райскім дрэвам: Падарожныя нарысы, дзёньнікі. — Менск: Мастацкая літаратура, 1996. — 301 с. 1500 ас. ISBN 985-02-0130-4

Михневич О. Теоретико-педагогические основы формирования национального самосознания будущих учителей / Гуманитарно-экономический негосударственный институт Республики Беларусь. — Менск: НТООО "Тетрасистемс", 1996. —261 с. 20 000 ас. ISBN 985-6317-08-8

Сакун А. Заложнікі: Нарысы, артыкулы, старонкі дзёньніка / Прадмова М.Мятліцкага. — Менск: Мастацкая літаратура, 1996. — 175 с. 1500 ас. ISBN 985-02-0191-6.

Charytoniuk, Grazyna. Literatura bialoruska w Polsce. Bibliografia przekladów za lata 1945-1994. — Białystok, 1996. (Biblioteczka Bialoruskiego Stawarzyszenia literackiego "Bialowieza") 135 с. ISBN 83-85918-06-X

Ядевич Н., Гавриленко В., Изотко В. Комментарий законодательства о труде Республики Беларусь. Ч.7. Трудовая книжка. Нормативно-правовые акты. Организация делопроизводства на предприятии. — Менск: "Право и экономика", "Вилат", 1996. — 100 с. (Юридический справочник). 1500 ас. ISBN 985-6194-40-7

НАВІНКА!

Кніжная прадукцыя Беларускага Гуманітарнага Фонду "Наша Ніва" пачала распаўсюджвацца на Кніжным клюбе ў Менску. Клюб працуе ў суботы з 5-й раніцы да 12-й у памяшканьні Палаца культуры Трактарнага заводу (вул. Казлова 50, ст. мэтро "Трактарны завод").

Гутарка зь дзецьмі

ТЭСТ

У клопатах будзённага жыцьця мы вельмі часта не пасьпяваем пагутарыць адзін з адным пра выхаваньне нашых дзяцей. Нават калі выпадае вольная часінка — не заўсёды пачынаем размову без нагоды, бяз пэўнай прычыны. Гэты тэст дапаможа Вам ліквідаваць перашкоды на шляху да размовы.

бацькі	Думка	маці
	Трэба гутарыць зь дзецьмі і не дапускаць крытыкі рашэньняў бацькоў.	
	Зь дзецьмі трэба гутарыць пра ўсё, яны маюць права крытыкаваць бацькоў.	
	Самастойнасьць дзяцей дапушчальная ў строгіх межах.	
	Дзецям трэба даць свабоду выбару і дапамагаць парадамі.	
	Дзецям неабходна ўдзельнічаць у праблемных сямейных гутарках, нават калі яны датычацца толькі бацькоў.	
	Дзеці не павінны ведаць рознагалосьяў бацькоў.	

У табліцы закрэсьліваем клеткі ў адпаведнай графе (бацькі ці маці) насупраць пазыцыяў, зь якімі Вы ня згодныя, і наадварот, клеткі насупраць прымальных пазыцыяў застаюцца пустымі... Цяпер Вы бачыце, у чым вы згодныя, а ў чым — не. Застаецца цяпер толькі высьветліць — чаму.

Калі жадаеце даведацца, якім мэтадам выхаваньня аддаюць перавагу дзеці, то прапануйце ім запоўніць табліцу. Атрымаеце цікавую тэму для размовы.

ІНСТРУКТАР

МІЖНАРОДНЫ ПАКТ аб грамадзянскіх і палітычных правах; Як разглядаецца скарга на сваю дзяржаву

30 гадоў існуе Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, прыняты ў ААН 16 сьнежня 1966 года. Наша краіна далучылася да яго 12 лістапада 1973 года. Адначасова існуе і Факультатыўны пратакол да гэтага Пакту, падпісаны Беларусяй толькі ў 1992 годзе.

Гэты найважнейшы міжнародны дакумэнт мае своеасаблівую цікавасьць, сэнс якой у тым, што ўзьнікае магчымасьць кожнаму жыхару Беларусі асабіста зьвярнуцца ў ААН са скаргай аб парушэньні правоў чалавека. Каб не завальваць непатрэбнымі лістамі МЗС і не чакаць дарэмна дапамогі з такой магутнай на першы погляд арганізацыі як ААН, неабходна добра ведаць працэдуру зварота і непасрэдна дакумэнты.

Палажэньні Пакта і пратакола маюць абавязковую юрыдычную сілу для ўсіх дзяржаваў, што яго ратыфікавалі — прызнаныя правы зьяўляюцца законам, які павінны выконваць усе, у тым ліку і прэзыдэнты.

Пакт пачынаецца з заявы аб тым, што народы маюць права на самавызначэньне і свабодна выкарыстоўваць свае прыродныя багацьці і рэсурсы (дарэчы толькі гэтае права адсутнічае ва Ўсеагульнай дэклярацыі правоў чалавека).

Усе людзі прызнаюцца роўнымі перад законам. Кожны чалавек мае права на свабоду і асабістую недатыкальнасьць. Ніхто ня можа быць падвергнуты адвольнаму арышту ці ўтрыманьню пад вартай. Утрыманьне пад вартай асобаў, якія чакаюць судовага разбору, не павінна быць агульным правілам, але вызваленьне можа мець залежнасьць ад прадстаўленьня гарантыяў яўкі ў суд і, у выпадках неабходнасьці, для выкананьня прысуду. Той, хто стаўся ахвярай незаконнага арышту альбо ўтрыманьня пад вартай, мае права на кампэнсацыю, якая валодае зыскавай сілай. Абавязкова павінен быць справядлівы і публічны разбор справы кампэтэнтным, незалежным і неперадузятым судом.

Абвінавачаны ў крымінальным злачынстве павінен мець дастаткова часу і магчымасьцяў для падрыхтоўкі і абраньня сваёй абароны і стасункаў зь ёй, карыстацца бясплатнай дапамогай перакладчыка і быць асуджаным безь неапраўданай затрымкі. Адвакат прызначаецца ў любым выпадку і бясплатна, калі няма дастатковых сродкаў для аплаты.

Прызнаецца права свабодна выказваць свае меркаваньні, якое ўключае свабоду шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць усялякую інфармацыю і ідэі, незалежна ад дзяржаўных межаў, вусна, пісьмова альбо пры дапамозе друку ці мастацкіх формаў перадачы, альбо іншым спосабам на ўласны выбар. Забараняецца прапаганда вайны і нацыянальнай, расавай ці рэлігійнай нянавісьці. Прызнаецца права на мірныя сходы і свабоду асацыяцыяў, удзел у вядзеньні дзяржаўных справаў і выбарах, дапушчацца на агульных умовах да дзяржаўнай службы ў сваёй краіне.

Дэкляруецца прынцып роўнасьці абавязкаў мужа і жонкі; права кожнага дзіцяці без усялякай дыскрымінацыі на неабходныя меры абароны з боку сям'і і дзяржавы; права набыць грамадзянства.

І нарэшце, неабходнасьць абароны этнічных, рэлігійных і моўных меншасьцяў.

Згодна з Пактам заснаваны спэцыяльны орган — Камітэт па правах чалавека, які складаецца з 18 выбраных экспэртаў. Ён праводзіць штогадова тры паседжаньні.

Факультатыўны пратакол апісвае ўсю працэдуру звароту.

Галоўная задача Камітэта — прымаць паведамленьні ад асобаў, якія сьцьвярджаюць, што яны зьяўляюцца ахвярамі парушэньняў якіх-небудзь правоў, выкладзеных у Пакце.

Калі ахвяра, як думаецца, ня мае магчымасьці накіраваць паведамленьне, Камтэт можа разглядаць паведамленьне іншай асобы, якая прыводзіць доказы свайго права дзейнічаць ад імя ахвяры. Ня можа гэтага рабіць трэцяя асоба, ня маючы ніякіх яскрава выяўленых сваяцкіх сувязяў з ахвярай. Камітэт мае права разглядаць паведамленьне асобы толькі пасьля таго, як вычарпаныя ўсе існуючыя сродкі прававой абароны, гэта значыць пасьля разгляду справы нацыянальным судом альбо кампэтэнтнымі адміністрацыйнымі ўладамі. Правіла вычэрпваньня мае сілу толькі ў той ступені, у якой гэтыя сродкі прававой абароны зьяўляюцца эфэктыўнымі і даступнымі. Дзяржаве-удзельніку неабходна прадставіць падрабязную інфармацыю аб сродках, якія, на яго думку, мае аўтар заявы ў абставінах яго справы, а таксама доказы таго, што існуюць падставы меркаваць, што такія сродкі будуць эфэктыўнымі. Гэта правіла ня дзейнічае ў тых выпадках, калі прымяненьне сродкаў абароны неапраўдана зацягваецца.

Прызнаюцца непрымальнымі ананімныя паведамленьні ці тыя, што на думку Камітэту, уяўляюць сабой злоўжываньне правам альбо несумяшчальныя з палажэньнямі Пакта.

І канешне, дзяржава, на якую пададзеная скарга, павінна быць удзельнікам Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах і падпісаць Факультатыўны пратакол да яго.

Камітэт ня будзе разглядаць ніякіх паведамленьняў, пакуль ня ўпэўніцца, што гэтае пытаньне не закранаецца іншымі працэдурамі міжнароднага разбору.

Паведамленьні разглядаюцца на закрытых паседжаньнях і абавязкова даводзяцца да ведама дзяржавы. Лісты і іншыя дакумэнты Камітэту маюць канфідэнцыяльны характар. Заслухаўшы разгляд скаргі падаўца і адказ дзяржавы, ён можа выказаць свой погляд адносна таго ці былі парушаныя правы. Гэтыя меркаваньні ўключаюцца ў штогадовы адкрыты даклад на Генэральнай Асамблеі. Апублікоўваюцца таксама ўсе меркаваньні, рашэньні, што абвяшчаюць паведамленьні непрымальнымі. Разгляд скаргаў грамадзянаў зь Беларусі ў гэтых дакладах мы не адшукаем.

Рашэньні прымаюцца на аснове кансэнсуса, але асобныя члены Камітэту могуць выказваць асабістыя меркаваньні ў дадатак да асноўнага вызначэньня.

Дзяржава, якая атрымала паведамленьне, на працягу 6 месяцаў дае тлумачэньні, заявы і меры, якія былі ці будуць прыняты. Яна накіроўвае адказ, і асоба, што зьяўляецца аўтарам скаргі, атрымлівае зь яго копію. Калі паведамленьне адсылаецца назад з мэтай атрымаць больш падрабязную інфармацыю, а потым прызнаецца непрымальным, то гэтай дзяржаве нічога не адпраўляецца. Камітэт можа вынесьці вуснае рашэньне аб спыненьні разгляду скаргі, напрыклад, калі аўтар адклікае яе ці дае зразумець, што не жадае працягваць разбор.

Для прыняцьця рашэньня аб тым, ці зьяўляецца паведамленьне прымальным, патрабуецца ад 6 месяцаў да аднаго году, а меркаваньне Камітэту можа быць прадстаўленае праз год-два. Увесь працэс разгляду скаргі звычайна займае два-тры гады. Камітэт абавязаны разглядаць усю пісьмовую інфармацыю, якая была прадстаўленая зацікаўленымі бакамі. Кожны бок мае магчымасьць выказваць заўвагі адносна аргумэнтаў другога.

На працягу часу разгляду скаргі, асобе можа спатрэбіцца абарона. Часам Камітэт вымушаны паведамляць дзяржавам аб сваім папярэднім рашэньні. Напрыклад, у адным выпадку — ахвяра, "што мае намер знайсьці прытулак у краіне X, не павінна высылацца ці суправаджацца ў краіну Y", у другім — просьба да ўраду неадкладна прыняць меры па ахове здароўя з запытам копіі мэдычнага заключэньня. Акрамя таго, прымаліся рашэньні з патрабаваньнем не выконваць сьмяротны прысуд, пакуль працягваецца разгляд паведамленьня.

У шэрагу выпадкаў, што закранаюць правы на жыцьцё, прымяненьне пытак і кепскіх адносінаў, а таксама незаконных аршытаў і зьнікненьняў, цяжар доказу не павінен ляжаць толькі на той асобе, якая падае скаргу.

Пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах дапушчае абмежаваньне або прыпыненьне дзяржавай ажыцьцяўленьня некаторых правоў у выпадках афіцыяльнай аб'явы надзвычайнага становішча, пры якім знаходзіцца пад пагрозай існаваньне нацыі.

Ніякім чынам не абмяжоўваюцца: права на жыцьцё, свабода ад пытак, рабства ці падняволенага стану, абарона ад патрапленьня за краты з-за нявыплаты запазычанасьці, крымінальныя законы, што маюць зваротную сілу, свабода думкі, сумленьня і рэлігіі. Паведамленьні, што прадастаўляюцца з мэтай разгляду іх у адпаведнасьці з палажэньнямі Факультатыўнага пратаколу трэба накіроўваць на адрэсу:

Human Rights Commitee
c/o Centre for Human Rights
United Nations Office at Geneva
1211 Geneva 10, Switzerland

Дзяржавы-удзельнікі маюць абавязак пэрыядычна рабіць даклады пра выкананьне правоў чалавека на сваёй тэрыторыі, пра прыняты меры, дасягненьні і цяжкасьці. Камітэт абмяркоўвае іх з адпаведнай дзяржавай і суправаджае заўвагамі агульнага характару. Усе парады маюць толькі характар рэкамэндацыяў.

У 1993 годзе на 47 сэсіі Генэральнай Асамблеі Камітэт па правах чалавека разглядаў даклад Рэспублікі Беларусь. У яго заключных заўвагах былі вызначаныя галоўныя прычыны для неспакою. Па-першае, гэта — свабода перамяшчэньня. Праблемы тут зьвязаныя, у прыватнасьці, з падставамі для выдачы пашпартоў і становішчам з выязнымі візамі, а асабліва прадстаўленьня іх асобам, якім даверaная дзяржаўная тайна. Камітэт занепакоены тым, што захоўваецца ўнутраная сыстэма выдачы дазволу на жыхарства (сыстэма прапіскі); захоўваньнем сьмяротнага пакараньня за многія злачынствы (хаця практыка прымяненьня абмежаваная). Нічым нельга апраўдаць і клясыфікацыю асобаў, што вызнаюць тую ці іншую рэлігію, напрыклад, юдаізм, як асобаў асаблівай нацыянальнасьці. Многія пытаньні, якія не рэгулююцца новым заканадаўствам, залежаць ад добрай волі ўладаў, аднак усё яшчэ існуе небясьпека таго, што на яе будуць узьдзейнічаць стэрэатыпы, атрыманыя ў спадчыну зь мінулага,—лічыў тады Камітэт.

Акрамя названага, асоба ці група асобаў, якія лічаць, што яны маюць перашкоды ў ажыцьцяўленьні правоў чалавека, могуць зьвярнуцца са скаргай у ААН, нават калі іх выпадак не прадугледжаны дамовай ААН. Такімі пытаньнямі займаецца Камісія па правах чалавека ў адлаведнасьці з працэдурай, вядомай як працэдура "1503". Копія скаргі накіроўваецца адпаведнаму ўраду, які можа прадставіць свае тлумачэньні. Калі па скаргах відаць тэндэнцыю парушэньня правоў, што мае сыстэматычны, сур'ёзны і доказны характар, то прымаецца рашэньне аб правядзеньні дасканалага вывучэньня стану справаў ці вызначаецца спэцыяльны камітэт альбо дакладчык для вывучэньня пытаньня.

Працэдура на аснове Факультатыўнага пратаколу да Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах прадстаўляе сабой адносна новую зьяву ў гісторыі міжнароднага права. Да таго, як быў ратыфікаваны Статут ААН, немагчыма было ўявіць, каб асобны грамадзянін мог падаць скаргу на ўрад ці дзяржаву.

У 1991 годзе ўвайшоў у сілу і другі Факультатыўны пратакол, які прадугледжвае адмену сьмяротнага пакараньня.

Іна Паскаль

31 кастрычніка 1996 года



У ПАПЯРЭДНІХ НУМАРАХ (№1 - 23):

Кошты на менскіх рынках: Камароўка (ІНФ. №1, 7, 10, 21); Рэчавы рынак "Дынама" (ІНФ. №2, 8); Аўтарынак (ІНФ. №3, 12); Кошты на кампакт-дыскі (ІНФ. №4); Кошты на кватэры ў Менску. Кошты на офісы (ІНФ. №5, 17); Кошты на будаўнічыя матэрыялы (ІНФ. №6); Кошты на камп'ютары. Менск (ІНФ. №9); Кошты на філязофска-гуманітарную літаратуру (ІНФ. №18); Кошты на кватэры ў Менску (ІНФ.№24); Кошты на турыстычныя падарожжы ў Менску (ІНФ.№26). Кошты на запасныя часткі для аўто (ІНФ.№27); Кошты на авія і чыгуначныя квіткі (ІНФ.№28).

Транспарт: Расклад руху пасажырскіх цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФ. №1,15); Расклад руху прыгарадных цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФ. №2, 12); Расклад руху аўтобусаў ад а/с Менск-Цэнтральны і Менск-Усходні (ІНФ. №3, 16, 17); Расклад рэйсаў пасажырскіх самалётаў і ўсё пра аўтазапраўныя станцыі (ІНФ. №5).

Адукацыя: Замежнае навучаньне ў 1996 годзе (ІНФ. №1); Платнае навучаньне ў Менску. Камэрцыйныя ВНУ (ІНФ. №2); Дзяржаўныя ВНУ. Платнае навучаньне (ІНФ. №3-4); ВНУ. Акадэміі (ІНФ. №8-10).

Біржа працы: Аналіз стану рынку працы паводле зьвестак Менскага гарадзкога цэнтру занятасьці насельніцтва (ІНФ. №1- 9); Новыя вакансіі і працоўныя месцы на Беларусі (ІНФ. №1-28).

Адпачынак: Вучымся гуляць у прэфэранс (ІНФ. № 1-15); Вучымся гуляць у'більярд (ІНФ. № 16-24); Тэсты, шахматныя і інтэлектуальныя задачы (ІНФ. №1- 29).

Спажывец: Тэлефонныя коды гарадоў Беларусі, краіноў блізкага і далёкага замежжа (ІНФ. №2); Твае правы, пасажыр (ІНФ. №2); Як купляць і прадаваць кватэру. Што азначае спэцыяльнае маркаваньне (ІНФ. №3); Месяцовы пасяўны каляндар (ІНФ. №4); Як вызначыць якасьць мясных і рыбных прадуктоў (ІНФ. №5); Пра новыя даляры. Праўда пра цыгарэты. Штрыхавы код — як яго расшыфраваць (ІНФ. №6); Як выбіраць абутак (ІНФ. №7); Міжнародная сыстэма гатэляў (ІНФ. №10); Каб выраслa рэпа вялікая... (ІНФ. №11); Як набыць аўтамабіль у Нямеччыне (ІНФ. №18 Заканчэньне); Вучымся эканомна кіраваць аўтамабілем (ІНФ. № 12, 15, 17); Зрабі сам (ІНФ. № 16); Сонынік (ІНФ. № 15, 17, 18 Заканчэньне); Спажывецкі тэст — прасы (ІНФ. № 20); Спажывецкі тэст — тэлевізары (ІНФ. № 21); Кошты на аўто ў Польшчы (ІНФ. № 21, 22); Гумкі (ІНФ. № 23); "Time Share": Як пазьбегнуць непрыемнасьцяў (ІНФ. № 23). Інвэстыцыйныя фонды: некалькі парадоў дробнаму ўкладальніку (ІНФ. № 23); Пырскі шампанскага (ІНФ. № 23); Рыбныя прадукты (ІНФ. №24); Гарэлка: Чаго баяцца? (ІНФ. №24); Каб кватэра была цёплай (ІНФ.№26); Фарбуем вопратку і тканіну (ІНФ.№26); Калі я памяняю батарэйкі (ІНФ.№27). Спажывецкі тэст — кухонныя камбайны (ІНФ.№28).

Інструктар: Друкарня ў кожнай кватэры; За родную школу; Збіраемся ў падарожжа (ІНФ. № 19); Апэрацыя "ВАГІ" (ІНФ. №24).

Здароўе: Перш чым зьвярнуцца да лекара. Як кінуць паліць (ІНФ. №4); Прыродныя атруты (ІНФ. №10); Атлетычныя клюбы, шэйпінг, аэробіка, тэнісныя корты (ІНФ. №18); Комплексная ацэнка забруджаньня асяродзьдзя Менску і воблясьці (ІНФ. № 19); Тэст: асьпірын (ІНФ. № 22); Небясьпечныя пекі (ІНФ. № 22); Пра шкоду пасіўнага паленьня (ІНФ. № 22); Без дыэты не абысьціся (ІНФ. № 23); Перш чым купіць цацку, панюхайце! (ІНФ. № 23).

Гаспадарка: Газ у нашым доме. Як чытаць цэтлікі на вопратцы. (ІНФ. №5); ЖЭС. Рамонт жытла. Пункты прыёму замоваў на будаўніча-рамонтныя працы (ІНФ. №6); Як мыць і чысьціць посуд. Калі заліло кватэру... (ІНФ. №8); Як пабудаваць садовы домік. Дом і дзялянка (ІНФ. №9).

Прэс-рэліз. Сьвет за тыдзень (ІНФ.№28).

Грамафон: Старонка вершаванага радка (ІНФ. №6, 8, 11, 17, 19, 20, 24, 25, 26).

Харчаваньне: Якую гарбату мы п'ем. Пра часнык (ІНФ. №7); Бары, рэстарацыі, кавярні Менску (ІНФ. №15).

Спорт: Вынікі спаборніцтваў і інш. (ІНФ. №7, 9, 19).

Бібліятэка: Новыя паступленьні ў кнігарні. Рэцэнзіі (ІНФ. №9, 10, 11, 15, 16, 18-27).

За мяжою: Хто такія ньюёрцы; Ліставаньне з навучальнымі ўстановамі ЗША (ІНФ. №17).

Беларусь і сьвет: Індэйцы ў Беларусі (ІНФ. № 21).

Адвакат: Ахова правоў чалавека. Міжнародная Амністыя (ІНФ. №17).

Псыхалёгія: Сцэнар чалавечага жыцьця пішацца яшчэ ў дзяцінстве (ІНФ. №24); Калі Ён купаецца, усе павінны залезьці ў ваду і плясканца (ІНФ. №24).

Чалавек: Пра цяжкае жыцьцё і лёгкую сьмерць; Дзённік без канца. Г.Матусевіч. Тэст: самая простая памяць (ІНФ. №27)

ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫХ НУМАРАХ:

Рынак: Новыя кошты на розныя тавары.

Грамафон: Новыя вершы нашых чытачоў.

Януш Тазьбір

Партрэты ў плямах

ГІСТОРЫЯ ЗА КРАТАМІ СУБ'ЕКТЫЎНАСЬЦІ

Калі да драпежніка, чалавека ці нейкага гораду прылепіц ца які стэрэатып (асабліва нэгатыўны), не дапамогуць ніякія высілкі, каб абвергнуць яго. Усе намаганьні будуць марныя. Так пускае свае карані чорная легенда.

Вельмі цяжка разьвеяць чорную легенду. Яе характарызуе моцная стабільнасьць, здатнасьць замацоўвацца на доўгі час. Усялякі погляд, што абапіраецца на эмацыйны падыход, не прымае ніякіх рацыянальных аргумэнтаў. Асабліва замінае гэтая «легендарнасьць» спробам дакапацца да гістарычнай праўды і аб'ектыўнасьці пры асьвятленьні падзеяў далёкай мінуўшчыны. Тоўстая коўдра стагодзьдзяў і народная пагалоска робяць гэтыя спробы амаль безвыніковымі.

Польскія гісторыкі, напрыклад, цягам двухсот гадоў змагаюцца (наогул безь вялікага посьпеху) з тэзай, што Рэч Паспалітая ў 1795 годзе зьнікла з палітычнай мапы Эўропы выключна з уласнае віны. Карабель Рэчы Паспалітай мусіў патануць, бо ў прадоньне цягнуў яго баляст анархіі, рэлігійнага фанатызму і неталерантнасьці, шляхоцкай цямноты і прыгнёту сялянства ў маштабах, якія не сустракаліся ў іншых краінах Эўропы.

Чорныя легенды стваралі й самі палякі. Ужо ў Рэчы Паспалітай перад яе падзеламі замацаваўся погляд, што каралі Жыгімонт Стары, Ян Казімер, а пасьля іх Ян III Сабескі былі бязвольнымі марыянэткамі ў руках сваіх чужаземных жонак. У вачах шляхты абразай было ня толькі ўмяшаньне жонак у палітыку — сфэру, што належыць

Жыгімонт Стары.

выключна мужчынам. І ня толькі чужое (італьянскае ці французскае) паходжаньне, што рэзала вочы ў пару расквітаньня ксэнафобіі. Найважнейшы дакор палягаў на іншым: чужынскія жонкі заахвочвалі сваіх каралеўскіх мужоў да абсалютызму, а гэта азначала ліквідацыю шляхоцкіх прывілеяў.

Дасьледнікі доўга думалі, чаму многія польскія разнаверцы шанавалі Найсьвяцейшую Дзеву Марыю, хоць іхныя веравызнаньні (асабліва кальвінскае й арыянскае) строга гэта забаранялі. Рэч у тым, што папулярнасьць Дзевы Марыі, як ні дзіўна, была наступкам чорнай легенды, якая атачала чужаземных валадарак, што сядзелі пад бокам польскіх манархаў. Казаньнікі й прарокі эпохі барока ў адзін голас падкрэсьлівалі, што Маці Божая — прыхільніца, а значыць, і абароньніца шляхоцкіх вольнасьцяў. З моманту каранацыі на Каралеву Польскай Кароны (1656 г.) яна ўвайшла ў мэтафізычную структуру Рэчы Паспалітай і стала яе нябеснаю патронкай. Словам, гарантавала палітычны парадак, які абапіраецца на прынцыпы залатой вольнасьці. Прыкладна так, як гарантавалі яго вольная выбарнасьць, liberum veto ці права выказваньня непаслушэнства манарху, калі той парушыць прысягу, якую ён даў шляхце перад увахо-джаньнем на пасад.

Ці труціла Бона Барбару Радзівіл?

Чорная легенда ня ведала межаў у маляваньні партрэту сваёй ахвяры. Не клапаціліся нават аб праўдападобнасьці выгляду, калі вінавацілі Бону ў сэксуальнай разбэшчанасьці і атруціцельстве. Ахвярай Боны пала ненавісная ёй нявестка Барбара Радзівіл. У гэтым мог пераканаць, напрыклад, папулярны перад вайной фільм Юзафа Лейтаса. «Барбара Радзівіл» дэманстравалася ў 1936-39 гадах ня толькі ў Польшчы, але й за мяжой, «прадстаўляючы клясычную казку пра гнюсную сьвякруху, якая атручвае маладую і прыгожую нявестку».

Жыгімонт Аўгуст

Мастацкай літаратуры падала руку гістарыяграфія. Погляды на тэму Боны Сфорцы часоў Контарэфармацыі няшмат чым адрозьніваліся ад поглядаў эпохі Асьветніцтва. Ня зьменшылася ні хцівасьць каралевы, ні ўзьвелічэньне суайчыньнікаў.

Бона прывезла з «Італіі невядомыя на польскай зямлі вычварэнствы, яна падбадзёрвала злых і подлых людзей», — грымеў у 1767 годзе ксёндз Тэадор Вага ў сваёй «Гісторыі польскіх князёў і каралёў», якая ў XIX ст. двойчы перавыдавалася. Падобнай думкі прытрымліваўся біскуп Ігнацы Красіцкі, які кляймiў хітрую і прагавітую італійку за вываз з Польшчы незьлічоных скарбаў. У меру таго, як расла белая легенда Барбары Радзівіл, усё больш чарнеў партрэт ейнай перасьледніцы. Жанар казкі дапускае толькі гэтыя два колеры. Жалезныя рамкі чорнай легенды не дазваляюць заўважыць якіх-небудзь станоўчых рысаў у сваіх ахвярах. У пару падзелаў Рэчы Паспалітай гісторыкам удалося ачысьціць Бону толькі ад вінавачаньня ў тручэньні.

У міжваенным дваццацігодзьдзі на дапамогу няшчаснай каралеве (якая пасьля вяртаньня ў Італію сама стала ахвярай атручэньня) пасьпяшаўся Ўладзіслаў Пацеха. Ён пісаў у «Польскім біяграфічным слоўніку» (1936), што Бона ў выніку габсбурскай прапаганды, якая распускала плёткі пра яе віну ў тручэньні, «стала сымбалем зла, якое губіць Польшчу». У незавершанай манаграфіі пра Бону ён намагаўся, часам у забаўнай форме, прыбраць зь яе партрэту нават дробныя плямкі. Аднак у грамадзкай сьвядомасьці чорная легенда Боны Сфорцы па-ранейшаму бярэ верх над несумненнымі яе заслугамі перад Польшчай.

Трэба адзначыць, што даўнейшы фільм Лейтаса глядзіцца цікавей за нядаўні нудны сэрыял пра Бону. Хаця апошнюю экранізацыю можна прызнаць гістарычна справядлівай.

Бона Сфорца

Людвіка Марыя — «прыгожая гарпія»

Чорная легенда, нібы казачны цмок, мусіць жывіцца ўсё новымі ахвярамі. У XVII ст. такою ахвярай стала францужанка Людвіка Марыя, якая атрымала гэтае імя толькі пасьля шлюбу з Уладзіславам IV Вазам. Яе сужэнства зь Янам Казімерам лічылася кровазьмяшэньнем: яна была ўдавой брата караля. Гэтае вінавачаньне выкарыстоўвала найцнатлівейшая частка польскай гістарыяграфіі XIX ст.

Пакуль Людвіка Марыя не мяшалася ў вялікую палітыку, яе не чапалі. Але калі яна ўзяла чынны ўдзел у барацьбе за рэформу ладу Рэчы Паспалітай, «зухаватую францужанку» прызналі небясьпечнай інтрыганткай, якая чхаць хацела на шляхоцкія вольнасьці. Асабліва абурэньне выклікалі пляны замены liberum veto на прыманьне пастановаў большасьцю галасоў. Не падабаліся таксама намеры ліквідаваць вольную элекцыю і выбіраць новага валадара яшчэ за жыцьця папярэдніка. Папулярнасьць каралевы спала на нуль. Нават праз трыста гадоў ня ўсе эпітэты, якімі яе тады «ўзнагароджвалі», прыдатныя для друку. «Пякельная гарпія» ці «мэгера» належаць да наймякчэйшых. Галоўная яе «загана» перад Польшчай была ў тым, што яна падтрымлівала абсалютысцкія тэндэнцыі, што супярэчыць польскім традыцыям і «духу нацыі». Калі ў траўні 1667 году яна памерла, пісалі, што гэты месяц «прынёс каралеве сьмерць, а каралеўству — здароўе».

Польскі гісторык Ян Хрызостам Пасак, якога цяжка назваць прыхільнікам каралевы, сьцьвярджае, што яе дастойны муж ня вельмі блізка да сэрца прыняў яе хваробу, а потым і сьмерць. Калі яму паведамілі, «што Яе Вялікасьць каралева вельмі кепска пачуваецца», Ян Казімер, вясёлы нападпітку, адказаў: «Нічога ёй ня будзе». Калі зноў яму данесьлі, што Людвіка Марыя канае, ён выцяў пакаёвага служку па шчацэ, кажучы: «Не кажы мне плётак, калі я вясёлы». Цяжка ў гэта паверыць.

Уладыслаў Ваза

Нелюбоў да Людвікі Марыі перанесьлі таксама й на яе суайчыньнікаў. Грамадзтва агарнула хваля галяфобіі.

Гісторыкі мінулага стагодзьдзя былі пераканаными, што Пасак фантазіюе, калі, напрыклад, апавядае пра страляніну з лукаў па французскіх акторах, якія ў 1664 годзе выступалі ў Варшаве. Такі факт настолькі моцна абражаў нацыянальную годнасьць чытачоў, што ў некаторых выданьнях гэтая сцэна ўвогуле апушчаная: не маглі ж палякі быць такімі барбарамі! Толькі даволі нядаўна знойдзеныя архіўныя матэрыялы, якія сьведчаць, што Пасак ня прыдумаў памянёнага здарэньня. Але ён суправадзіў яго пышным камэнтаром: «Пры Людвіцы Марыі французы мелі перавагу ў Польшчы, ім было дазволена ўсё, чаго толькі надумаюць». Паводле меркаваньня Яна Хрызостама, вінаватымі былі не гледачы, што страляліз лукаў, а акторы, якія адважыліся выйсьці на сцэну.

Апошні кароль: здраднік? выдатны асьветнік?

У залежнасьць ад чорнай легенды патрапілі таксама й валадары. Сьпіс найгоршых манархаў уключае, несумненна, Жыгімонта III Вазу, у меншай ступені — абодвух Сасаў: Аўгуста II і Аўгуста III Вэтынаў. Шляхта доўга захоўвала іх ва ўдзячнай памяці, не зважаючы на крытычныя меркаваньні людзей эпохі Асьветніцтва. Першае ж месца ў гэтым сьпісе займае Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, у якім бачаць галоўнага далакопа Рэчы Паспалітай.

У момант страты незалежнасьці Станіслаў Аўгуст меў ужо створаную чорную легенду. Яго вінавацілі ў бязбожнасьці і талерантнасьці да пратэстантаў, у прыхільнасьці да Расейскай імпэратрыцы, ад якой ён стала браў хабары, у распусьце і ў баязьлівасьці, і нават у падбухторваньні сялянаў супраць шляхты. Ад Барскай канфэдэрацыі да часоў Таргавіцкай канфэдэрацыі і паўстаньня Касьцюшкі не прыпыняюцца атакі на апошняга караля Рэчы Паспалітай.

Позьнія вінавачвальнікі называлі яго «бязвольнай марыянэткай» Расеі і проста «нікчэмным» чалавекам. Польскі рамантызм не знайшоў ніводнага апраўданьня для караля, які памёр «у дастатку ды прыніжэньні» ў сталіцы пераможцаў. У тую эпоху на гістарычную сьвядомасьць больш уплывала мастацкая літаратура, чым прафэсійная гістарыяграфія. Але й апошняя — зь Яўхімам Лялевелем на чале — не шкадавала для Станіслава Аўгуста вострай крытыкі, называючы яго «ганебным здраднікам нацыянальнай справы».

Барбара Радзівіл

Не апраўдвалі караля й выдатныя польскія гісторыкі канца XIX ст. Валяр'ян Калінка называе караля «здраднікам і злачынцам», а ягоныя паводзіны на Гарадзенскім сойме падчас падзелу акрэсьлівае як «ганебныя». Тадэвуш Корзан, што цікавіўся «мілоснымі стасункамі» Панятоўскага з імпэратрыцай, бачыць у ім «атавізм гнілой арыстакратыі XVIII ст.». Падобныя эпітэты можна працягваць.

Рэч аднак у тым, што цягам апошніх двухсот гадоў, за выключэньнем пэрыядаў сапраўднай незалежнасьці Польшчы (1918-39 і ад 1989 г.), не было аб'ектыўных умоваў для барацьбы з чорнай легендай Панятоўскага. Прыхільнікі караля сьцьвярджалі, напрыклад, што без Станіслава Аўгуста Панятоўскага не было б росквіту польскай асьветы. Праціўнікі на гэта казалі, што нават найлепшы міністар культуры не заменіць караля ў кіраваньні дзяржавай.

Станіслаў Аўгуст Панятоўскі

Пакуль Польшча заставалася ў залежнасьці ад Масквы, кожная спрэчка пра Панятоўскага станавілася дэбатамі пра стаўленьне да Расіі, прыбранымі з прычыны цэнзуры ў гістарычныя шаты. Можа, цяпер гістарыяграфія выкарыстае шанцы, дадзеныя ёй самой гісторыяй, каб чорную легенду апошняга караля замяніць на аб'ектыўную ацэнку ягонага валадараньня?

Паводле матэрыялаў Gazety Wyborczej падрыхтаваў

Паўлюк Канавальчык

Kalandar

KALANDAR

11 listapada

U hety dzień... u 1918 h. padpisańniem damovy pra spynieńnie ahniu faktyčna skončyłasia pieršaja suśvietnaja vajna. U lasku Compiegne ŭ Francyji akt padpisaŭ maršał Foch.

Naradzilisia: rasiejski piśmieńnik Fiodar Dastajeŭski (1821-81); biełaruski bajkapisiec Albert Paŭłovič.

12 listapada

U hety dzień... u 1629 h. ŭ Viciebsku byŭ zabity arcybiskup Jazafat Kuncavič.

Naradzilisia: biełaruski etnohraf Paval Špileŭski (1823-61); rasiejski kampazytar Alaksandar Baradzin (1833-87); francuski skulptar Auguste Rodin (1840-1917); biełaruski dramaturh Andrej Makajonak (1920).

13 listapada

Naradziŭsia Robert Louis Stevenson (1850-94), šatlandzki piśmieńnik.

14 listapada

Naradzilisia: Leapold Mozart (1719-87), aŭstryjski kampazytar, baćka i nastaŭnik Wolfganga Amadeusa Mozarta; francuski mastak Claude Monet (1840-1926), čyja karcina «Impresija — uzychod sonca» dała pačatak impresijanizmu; Pandit Jawaharlal Nehru (1889-1964), pieršy premjer Indyji; biełaruski litaratar Adam Babareka (1899) i karol Jardanii Husajn (1935).

15 listapada

Naradziŭsia biełaruski śpiavak Viktar Skarabahataŭ (1951).

16 listapada

Naradzilisia: Rudolphe Kreutzer (1766-1831), francuski skrypač, jakomu Beethoven pryśviaciŭ sanatu dla skrypki i fartepijana, op. 47; biełaruskija piśmieńniki Leaniła Čarniaŭskaja (1893-1976), Jan Skryhan (1905) i Jazep Siemiažon (1914).

17 listapada

U hety dzień... u 1941 h. zahinuŭ u aviakatastrofie hienerał Luftwaffie Ernst Udet, viadomy as jaśce z pieršaj suśvietnaj vajny. (Isnuje adnak dumka, što Udet sam skončyŭ žyćcio samahubstvam, kab nia trapić u ruki Gestapo.)

НАША НІВА 11 лістапада 1996 № 32 (70)

Станіслаў Лем

Казка пра караля Мурдаса

Пасьля добрага караля Геліксандра на трон узышоў ягоны сын Мурдас. Гэта ўсіх засмуціла, бо ён быў амбіцыйны і палахлівы. Наважыў дамагчыся тытулу Вялікага, а баяўся скразьнякоў, прывідаў, воску, таму што на нацёртым воскам паркеце можна нагу зламаць, сваякоў, бо замінаюць уладарыць, а больш за ўсё — прадказаньняў. Як толькі ён каранаваўся, адразу ж загадаў ува ўсёй дзяржаве пазачыняць дзьверы і не расчыняць вокнаў, зьнішчыць усе шафы варажбітоў, а вынаходніку машыны, якая адганяла прывідаў, даў ордэн і пэнсію. Машына сапраўды была добрая, бо ён ня ўбачыў ніколі ніводнага прывіду. Да таго ж ён ніколі не выходзіў у сад, каб не прадзьмула, а гуляў толькі ў замку, які быў вельмі вялікі. Аднаго разу, ходзячы па калідоры і анфілядах, ён заблукаў у старую частку палацу, куды яшчэ ніколі не зазіраў. Сьпярша адкрыў залю, у якой стаяла лейб-гвардыя ягонага прадзеда, завадная, яшчэ з тых часоў, калі не было электрычнасьці. У другой залі ўбачыў рыцараў на паравой цязе, таксама заржавелых, але гэта яго зусім не зацікавіла, і ён ужо хацеў вяртацца назад, калі заўважыў малыя дзьверцы з надпісам «Уваход забаронены». Іх пакрываў тоўсты слой пылу, і ён нават не дакрануўся б да іх, калі б ня гэты надпіс. Ён абурыўся. Як гэта яму, каралю, насьмеліліся нешта забараніць. Не без намаганьняў ён расчыніў рыпучыя дзьверы і па стромкіх сходках падняўся ў пакінутую вежу. Там стаяла вельмі старая медная шафа з рубінавымі вочкамі, ключыкам і векам. Ён зразумеў, што гэта шафа прадказаньняў, і зноў раззлаваўся, бо насуперак ягонаму загаду яе пакінулі ў палацы, ды раптам яму прыйшло ў галаву, што, аднак, адзін раз можна паспрабаваць, як гэтая шафа прадказвае. Падышоў ён да яе на дыбачках, пакруціў ключык, а калі нічога не адбылося, пастукаў па веку. Шафа храпавіта ўздыхнула, мэханізм заляскатаў і паглядзеў на караля рубінавымі вочкамі, нібыта скрыва. Гэта яму нагадала косы погляд дзядзькі Цанандра, бацькавага брата, які раней быў ягоным працэптарам. Падумаў, што гэта, напэўна, дзядзька загадаў паставіць шафу яму на злосьць, бо іначай чаму яна косіцца? Неяк дзіўна яму стала на душы, а шафа заікліва паціху пачала граць сумную мэлёдыйку, нібыта нехта рыдлёўкай абстукваў жалезнае надмагільле, а з-пад века вылецела чорная паперка з жоўтымі, як косьць, радкамі літараў.

Кароль не на жарт спалохаўся, але ўжо ня мог стрымаць цікаўнасьці. Схапіў паперку і пабег у свае апартамэнты. Калі застаўся сам, дастаў яе з кішэні. «Зірну, але толькі адным вокам для пэўнасьці», — вырашыў ён, так і зрабіў. На паперцы было напісана:

Прабіла гадзіна ночы — рэжуцца родзічы,
Брат брата або цётку, а стрыечны стрыечнага.
Булькоча кацёл — сваяк падышоў,
Жарэ падагра швагра, вось і кат прыйшоў...

Кароль Мурдас так напалохаўся, што ў яго ў вачах аж пацямнела. Ён адчайна папракаў сябе за легкадумнасьць, празь якую ўключыў шафу прадказаньняў. Шкадаваць было аднак позна, ён бачыў, што павінен дзейнічаць, каб не дайшло да найгоршага. Ён не сумняваўся ў сэнсе прароцтва: як даўно ўжо падазраваў, пагражалі яму блізкія сваякі.

Праўду кажучы, невядома, ці ўсё адбывалася так, як пераказана. У любым выпадку, потым адбыліся падзеі смутныя, нават жахлівыя. Кароль загадаў пакараць сьмерцю ўсю сваю сям'ю, толькі ягоны дзядзька Цанандэр адзіны ацалеў, схаваўшыся ў апошнюю хвіліну за піяніна. Гэта яму не дапамагло, урэшце яго схапілі, і ён паклаў галаву пад сякеру. Гэтым разам Мурдас мог падпісаць прысуд з чыстым сумленьнем, бо дзядзьку схапілі, калі той пачаў рабіць змову супраць манарха.

Раптам асірацеўшы, кароль абвясьціў жалобу. На душы яму стала лягчэй, хаця й смутна, таму што сам па сабе ён ня быў ані злы, ані жорсткі. Нядоўга працягвалася сьветлая каралеўская жалоба, бо прыйшло Мурдасу ў галаву, што, можа, ёсьць такія сваякі, пра якіх ён нічога ня ведае. Кожны з падданых мог быць нейкім далёкім родзічам па цётчынай лініі.Тады ён час ад часу сек галаву то аднаму, то другому, але гэта зусім не супакойвала яго, таму што немагчыма быць каралём без падданых і як жа тады зьнішчыць усіх? Ён стаў такі падазроны, што загадаў прывязаць сябе да трона, каб яго ніхто адтуль не саштурхнуў, спаў у браніраваным шляфроку і ўвесь час толькі й думаў, што рабіць далей. Урэшце ён зрабіў такое, нешта такое дзіўнае, да чаго, відаць, сам не дадумаўся. Здаецца, нашаптаў яму гэта вандроўны перакупнік, апрануты пад мудраца, або мудрэц, апрануты пад перакупніка, — рознае казалі пра гэта. Казалі, што абслуга замку бачыла постаць у масцы, якую кароль уначы ўпусьціў у свае апартамэнты. Дастаткова сказаць, што аднаго разу Мурдас выклікаў усіх прыдворных будаўнікоў, электрыкаў, настройнікаў ды майстроў па блясе і абвясьціў ім, каб яны павялічылі ягоную асобу, ды такім чынам, каб яна пераўзышла ўсе далягляды. Гэтыя заказы выконваліся зь дзіўнай хуткасьцю, таму што дырэктарам праектнага бюро кароль прызначыў адпетага ката. Электрыкі і будаўнікі грамадой узяліся цягнуць у палацы драты і шпулі, а калі перабудаваны ўшыркі кароль запоўніў сваёй асобай увесь палац так, што адначасова знаходзіўся на франтоне, у сутарэньнях і флігелі, дайшла чарга да суседніх пабудоваў. Праз два гады Мурдас распаўсюдзіўся па цэнтры гораду. Ня надта пышныя пабудовы былі нявартыя таго, каб у іх пасялілася манархава думка, іх раўнавалі зь зямлёй, і на іхным месцы вырасталі электронныя палацы, названыя ўзмацняльнікамі Мурдаса. Кароль разрастаўся паступова й бесьперапынна, шматпавярховы, з выдатнай сувязьзю, падсілкаваны ўласнымі падстанцыямі, ажно запоўніў сабою сталічны горад і не спыніўся на ягоных межах. Ён павесялеў. Сваякоў не было, а скразьнякоў ён не баяўся, бо ня мусіў і кроку зрабіць: быў паўсюль адначасова. «Дзяржава — гэта я», — казаў ён не без фанабэрыі, таму што апроч яго, чалавека, які запаўняў шэрагамі электрычных пабудоваў пляцы і алеі, ніхто ўжо ня жыў у сталіцы, за выняткам, ясная рэч, асабістых каралеўскіх прыбіральнікаў пылу: тыя клапаціліся аб каралеўскім думаньні, якое плыло ад гмаху да гмаху. Задавальненьне караля Мурдаса кружылася мілямі па ўсім горадзе так, што ён здолеў дасягнуць велічы прыжыцьцёвай і сапраўднай і пры тым схавацца паўсюль, як загадала варажба, бо ён быў усюдыпрысутны па ўсёй дзяржаве. Асабліва маляўніча гэта выглядала ў прыцемках, калі кароль-гігант, шырока зьзяючы, міргаў агеньчыкамі-думкамі, а потым паволі згасаў, патанаючы ў заслужаны сон. Але гэтая цемра бяспамяцтва першых начных гадзінаў пазьней саступала месца бледнаму мільганьню, што ўспыхвала то тут, то там хісткімі агеньчыкамі. Гэта пачыналі віраваць манархавы сны. Бурнымі лавінамі зданяў яны праплывалі цераз гмахі, ажно ў змроку ўспыхвалі вокны, і цэлыя вуліцы па чарзе блішчэлі чырвоным і фіялетавым сьвятлом, а асабістыя прыбіральнікі пылу, ідучы па пустых ходзішчах, чуючы чад распаленых кабэляў Яго Каралеўскай Вялікасьці і ўпотай заглядаючы ў вокны, дзе ўспыхвала, ціха казалі між сабой:

— Ого! Пэўна, нейкі кашмар мучае Мурдаса — каб толькі на нас не адыграўся.



Аднойчы ўначы, пасьля асабліва напружанага дня — кароль тады абдумваў новыя віды ордэнаў, якімі мерыўся ўзнагародзіць сябе — ён сасьніў, што ягоны дзядзька Цанандэр пракраўся ў сталіцу, карыстаючыся цемрай, накрыты чорным плашчом, і ходзіць па вуліцах, шукаючы паплечнікаў, каб арганізаваць брыдкую змову. З сутарэньняў вылазілі групы людзей у масках, і было іх столькі, і такую яны паказвалі прагу забіць караля, што Мурдас задрыжэў і абудзіўся ад вялікага страху. Ужо разьвіднелася, і сонца залаціла белыя аблачыны на небе, тады ён сказаў сабе: «Сон — здань», — і ўзяўся за працяг праектаваньня ордэнаў, а тыя, што прыдумаў учора, яму ўжо вешалі на тэрасы і гаўбцы. Аднак калі ён, адпацеўшы цэлы дзень у працы, зноў лёг адпачываць, то ледзь задрамаўшы, убачыў антыкаралеўскую забойчую змову ў поўным росквіце. А здарылася гэта так: калі Мурдас абудзіўся ад сну пра змову, то зрабіў гэта ня цалкам: цэнтар гораду, дзе засеў гэты антыдзяржаўны сон, зусім не абудзіўся, а застаўся надалей у ягоных кашмарных абдымках, толькі кароль наяве нічога пра гэта ня ведаў. Тым часам значная частка ягонай асобы, а менавіта стары цэнтар гораду, не ўяўляючы таго, што злодзей-дзядзька і ягоныя махінацыі — гэта толькі трызьненьне і здань, надалей жылі ў памылцы кашмару. Наступнай ночы Мурдас убачыў у сьне, як дзядзька ліхаманкава ўвіхаецца, склікаючы сваякоў. Зьявіліся ўсе да аднаго, з пасьмяротным скрыгатам ланцугоў, і нават тыя, якім бракавала найважнейшых частак цела, падымалі мячы на правадзейнага ўладара! Групы людзей у масках скандавалі шэптам падбухторчыя лёзунгі, у хованках і сутарэньнях ужо шылі чорныя бунтарскія харугвы, паўсюль варылі атруту, тачылі сякеры, вастрылі дручкі і рыхтаваліся да канчатковай расправы зь ненавісным Мурдасам. Кароль другі раз жахнуўся, абудзіўся ў трасцы і хацеў ужо заклікаць Залатой Брамай Каралеўскіх Вуснаў усе свае войскі на дапамогу, каб яны пасеклі мячамі бунтароў, але адразу ж сьцяміў, што гэта бяз сэнсу. Войска ж ня ўвойдзе ў ягоны сон і ня зможа разграміць той змовы, што мацнее там. Нейкі час ён спрабаваў намаганьнем сваёй волі абудзіць тыя чатыры квадратныя мілі сваёй істоты, якія ўпарта, але дарэмна сьнілі пра змову. Зрэшты, праўду кажучы, ён ня ведаў, дарэмна ці недарэмна, бо калі ён ня спаў, то не заўважаў змовы, якая зьяўлялася толькі тады, калі ім авалодваў сон.

Калі ж ён ня спаў, то ня меў доступу да ўзбунтаваных раёнаў, і нічога тут дзіўнага, ява ж ня можа трапіць углыб сну, і прарвацца туды можа толькі іншы сон. Кароль прыйшоў да высновы, што ў такой сытуацыі лепш за ўсё будзе заснуць і прысьніць контарсон, не абы-які, зразумела, а манархістычны, вернападданы, з разгорнутымі сьцягамі, і такім каронным сном, аб'яднаным вакол трона, ён тады здолее сьцерці ў парашок самазваны кашмар.

Узяўся Мурдас за справу, але ня мог заснуць ад страху; тады ён пачаў лічыць на памяць каменьчыкі, ажно гэта яго змарыла, і ён заснуў. Тады раптам аказалася, што сон зь дзядзькам на чале ня толькі ўладкаваўся ў цэнтральных кварталах, але пачынае ўжо нараджаць арсэналы, поўныя магутных бомбаў і разбуральных мінаў. А сам ён, колькі ні намагаўся, ледзь здолеў сасьніць адзін кавалерыйскі эскадрон, дый той сьпешаны, неваяўнічы і ўзброены толькі вечкамі ад збаноў. «Няма рады, — падумаў ён, — не ўдаецца мне, трэба пачаць яшчэ раз!» Узяўся ён тады за абуджэньне, давалася яно цяжка, урэшце прачнуўся поўнасьцю, і тады яго пранізала страшнае падазрэньне. Ці насамрэч ён вярнуўся на яву, ці застаецца ў іншым сьне, які толькі ёсьць фальшывай ілюзіяй явы? Што чыніць у настолькі заблытанай сытуацыі? Сьніць ці ня сьніць? Вось у чым пытаньне! Скажам, ня будзе цяпер сьніць у адчуваньні небясьпекі, бо на яве ж няма ніякай змовы. Гэта было б някепска: тады той антыкаралеўскі забойчы сон сам сабой дасьніцца да канца, а праз канчатковае абуджэньне ягоная вялікасьць верне сабе належную цэласнасьць. Вельмі добра. Але калі ня будзе сьніць контарсноў, думаючы, што знаходзіцца ў зацішнай яве, у той час, калі гэтая нібыта ява сапраўды ёсьць толькі іншым сном па суседзтве з тым, дзядзькавым, то можа здарыцца катастрофа! Бо кожную хвіліну цэлая кодла праклятых забойцаў караля з брыдкім Цанандрам на чале можа ўварвацца з таго сну ў гэты сон, які здаецца явай, каб пазбавіць яго трона і жыцьця!

— Напэўна, — думаў ён, — пазбавіцца гэтага можна толькі ў сьне, але калі змова ахопіць усю маю каралеўскую асобу, калі разгуляецца ў ёй ад гораў да акіянаў, калі, о жах, зусім не захачу больш абуджацца, што ж тады?! Я буду тады назаўсёды адрэзаны ад явы, і дзядзька зробіць са мной, што захоча. Будзе катаваць, зьневажаць, ня кажучы пра цётак: памятаю іх добра — не дадуць спуску, што б там ні было. Такія ўжо яны ёсьць, гэта значыць, былі, а дакладней, зноў жа ёсьць у гэтым жахлівым сьне! Зрэшты, што тут гаварыць пра сон! Сон існуе толькі там, дзе існуе й ява, у якую можна вярнуцца, але дзе яе няма (а як жа я вярнуся, калі яны здолеюць затрымаць мяне ў сьне?), дзе няма нічога, апроч сну, там ужо сон ёсьць адзінай рэчаіснасьцю, а значыць, явай. Жах! Усё, зразумела, адбываецца праз гэтую праклятую залішнюю асобнасьць, цераз гэтую духоўную экспансію — трэба ж было мне ўлезьці ў гэта!

У роспачы, бачачы, што бязьдзейнасьць вось-вось яго загубіць, ён убачыў адзіны паратунак у неадкладнай псыхічнай мабілізацыі. «Трэба абавязкова дзейнічаць так, як у сьне,— сказаў ён сабе. — Я павінен прысьніць натоўпы падданых, поўныя любові і энтузіязму, аддзелы, верныя мне да канца, якія будуць гінуць з маім імем на вуснах, горы зброі, і варта б нават прыдумаць нейкую цудоўную зброю, бо ў сьне ж усё магчыма: ну, скажам, сродак, каб вывесьці сваякоў, нейкія антыдзядзькавыя гарматы або нешта ў гэтым родзе — такім чынам я буду гатовы да кожнай неспадзеўкі, і калі вызначыцца змова, то я хітра і каварна, перапаўзаючы са сну ў сон, разаб'ю яе адным махам!»

Уздыхнуў кароль Мурдас усімі алеямі і палацамі сваёй існасьці, настолькі гэта ўсё было складана, і ўзяўся за справу, гэта значыць, заснуў. У сьне павінны былі ўстаць карэ стальных аддзелаў зь сівымі генэраламі на чале і натоўпы з ровам вітаньняў у грукаце трубаў і літаўраў, але зьявіўся толькі маленькі шрубік. Нічога — толькі зусім звычайны шрубік, трошкі парэпаны з краю. Што ж рабіць зь ім? Разважаў ён так і гэтак, адначасна ў ім рос неспакой, усё мацней, і млявасьць, і страх, ажно яго пранізала: — Гэта ж рыфма да «трупік»!!!

Ён увесь затросься. Гэта значыць, сымбаль раскладу, сьмерці, значыць, зграя сваякоў, безумоўна, ужо падбіраецца цішком, маўчком, па падкопах, пракапаных у тым сьне, каб дабрацца да гэтага сну — і ён вось-вось праваліцца ў здрадніцкую сківіцу, пракапаную сном цераз сон! Ды гэта ж канец! Сьмерць! Пагібель! Але адкуль? Як? Зь якога боку?

Зазьзялі дзесяць тысячаў асабістых гмахаў, затрэсьліся падстанцыі Вялікасьці, абвешаныя ордэнамі і апярэзаныя стужкамі Вялікіх Крыжоў; узнагароды ў такт пазвоньвалі ў начным ветры, так змагаўся кароль Мурдас з сымбалем упадку ў сьне. Урэшце перамог яго, перасіліў, ажно той зьнік так добра, нібыта яго ніколі не было. Глядзіць кароль — дзе ён? На яве ці ў ін-

Станіслаў Лем (нар. 1921) — польскі пісьменьнік. Сусьветную вядомасьць набылі ягоныя творы ў жанры навуковай фантастыкі «Зорныя дзёньнікі», «Салярыс», «Кніга робатаў», «Казкі робатаў».

шых зданях? Нібыта на яве, але з чаго быць упэўненым? Зрэшты, можа быць, што сон пра дзядзьку ўжо скончыў сьніцца і ўвесь клопат залішні. Але зноў жа: як пра гэтае даведацца? Няма іншага спосабу, як толькі снамі-шпіёнамі пад выглядам змоўнікаў ператрасаць без адпачынку ўсю ўласную венцаносную асобу, дзяржаву сваёй істоты, і ніколі ўжо кароль-прывід не спазнае спакою, таму што заўсёды павінен быць гатовы, што змова сьніцца недзе ў нейкім таемным кутку ягонай агромністай асобы! А значыць наперад: давай ляпіць вернападданыя здані,сьніць ухвальныя звароты і шматлюдныя дэлегацыі, што зьзяюць духам правапарадку, атакаваць снамі ўсе ўласныя засекі, цемру і прасторы, каб у іх ня мог схавацца ні на хвіліну ніводзін падман, ніводзін дзядзька! І вось ахапіў яго мілы сэрцу шум сьцягоў, ад дзядзькі сьлед прастыў, сваякоў таксама не відаць, абкружае яго толькі вернасьць, нястомна раздае яму падзякі і ўзнагароды; чуваць звон наштампаваных залатых мэдалёў, іскры лятуць з-пад разцоў, якімі мастакі высякаюць яму помнікі. Разьвесялілася каралёва душа, бо ўжо й тарчы з гербамі зьявіліся, і дыванкі ў вокнах, і гарматы, сшыхтаваныя для салюту, і трубачы прыкладаюць да вуснаў доўгія трубы. Калі ён, аднак, уважліва прыгледзеўся да ўсяго, то ўбачыў, што як бы нешта ня так. Помнікі ёсьць, але неяк мала падобныя, са скажэньнем аблічча, у косым поглядзе ёсьць нешта ад дзядзькі. Шумяць сьцягі — праўда, але з маленькай стужкай, зусім невыразнай, амаль чорнай; калі ня чорнай, то бруднай, у любым выпадку, бруднаватай. Што ж гэта зноў? Што за намёкі?!

«Божухна! Гэтыя ж дыванкі выпертыя, зусім лысыя, а дзядзька, дзядзька быў лысы... Ня можа быць! Назад! Алыходзім! Абудзіцца! Абудзіцца!!! — падумаў ён. — Трубіць пад'ём, прэч з гэтага сну!» - завішчэў ён, але калі ўсё зьнікла, лепш ня стала. Ён зваліўся са сну ў сон, у новы, што сьніўся папярэдняму, а той натрапіў на ранейшы сон, значыць, цяперашні быў ужо пад нейкай трэцяй сілай; усё ў ім ператварылася ў здраду, сьмярдзела прадажніцтвам, сьцягі — як пальчаткі — з каралеўскіх вываročваліся ў чорныя, ордэны былі з разьбой, як абсечаныя каркі, а з залацістых трубаў грукаталі не баявыя маршы, а дзядзькаў сьмех, як гром, што грымеў яму на пагібель. Зароў кароль голасам ста званоў, закрычэў на войска — няхай яго колюць дзідамі, каб абудзіць! «Ушчыкнеце!!! — патрабаваў ён на ўсю глотку, а потым зноў: — Явы!! Явы!!» — дарэмна аднак; тады ён зноў імкнуўся з антыкаралеўскага, забойчага, здрадніцкага сну ў тронны, але ў ім напладзілася ўжо сноў, як псоў, яны віравалі, як пацукі, адныя гмахі заражалі кашмарам іншыя, разьбягалася ў ім скурчанае, крыючыся, крадком, ціхком, няведама што, але такое жахлівае, аж крый Божа! Стопавярховым электронным гмахам сьніліся шрубікі і трупікі, дручкі і атруткі, у кожнай асабістай падстанцыі засела зграя сваякоў, у кожным узмацняльніку рагатаў дзядзька; затрэсьліся гмахі-страхі, напалоханыя самі сабой, вырвалася зь іх сто тысячаў сваякоў, самазваных прэтэндэнтаў на трон, двухаблічных інфантаў-падкідышаў, касавокіх узурпатараў. І хаця ніхто ня ведаў, ці ён істота, якую сьняць, ці істота, якая сьніць, хто каму сьніцца, навошта і што з гэтага выйдзе — усе без вынятку гайда на Мурдаса, каб яго засячы, з трона звалачы, на званіцу павесіць, раз забіць, другі ўваскрасіць, тры чвэрці да сьмерці, і толькі таму нічога пакуль не рабілі, што не маглі пагадзіцца, з чаго пачаць. І так перлі лавінамі машкары каралеўскія думкі, што аж бліснула полымя ад замыканьня. Ня ў сьне, а самы сапраўдны агонь паказаўся залатым бляскам у вокнах каралеўскай асобы, і распаўся кароль Мурдас на сто тысячаў сноў, якіх ужо не злучала нішто, апроч пажару, — і гарэў доўга...

ПЕРАКЛАЎ З ПОЛЬСКАЙ ВАЛЕРЫ БУЙВАЛ

Апавяданьне

Пошукі Міс Барсэлёны

Адам Глёбус

Fiesta — знайсьці міс Барсэлёну. Ён сам ня верыў, што будзе шукаць і знойдзе. Ён спадзяваўся — яна ў цёмных акулярах. Сонца. Асяродзьдзе. Стыль. Жнівень. Порт. Музыка. Вецер.

Яна папрасіла запальнічку ў парку Хуана Міро, непадалёк ад скульптуры «Жанчына з пташкай». Ня ведала, што ён кінуў паліць, а згадка пра тытунь выклікае ванітны камячок у ягоным доўгім горле. Ня ведала, што ён шукае яе.

Яна любіць брунатныя цьвічкі цыгарэт з мэнтолам. А яшчэ шануе мадэрн, і ў яе маленечкім залатым заплечніку хаваецца срэбная запальнічка з плаўнаабрыснымі ўзорамі.

Агеньчык прасіўся дзеля лёгкага, як палёт блакітнага мятліка, флірту.

Ён разгубіўся, не пазнаў у дзяўчыне з цыгарэтаю міс Барсэлёну, упёрся вачыма ў пярсьцёнак на безыменным пальцы. За разгляданьнем сьпіралі на пярсьцёнку ён праглядзеў прыгажуню.

Лёс жартаваў. Толькі пачаліся пошукі міс Барсэлёны, а яна сама выйшла насустрач. Ён спаткаў яе каля разнаколернай скульптуры Міро і не пазнаў, сказаў, што ня паліць, і пайшоў у бок пляца Гішпаніі.

Наіўна шукаць міс Барсэлёну на пляцы Гішпаніі а дванаццатай гадзіне дня. Гарачыня. Мроіва. Машыны. Незямныя шэпты. Грукат.

Ён накіраваўся ў Нацыянальны Палац, уздымаўся на экскалятарах і думаў, што ў барсэлёнскіх парках пачынаючы з траўня заўсёды стаіць першы дзень раньняй восені. Сухі ліст з плятана ехаў зь ім на рабрыстай прыступцы.

Палац стаяў зачынены. Музэй каталёнскага мастацтва адпачываў. У навакольных алеях гулялі ветрыкі. Далёка ўнізе ляжала панарама Барсэлёны, ружова-блакітная, сфастрыгаваная зь безьлічы выцьвілых рознадзяржаўных сьцяжкоў.

Што ён мог ведаць пра прыгажуню? Амаль нічога. Толькі здагадваўся... У яе чорныя валасы, яна — каталёнка і ў яе далікатна-смуглявая, залацістая, залатая скура. Вочы цёмныя, з доўгімі веямі, такія вочы праз усё жыцьцё маляваў Пікаса, такія вочы былі ў маці Далі, калі яна першы раз пацалавала будучага бацьку непараўнальнага Сальвадора. Вочы ў стылі паўднёвай Эўропы, той самай, якую скраў Бык. Міс Барсэлёна ўвасабляе генэтычны код Эўрапейскай цывілізацыі, разам з культурамі старажытнага Рыму й старажытнай Грэцыі.

Ён наведаў старажытнагрэцкі тэатар, новыя крэслы безнадзейна сапсавалі помнік. У тэатры прагульвалася пустэльнае рэха.

Ён адчуў, што яна бывае ў грэцкім тэатры, бывае й побач — у беласьценным музэі Хуана Міро. Яна архітэктар, дакладней, вучыцца на архітэктара. Яна носіць па вуліцах Барсэлёны доўгі, колеру сепіі скуры футарал для красьлюнкаў. Яна п'е каву ў бары QU-QU на праспэкце de GRACIA, ёй усьміхаецца руды афіцыянт з маленечкім чубком пад ніжняй губою. Футарал з праектамі любіць ляжаць на высокім круглым зэдліку. Праз пляц Каталёніі яна ідзе ў Гатычны квартал.

Тым часам ён выходзіць да помніка Хрыстафору Калюмбу, які ў каменным палацы распавёў гішпанскаму каралю пра новую Індыю. І цяпер на гішпанскіх банкнотах вартасьцю ў пяць тысяч пэсэтаў мільгае ў крамах абыякавы да капіталу твар Калюмба, дзякуючы якому золата патаньнела ўдвая. Чаму грошы малююць другарадныя мастакі? Чаму ні Пікаса, ні Далі, ні Міро не атрымалі замовы намаляваць пэсэту? Чаму Гаўдзі не даручылі зрабіць хоць бы адну манэту? Іншыя, горшыя, бяздарныя чаканяць на манэтах абрысы будынкаў Гаўдзі. Іншыя робяць грошы. Гаўдзі, Пікаса, Міро і Далі рабілі мастацтва. Грошы больш навука, чым мастацтва, больш рэлігія, чым творчасьць.

Ён шукае міс Барсэлёну. Ён шукае ўзор, эталён, ідэал. Ён ведае: шукаючы грошы, ня знойдзеш мастацтва. Калі шукацьмеш прыгажосьць, не сустрэнеш славы, ня знойдзеш дабротаў, не спазнаеш нават асабістага задавальненьня, бо, знайшоўшы, расчаруесься ўшчэнт. Ён — мастак, паэт, творца — ведаў пра марнасьць намаганьняў, ведаў і не спыняўся.

З бульвару яна зьвярнула на вуліцу PORTAFERISA, каб прайсьціся побач з Катэдраю. Готыка натхняла мадэрністаў. Аркбутаны. Містычная аргазьмія. Вежы. Хімэры. Мары ў эфірных хвалях. Вядзьмаркі ў вастраверхіх каўпаках. Парфумныя крамкі. Цёмная чырвань. У Гатычным кварталe паўзмрок.

У яе ёсьць сяброўка, што працуе ў краме срэбных мініятураў. Завушніцы, пярсьцёнкі. Крыжыкі. Белы бляск. Чарненьне. Зашчапкі на ланцужках. Крама «Сьвет срэбных мініятураў» належыць сяброўчынай сям'і. Сяброўка вучыцца на ювэліра.

На залатым запясьці сьвеціцца паска белалюстранога ланцужка. Срэбра — улюбёны мэтал міс Барсэлёны.

Яна вяртаецца на праспэкт de GRACIA і заходзіць у краму BULEVAR ROSA, каб набыць пакунак з балёнікамі атраманту для сваёй асадкі «Моцарт». У краме яна апускаецца ў сутарэньні й заходзіць у прыбіральню. Вусны любяць падфарбоўвацца.

Ён выходзіць на пляц Каталёніі. Каля фантанаў зелянее скульптурная група: на магутнага каня бокам уселася аголеная жанчына з карабліком на круглым плячы. Каня за цуглі трымае аголены мужчына ў шапачцы з крыльцамі. На пастамэнце мастак чытае надпіс BARCELONA. Ён бачыць памылку, падман, замест міс ён бачыць мадам з надзьмутымі сьцёгнамі, мадам з эпохі натуралістычных скульптур і веры ў веліч антычных багоў. Да ягоных пошукаў мэталічная рэч мае такое ж дачыненьне, як і топ-мадэлькі з часопіса MAX. Масавая культура татальная, але плыткаплынная, няма нечаканасьцяў, правалаў, калодзежаў.

На скрыжаваньні ён спыняецца на чырвонае сьвятло. Побач становіцца барадатая жанчына. У яе хваравіты твар ерусалімскага артадокса. Мастаку млосна. Барадатая галадранка пазірае яму ў вочы, у страўнік. Рука яе шарыць у сьметніцы. Недаедзены рагалік радасна перабіраецца ў цыратавую валізу. Ванітны камячок танчыць на корані мастакоўскага языка. Ён бяжыць, убачыўшы жоўты агеньчык на сьветлафоры.

Бег зьмяняецца хадою, каб не выклікаць падозраньняў у карабінэраў, якія стаяць з аўтаматамі на вялікіх скрыжаваньнях.

Тэрарысты падарвалі дамбу. Вада змыла кемпінг. Ёсьць ахвяры. загінула больш за сто чалавек. Баскі змагаюцца за незалежнасьць. Гішпанская дзяржава выстаўляе на скрыжаваньнях узброеных ваяроў. Абыякавыя да палітыкі каталёнцы шпацыруюць па Барсэлёне. Яны радуюцца, што іх мурашнік называецца Барсэлёнаю. Так жыхары Калькуты радуюцца, што яны жыхары Калькуты. Наіў. Непасрэднасьць. Радавацца, што ты з пункта B, а не з пункта A ці C. А большасьць менавіта й ганарыцца сваёй сям'ёю, ладам жыцьця, краінай, кантынэнтам, расай, сваім пунктам B. Мастак не з такіх. Ён побач зь імі, але ня разам, і ён сярод іх, але ня ў іхніх атрадах і не пад іхнімі штандарамі.

Мастак зусім іншы. Для яго A роўнае з B і C. Міс Барсэлёну ён шукае таму, што ён у Барсэлёне.

Яна апускаецца ў мэтро й сядае ў электрычку. Яна сядзіць пры вакне, за якім плыве тунэльная чарната.

Ён праходзіць паўз сталоўку BURHER KING. Намыты шампунем і начасаны, як шыньён, дробны сабачка вылізвае стол.

Яна спрабуе заснуць, прытуліўшы голаў да вагоннай сьцяны. Электрычка вылятае з тунэлю ў рабочым раёне. Шматпавярховікі. Аблушчаны тынк. Рокеры на траскучых матацыклетах. Хаатычная забудова. Вокны спачывальняў пазіраюць на чыгунку. Вокны сталовак паглядаюць на сьметнікі. Вокны кабінэтаў глядзяць на скрыжаваньні. Дзіцячыя пляцоўкі ад рэек агароджвае сталёвая сетка.

Яна — архітэктар. Яна знаёміцца з тыпізацыяй жыльлёвага боксу, абалонкай пабытовай рэчаіснасьці. Яе нэрвуе выгляд срэбнабокіх сьмецьцезьбіральных бачкоў, калі яны адлюстроўваюцца ў вітрынах прадуктовых крамак. Электрычка выпраменьваецца з уласна Барсэлёны. На пяшчанасівым полі ходзяць плямістыя чырвона-белыя коні й жарабяткі.

Яму на дарозе трапляецца жабрак з жывёламі. Лішаісты сабака. Кот з абадраным хвастом. Качка бязь пёраў, ружовая, як марскі акунь. Пацук. Жывёлы замучаныя знарок. Бедныя людзі кідаюць жабраку грошы. Шмат грошай даюць кату, які замучвае жывёлаў, каб яму давалі яшчэ больш грошай. Вечны рухавік. Багатыя людзі — сквапныя, яны ня кідаюць пэсэты сабакам. Мастаку робіцца гідка.

Міс Барсэлёна ня можа заснуць у вагоне. Яна адцягвае двума пальчыкамі скуру на шчацэ. Яна адцягвае скуру на тым месцы, дзе праз дваццаць адзін год у яе будзе досыць глыбокі шнарок зморшчынкі. Міс Барсэлёна пяшчотна пагладжвае тое месца за куточкам вуснаў, дзе ляжа зморшчынка. Яна шкадуе сябе. Шкадуе,

што не пазнаёмілася з мастаком, не пайшла ў кавярню, на Рамбла, у грэцкі парк, дзе ўдзень трэніруюцца тарэадоры, а ўначы можна займацца хуткім каханьнем. Яна сумуе па страчаных магчымасьцях.

Ён, стомлены пошукамі міс Барсэлёны, заходзіць у масажны салён каля чыгуначнага вакзалу, дзе чырвонагаловая маладзіца творыць сэкс за ўзнагароду.

А ты... Усё ты разумееш. Ты ж ведаеш, дзе знаходзяцца і адкуль бяруцца гэтыя міс, дзяўчынкі, дзяўчаткі, дзеўкі, дзявулі, галубкі, сучачкі, сукі... На загарадных сьметніках, на брудных працоўных ускраінах, у скасабочаных халабудах... Там, дзе бедакі не саромеючыся поркаюцца ў сьмецьці, а дзеці спраўляюць патрэбы пасярод вуліцы. Там, дзе каханьне каштуе глыток віна, а жыцьцё не каштуе нічога.

Там, дзе сканчаецца горад і пачынаецца культывацыя зямлі, ёсьць прыпынак прыгараднае электрычкі, на ім і сышла дзяўчына-архітэктар.

Барсэлёна, 1996 год.

Помнікі нашы...

БЕРАЗЬВЕЧЧА

Партыйныя босы, якія не адно дзесяцігодзьдзе кіравалі Глыбокім, уяўлялі яго толькі трамплінам у Полацак, Віцебск, Менск, а можа нават... у Маскву. Яны дабілі той горад, які жыве ў маім летуценьні. На шчасьце, яны не пасьпелі зрабіць з Глыбокага «другую Шаркаўшчыну». А вось у Дзьвінску (Даўгаўпілсе) ёсьць раён, які носіць мянушку «Шаркаўшчына», бо жывуць там беларусы, якія надалі яму непрывабны для латышоў выгляд.



Усё ж, на тле бязьлікіх «шумілінаў», «плешчаніцаў» і «шаркаўшчынаў» Глыбокае захавала сваё адметнае аблічча. Над азёрна-пагоркавым ляндшафтам узвышаюцца дзьве сталічнага кшталту сьвятыні. Раней іх было тры. Усе — у стылі пекнага тутэйшага барока. Кармэліцкі касьцёл — першы храм у Беларусі, які набыў рысы гэтага стылю. Насупраць — парафіяльны касьцёл, які ўяўляе сабою ўдалую стылізацыю пад віленскае барока, якую яму надалі ў 1908 годзе.

360-гадовы храм кармэлітаў у яго новай «рэдакцыі» 1735 году адкрыў цэлую эпоху ў беларускім касьцельным дойлідзтве. Пазьней у гэтым стылі была перабудаваная Полацкая Сафія, узьведзены касьцёлы Менску, Івянца, Дзятлава, Валынцоў і шмат іншых, якія складаюць самую яскравую частку спадчыны Беларусі.

Найлепшая рэкляма Глыбоцкаму касьцёлу кармэлітаў — меркаваньне Напалеона Банапарта: «На жаль, у Парыжы няма гэткай лёгкасьці!» Сам жа прыстанак кармэлітаў обэр-шталмайстар Напалеона А.Куленкур атэставаў як «прыгожы кляштар у вельмі ўрадлівым раёне». Тут, у трох кельях трэцяга паверху, Напалеон спыніўся на дзесяць дзён.

З вокнаў кляштару кармэлітаў адкрываўся цудоўны відарыс на ланцужкі копанак і возера Глыбокае з гарою й шляхецкім маёнткам на тым беразе. Ваколіцы Глыбокага павінны былі пракарміць вялікую армію Банапарта, а мясцовасьць — ланцуг азёраў і базыльянскі Беразьвецкі кляштар у 3-х вёрстах ад мястэчка — да таго паланіла яго, што ён не ўстрымаўся ад думкі, пераказанай пасьля адным зь мясцовых магнатаў: «Калі б такое месца належала мне, я б загадаў наладзіць адсюль суднаходныя зносіны зь Дзьвіною, і такім чынам з гэтага, нязначнага цяпер, месца зрабіў адзін з прыгожых і выгодных гарадоў Эўропы».

Мы ня можам не наведаць тое месца ў Глыбокім, адкуль, згодна з паданьнем, Напалеон меркаваў распачынаць будаўніцтва «другога Парыжу» — Беразьвечча. Наўрад ці сёньня пасажыры, якія сядзяць у шыкоўных аўтобусах міжнародных маршрутаў кшталту «Tallinn-Budapesti» і нашых прывычных «Менск-Браслаў», уяўляюць, што на месцы нейкіх невыразных будынкаў з вартавымі вышкамі і калючым дротам яны мінаюць месца, дзе некалі існавала пэрліна беларускай архітэктуры.

У 1634 годзе Іосіф Корсак, намесьнік і ваявода мсьціслаўскі, прэфэкт дзісенскі, калі прыняў унію, падараваў Беразьвечча уніятам. Каб матэрыяльна ўзмацніць Беразьвецкі кляштар, Корсак падараваў яму яшчэ і маёнтак Вярбілава ў Полацкім ваяводзтве і 915 дзесяцінаў лясной дачы Адамаўка ў Барысаўскім павеце. Сваю шчодрасьць Корсак тлумачыў тым, што «ў тутэйшым краі з-за нядбайнасьці сьвятароў малыя дзеці застаюцца без хрышчэньня, просты народ жыве бясшлюбна і скасоўвае свае шлюбы па сваім самавольстве, пазбаўлены ўсялякага настаўленьня, ня ведае малітваў і вядзе жыцьцё ў розных памылках...» У 1643 г. Корсак памёр. У тым самым годзе ў Беразьвеччы быў заснаваны мужчынскі кляштар каталіцкага ордэна базыльянаў з праваслаўным абрадам паводле статута багаслова Васіля Вялікага. Напачатку кляштар быў драўляны, а 240 гадоў таму, у 1756-м пачалося будаўніцтва велічнай мураванай сьвятыні і разьлеглага кляштарнага корпусу.

Храм будаваўся ў эпоху віленскага барока. У яго аздобе пераважаў стыль ракако — лёгкі і гарэзьлівы. Праект сьвятыні прыпісваюць італьянскаму дойліду Франчэска Плачыдзі. Узьвядзеньне будынка па кантракце 1753 году браў на сябе архітэктар і дэкаратар зь Вільні Ян Дадрэйштэйн. Але кантракт абавязваў яго толькі пабудаваць касьцёл на ўзор невядомага іншага касьцёла. І гэтая акалічнасьць дае падставы сьцьвярджаць, што касьцёл мог быць пабудаваны па аналёгіі з Сафійскім саборам у Полацку ці касьцёлам дамініканаў у в. Забелах-Валынцах (сёньня Верхнядзьвінскі раён), аўтарам якога быў славуты дойлід Ян Глаўбіц.

На думку гісторыкаў, Беразьвецкая сьвятыня была ўнікальным архітэктурным помнікам ня толькі Беларусі, але і ўсёй Эўропы. Інжынэр-архітэктар Антон Карчэўскі ацэньваў храм як апафэоз мастацтва ракако XVIII ст. Польскі дасьледчык Ежы Кавальскі характарызуе бажніцу як выдатны твор пэрыяду ракако эўрапейскага значэньня.

Унутраную прастору храма ўпрыгожвалі насьценныя і скляпеністыя фрэскі пурпуровага калярыту, якія былі выкананыя невядомым італьянскім мастаком. Тэматыка фрэскавага жывапісу ўключала падзеі жыцьця Найсьвяцейшае Дзевы Марыі: Уводзіны ў храм, Дабравешчаньне, Ушэсьце, Пакроў Прасьвятой Багародзіцы, Нябесная Царыца перад Царом Славы ў сузор'і. У бажніцы было сем алтароў: галоўны ў выглядзе паўкруглай 12 слуповай калянады на фоне крапаванай пілястрамі алтарнай перагародкі. Архітэктар Карчэўскі ў 1930 г. апісваў яго так: «Галоўны алтар разарваны, выгнуты і сабраны ў складку, раскрывае ўсё багацьце, тэмпэрамэнт і складанасьць ракайльных



формаў». Калянада зьверху аб'ядноўвалася выгнутым беламармуровым антаблемэнтам з мноствам краповак, высунутых і запалых плоскасьцяў. Паміж калёнамі былі разьмешчаныя чатыры скульптуры — Акіма, Ганны, Захарыя і Лізаветы, якая трымае ў руках келіх з двума галубамі. Над дзьвюма крайнімі калёнамі ўзвышаліся дзьве групы пілястраў з анёламі, якія сваімі рукамі быццам падтрымліваюць



скляпеньні бажніцы. Над цэнтральным алтарным праёмам узносілася скульптурная алегарычная выява Сьвятога Духа ў выглядзе голуба з анёламі па баках.

Беразьвецкі кляштар быў славуты і сваёй шасьціклясавай вучэльняй, якая існавала тут з 1782 да 1830 г. Лік выхаванцаў сягаў да 150 чалавек. Тут вучыліся дзеці шляхты зь Менскай, Віленскай і часткова Віцебскай губэрняў. На чале вучэльні стаяў прэфэкт, ён жа настаяцель (архімандрыт) кляштара. Выкладчыкамі, акрамя прэфэкта, былі прафэсары красамоўства (рыторыкі), матэматыкі, фізыкі, маралі, выкладчык расейскай мовы, настаўнік французскай і інш. Выкладчыкамі былі асобы, якія ў бальшыні скончылі Віленскі ўнівэрсытэт. Некаторыя прэфэкты мелі вышэйшыя вучоныя ступені: доктара багаслоўя, доктара філязофіі і г.д. Самым адукаваным з прэфэктаў быў іераманах Фадзей Маеўскі. Ён меў званьне рэктара вучэльні, доктара філязофіі і багаслоўя.

Двухпавярховы Г-падобны корпус-інэрнат быў злучаны з храмам асобным крылом, меў галерэйную пляніроўку — з аднаго боку суцэльнага калідору рытмічна разьмяшчаліся кельлі мніхаў. Доўгі калідор меў тры павароты, пры якіх мясьціліся кельлі ігуменаў кляштара. Да корпусу прылягаў сад з шырокімі цяністымі прысадамі, прыдатны для адпачынку і шпацыраў. Беразьвецкі кляштар быў месцам адпачынку вышэйшага уніяцкага духавенства, свайго роду курортам. Як пісаў А.Сапуноў: «Беразьвеч — любімае месца перабываньня уніяцкага мітрапаліта Іраклія Лісоўскага».

Гаспадарчае жыцьцё кляштара праходзіла ў працы манахаў на кляштарным бровары, заезным двары, на двух млынах, адзін зь якіх быў вадзяны, другі прыводзіўся ў рух валамі. Акрамя мураваных будынкаў на тэрыторыі кляштара было 12 жылых драўляных дамоў. Увесь гэты вялікі архітэктурны ансамбаль атачала глухая мураваная агароджа даўжынёй зь вярсту. Сам жа кляштар знаходзіўся на ўзвышшы паміж азёраў Падлазна і Беразьвецкае, злучаных між сабой рэчкай. Да муроў кляштара падступаў бярозавы гай, ад якога паселішча і атрымала свой назоў. Па другім беразе азёраў сінеў хваёвы бор.

Пасьля ліквідацыі Уніі кляштар стаў праваслаўным. Урад паступова стаў адбіраць у кляштара ягоную маёмасьць, у выніку ў 1847 годзе тут заставалася толькі 16 манахаў. У 1873 годзе іх было ўсяго сем, а ў 1874-м кляштар быў закрыты. Царква была прыпісаная да Глыбоцкай праваслаўнай парафіі. Буйны архітэктурны комплекс паступова пачаў разбурацца, быў зруйнаваны вялікі будынак шляхецкай вучэльні. Маёмасьць рас-



крадаліся, у тым ліку і шыкоўныя зборы кляштарнай бібліятэкі, аднак асобнік Статуту Вялікага Княства быў перададзены ў Вільню.

Летам 1900 году ў Беразьвечча прыбыў Літоўскі і Віленскі архіяпіскап Ювеналій. Відовішча разбураных кляштарных пабудоў і цудоўнага храма зрабілі на яго скрушнае ўражаньне. Калі ён агледзеў храм і корпус былога мужчынскага кляштара, вырашыў адкрыць тут жаночы манастыр як «очаг православия и русской народности», і пры ім жаночую настаўніцкую школу пераважна для сялянскіх дзяўчат. Ягонае хадайніцтва перад Сынодам было задаволена, і ў студзені 1901 году манастыр быў адкрыты. У Глыбокім і сёньня жыве апошняя з манахіняў Беразьвечча Клаўдзія Лукінічна Гаўрыльчанка. Яна напісала аповесьць «Березвечская обитель», якую апублікавала газэта «Весьнік Глыбоччыны». Яна і вучылася ў гэтай настаўніцкай школе.

Шляхам усерасейскіх зборaў была здабытая неабходная сума грошай, якая дазволіла правесьці рамонт храму і кляштарных пабудоваў, упарадкаваць гаспадарку. Да 1910 году тут было больш за 60 манашак. Сьвятыня была адрамантаваная з захаваньнем усіх першапачатковых элемэнтаў інтэр'еру, якія перайшлі ў спадчыну ад уніятаў, але быў створаны новы разны драўляны іканастас. Майстар зь Вільні пазалаціў яго. Шыкоўны іканастас быў пастаўлены на п'едэстал мураванага і склаў зь ім адно цэлае. Калёны і пілястры былі начыста пафарбаваныя ў белы колер і зьліваліся з пазалотаю драўлянага іканастасу. Абразы для яго малявала паслушніца Антаніна Ітулевіч.

Манашкі самі ачысьцілі беразьвецкія пруды, абсадзілі рэчкі, каналы ды вазёры бэзам і парэчкамі. З пачаткам першай сусьветнай вайны манахі і настаўніцкая школа былі эвакуяваныя. У 1921 годзе манастыр быў зачынены польскімі ўладамі. Так скончыў сваё існаваньне славуты Беразьвецкі кляштар у трох вярстах ад Глыбокага. У 1920-39 г. у кляштарных будынках месьціўся польскі полк аховы памежжа, а храм стаў гарнізонным касьцёлам.

Прыйшлі бальшавікі... У 1939 годзе ў колішнім Беразьвецкім кляштары разьмясьцілася буйная катоўня і вязьніца НКВД, дзе згінулі тысячы людзей. Немцы стварылі тут лягер сьмерці для савецкіх і італьянскіх ваеннапалонных — шталаг №352, дзе было замардавана каля 27 тысячаў чалавек. А сёньня тут — турма. Вышкі вартавых, калючы дрот... У канцы саракавых — пачатку пяцідзясятых мясцовыя камуністы пачалі зьбіраць подпісы жыхароў за знос храма. Маўляў, бажніца знаходзіцца ў аварыйным стане і з-за небясьпекі не падлягае выкарыстаньню. Гэта была звычайная «ліпа», бо падчас рамонту храма напачатку стагодзьдзя былі выкарыстаныя найноўшыя на той час тэхналёгіі.

Велічная Беразьвецкая сьвятыня, якая паланіла сваёй прыгажосьцю некалькі пакаленьняў людзей, якая, са словаў сьвятара Беразьвецкага манастыра і дэпутата 3-й Дзяржаўнай Думы А.С.Вяркcіна была «украшением нашего края», нібы й зьнікла скрозь зямлю.

Кажуць, быццам ёсьць адно прадказаньне, што горад гэты толькі тады паўстане, калі зноў загучаць званы на гэтым храме. Сёньня ж Беразьвечча — частка вуліцы Савецкай у Глыбокім, якая пачынаецца з будынка суда і сканчаецца праз тры кілямэтры турмою.

Уладзімер Скарабатун

Крывіцкая Мэкка

Конкурс

У Вільні бажніцаў больш, чым дзе ў Беларусі. Як жартуюць самі віленчукі, у Вільні на душу бажніцаў больш, чым у самім Рыме. І маюць рацыю. Толькі ў сьпісе помнікаў налічваецца 23 бажніцы. А наогул чынных і нячынных бажніцаў у Вільні блізу пяці дзясяткаў. Многія зь іх маюць зусім сівую гісторыю, якая сягае ў XIII-XIV ст., а некаторыя яшчэ толькі будуюцца. Адныя бажніцы лічацца неаспрэчнымі сьвятынямі ва ўсім сьвеце, пра іх існуюць паданьні, пішуцца кнігі, складаюцца вершы... Вострая Брама, касьцёл Сьвятой Ганны, Катэдральны сабор... Іншыя бажніцы існуюць ледзь ня ў кожным віленскім квартале, пра іх гавораць у сем'ях, бо яны прызначаныя для тых, хто і ходзіць сюды сем'ямі з году ў год і на Каляды, і на Вялікадзень.

Касьцёл, які Вы бачыце на здымку, быў пастаўлены за грошы аднаго выдатнага дзеяча нашага краю — палітыка, асьветніка і ваяра, які ў гэтым касьцёле і пахаваны.

Гэтая бажніца — адзін з самых каштоўных помнікаў Вільні. Як завецца гэты касьцёл? Кім ён быў фундаваны?

Сяргей Харэўскі

© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5100 Нумар падпісаны ў друк 19[55], 10/11/1996. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 7086 Кошт свабодны.